Алесь Бычкоўскі

# ДАБРАДЗЕІ І ГАРМІДАР КВАНТАВАЙ ЛІТАРАТУРЫ



ФАНТАСТЫЧНЫЯ АПОВЕСЦЬ І АПАВЯДАННІ

Алесь Бычкоўскі

# ДАБРАДЗЕІ І ГАРМІДАР КВАНТАВАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Аповесць і апавяданні

Мінск
«Галіяфы»
2018

УДК 821.161.3-31/-32
ББК 84(4Беи)-44
Б95

**Бычкоўскі, А.**

Б95 Дабрадзеі і гармідар квантавай літаратуры : аповесць і апавяданні / Алесь Бычкоўскі. – Мінск : Галіяфы, 2018. – 162 с.

ISBN 978-985-7140-94-7.

Ці чулі вы, што ўсе выдуманыя сусветы існуюць насамрэч? І не толькі існуюць, але і дапамагаюць пісьменнікам, чытачам, а найперш аматарам казак і фэнтэзі.

Ці вядома вам, што побач з намі жывуць паралельныя цывілізацыі разумных жывёл? Журналіст Тамаш Ян гэтаксама не ведаў, пакуль не ўлупіўся галавой у пень і не трапіў у карчму «Халодныя ногі» каля могілак.

Анамальныя з'явы, ваўкалакі, тагасветныя пачвары пад аблiччам вабных прыгажунь ды іншае ў новым зборніку беларускага празаіка Алеся Бычкоўскага "Дабрадзеі і гармідар квантавай літаратуры".

**УДК 821.161.1-31/-32**
**ББК 84(4Беи)-44**

**ISBN 978-985-7140-94-7**

© Бычкоўскі А., 2018
© Дарохін П., вокладка, 2018
© Афармленне. ПВУП «Галіяфы», 2018

# ДАБРАДЗЕІ І ГАРМІДАР КВАНТАВАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Аграмадны цмок вышынёй з тры паверхі нязграбна прыткнуўся шырокім азадкам да шурпатага валуна, пыхнуў гарам і палез у шнобель доўгім брудным кіпцюром. Цмок меў разгублены і неахайны выгляд, лыпаў вачыма і дзіка азіраўся па баках, рыхтык намагаўся сцяміць, як апынуўся на стромкім беразе возера, з зыбкай паверхні якога павытыркалі галовы цікаўныя русалкі. Казачныя вадзяныя дзяўчаты віравалі тут з моманту закладкі "Парку", а вось цмок матэрыялізаваўся зьнянацку, чым і прыцягнуў увагу не толькі азёрных насельнікаў. Вучоны кот на ланцугу ад нечаканасці выпусціў у траву гуслі і, скочыўшы на дуб, схаваўся ў веццы. Зверху кружляў дыван-самалёт. А я стаяў на мастку за агароджай з армаванага шкла ўсутыч з тэхнічнымі рыштункамі "Парку" і агаломшана разумеў, што ў нас чэпэ, ды амаль пад канец маёй змены. "Кіс-кіс-кіс", — беспаспяхова паклікаў я, але мурзаты баюн не мог праз шкло пачуць. Як і астатнія насельнікі "Парку". Ніхто з іх не ў стане пачуць ці ўбачыць дзяжурнага агента, пакуль той сам не ўвасобіцца ўнутр, пад шклоагароджу.

Распачынаць аповед з апісання цмока мае сэнс выключна з аднае мэтай — прывабіць чытача, апантанага фэнтэзі. Іншым выпадкам варта адразу пісаць "усё пачалося з...". Так!

Усё пачалося з пенсіянера Цукеркіна, які вынаходзіў капялюш-няўгледку. Цукеркін — палкоўнік у адстаўцы, які сваім часам служыў у Паўднёвым Емене спецыялістам па ваенных тэхналогіях. Капялюш-няўгледка яму тэрмінова спатрэбіўся, каб цішком, употай ад жонкі, бегаць ноччу да крамы па чарніла. Зразумела, мара ўсіх злодзеяў у палкоўніка не атрымалася, замест гэтага выйшла нешта іншае, больш значнае. Бадай, варта зараз трошкі зноў адкаціць назад, цьфу, няма ў нашай мове гэтага слова, ёсць: развярнуцца і зноўку наперад!

Усё пачалося з раптоўнай анамаліі на спартовым стадыёне сталіцы. Скуль узялася тая анамалія, невядома. Але на тым полі нечакана для ўсіх пачала прайграваць усім гасцям айчынная футболахакейная зборная. Прыедзе хто з Еўропы ці Расеі — нашы абавязкова прадуюць. Прыляціць хто з іншага мацерыка — у нашых ізноў ногі не з таго месца растуць, вынік той жа. Гол за голам. Госці ў фаворы, а нашых тутэйшыя патрыёты-аматары клянуць і абяцаюць укрыжаваць.

Падобныя пройгрышы айчынных гульцоў хтосьці задужа смелы наўпрост звязваў з плыняй крэдытаў, атрыманых краінай. Аднак саму анамальнасць поля здолеў выкрыць знаёмы ўжо нам пенсіянер Цукеркін, вялікі аматар футболахакея.

Насунуўшы капялюш-няўгледку, адстаўны палкоўнік мужна рынуўся ў атаку з высакароднай мэтай дапамагчы айчыннай зборнай. Справядліва палічыўшы сябе нябачным, Цукеркін ганяўся па полі за мячом, пакуль не быў затрыманы суддзёй і аховай. Тут і надарылася такое, што без здзіўлення, шкадобы, жалю,

роспачы папалам з рогатам і сказаць нельга. Нібыта зніталіся ў прасторы і часе два непрадказальныя фактары: анамальнае поле і капялюш-няўгледка Цукеркіна. Раптоўна, як на загад, усе ўдзельнікі затрымання ваяўнічага палкоўніка знерухомелі, пачырванелі і вытарашчылі вочы. Ахоўнікі правапарадку нечакана аказаліся са спушчанымі нагавіцамі і гумовымі дручкамі ў валасата-ружовых азадках, а з моцнай дупы суддзі ў адпаведным месцы вытыркаў свісток. Аўдыторыя на трыбунах замерла, гікнула і скаланулася нястрымным рогатам некалькіх тысяч мужчынскіх глотак. Сяброўская сустрэча гульцоў умомант была спынена, выклікалі спецназ, падняЛі армію, а былы палкоўнік Цукеркін стрымгалоў бег прэч, не раўнуючы як хаваўся ад ядзернай пагрозы, з лёсаносным капелюшом на галаве.

Справу імгненна падхапілі "тыя, каму трэба" — аматары спорту ў цывільным, а газеты напісалі пра перадавікоў вытворчасці і нястрымны ўраджай перад дажынкамі.

Высветлілася ж наступнае. У сваёй апантанай жарсці вынаходзіць пенсіянер Цукеркін са старых дэталяў, дробязі, карацей — з лайна і палак сабраў нарэшце машынку, якая здзяйсняе жаданні. Ну, мо яно гучна сказана, але машынка спраўна матэрыялізоўвала думкі. З адной акалічнасцю: думкі спярша належала аднекуль прачытаць. Тут і выкрылася, што палкоўнік падчас векапомнага матчу чытаў на трыбуне зборнік сараматных показак, што і тлумачыла ў далейшым бессаромныя паводзіны гумовых дручкоў у дачыненні да іх уладальнікаў і свістка да суддзі.

Высветлілі і тое, што надрукаваныя фантазіі здольныя да матэрыялізацыі выключна на тым стадыёне, які адразу набыў "анамальны" статус. Поле абнеслі агароджай, на шыльдах пазначылі "Зачынена на рэстаўрацыю" і пачалі эксперыментаваць.

Ці то капялюш увасобіў асаблівасці характару палкоўніка, ці то яшчэ нешта, але матэрыялізацыі паддаваліся выключна рэчы з мастацкіх твораў. Самыя высокія паказальнікі ў гэтым плане мелі зборнікі казак, літаратурнай класікі і фэнтэзі.

Што толькі ні чыталі ў капелюшы Цукеркіна! Выкліканыя з нябыту здані плылі па-над зялёным травяністым полем і існавалі ад хвіліны да дваццаці чатырох гадзін. Чым большы быў наклад кнігі, тым больш устойліва плылі вобразы.

Разумныя галовы "там, дзе трэба" памаракавалі і параілі скарыстаць капялюш у дзяржаўных інтарэсах, угалас чытаць перадавіцы з газет. Аднак тут выйшаў гвалт, замест паляпшэння эканомікі з ніадкуль выскачылі два малойцы з доўбнямі і стаўклі-змясілі на горкі яблык эксперыментатараў. Капялюш больш ахвотна матэрыялізоўваў народныя казкі — тое, у што прасцей паверыць.

Калі гоман сціх, пачалі думаць: як быць далей? Газеты, зразумела, напішуць тое, што загадаюць рэдактарам, але ж пагалоскі і чуткі пра поле ўжо не суняць. Засвярбела капялюш Цукеркіна скарыстаць як след на карысць. Што ж ужо зробіш, раз так выйшла. Дый жонка Цукеркіна, сцярвозная баба, паспела зліць інфу з усімі падрабязнасцямі пра здарэнне ўнуку-праграмісту, які працаваў у Нямеччыне. Звесткі, як іх ні сакрэць-хавай, вылузнулі ў сеціва. На вуліцы не эпоха Чарнобыля, пад сукню тэчку не схаваеш і ратоў не заткнеш. Як ні круці, наўкола час высокіх тэхналогій. Тут і даручылі стварыць камісію па прымяненні капелюша Цукеркіна не каму-небудзь, а флагманам Парку высокіх тэхналогій. Праграмеры — людзі дакладныя, так бы мовіць, канкрэтныя. Пакруцілі капялюш, па чарзе прымерылі перад люстрам, зрабілі сэлфі, падзівіліся і прапанавалі заснаваць "Парк", запрашаць турыстаў, паказваць матэрыялізаваных герояў з кніжак (сапраўдных,

не касплэйшчыкаў!) і зарабляць на тым грошы, мацаваць эканоміку. А чаму і не? Нават прапанавалі запусціць праграму дзяржаўнай падтрымкі літаратараўказачнікаў, каб заахвоціць штодня ўзбагачаць “Парк” новымі героямі. Праўда, апошнюю прапанову тармазнулі недзе перад Парламентам.

І вось я, дзяжурны агент “Парку” Іван Ледастоеў, нема сузіраю цмока на стромкім беразе штучнага возера, вырытага пасярэдзіне анамальнага футболахакейнага поля былога сталічнага стадыёна. Халера на яго, цмока тут сёння не павінна быць аніякім бокам. З цмокам трэба нешта тэрмінова вырашаць. Бо ўрачыстае адкрыццё “Парку” маецца быць заўтра, і пра цмока не напісана ў аніводнай праграме.

***

А цмок тым часам перастаў калупаць шнобель, прынізіўся і выцягнуўся ў даўжыню, пакрысе набываў зласвесны выгляд, ашчэрыў доўгія іклы, залопаў крыламі на гарбе. Вучоны кот вытыркнуў пысу з дубовага лісця і назіраў. Перапуджаныя дзеўкі ў возеры далі нырца на дно, толькі русалчыны хвасты бліснулі ў паветры, пляснулі, узбудзілі кругі на вадзе. Цмок імкліва мяняў аблічча і хутка пераўтварыўся ў пачвару з агіднай скурай. Пачвара пыхцела і паўзла да дзясятка елак, сімвалізавалых казачны лес, узбоч якога расла хацінка. Кіруемы праграмным забеспячэннем масток дзяжурнага знарок рушыў следам. Пачвара не магла западозрыць маёй прысутнасці. Хацінка гэтаксама расла, стала трохпавярховым дамком, над якім увачавідкі гусцела цемра. На гаўбцы трэцяга паверха ўзніклі дзве постаці — мужчынская і жаночая. Нешта няўлоўна знаёмае прысутнічала ў іх абрысах. Цмок няўмольна рушыў да дома, быццам на чаканае спатканне. Тут належала тэрмінова гукнуць спецыяліста, што я неадкладна і зрабіў.

З аддзела віртуалізацыі на масток паднялася другая дзяжурная Маша Храпіна. Цукровая дзяўчынка, аўтарка ружовага фэнтэзі, якое ўсё больш нагадвала порналітаратуру, бо ўласна фэнтэзі там траплялася ўсё меней, а апісанняў размаітых сцэн любошчаў паміж добразлымі чараўнікамі і казачнымі прыгажунямі ўсё болела. Увогуле ў дадзеным рэчышчы вычварныя фантазіі аўтараў квітнелі і багацелі штогод. Маньякі і вычварэнцы, вось хто яны.

— Прыгажосць, — зазначыла цукровая дзяўчынка пра цмока-трансформера і засмактала пульхнымі ружовымі вуснамі чупа-чупс.

— Машка, — прашаптаў я з апакаліптычнымі ноткамі ў голасе. — Наведнікі заўтра прыйдуць падзівіцца на дыван-самалёт, дзеда Хатабавіча, паслухаць казкі вучонага ката і паспяваць караоке з русалкамі, а сустрэнуць цмока і напужаюцца.

— Хатабыча, — паправіла Маша.

— Хай сабе, але ж цмок разнясе да раніцы ўвесь "Парк"!

Замест адказу Храпіна пачала нешта шукаць у планшэце.

— Дзіўна, у заўтрашняй праграме пра цмока нічога не значыцца, — засведчыла яна праз пэўны час.

— А я ж пра што?

Маша выплюнула чупа-чупс у сурвэтку і схавала ў кішэню.

— Трэба ідэнтыфікаваць.

Я паралельна запрасіў аддзел матэрыялізацыі, хоць загадзя ведаў, што там пуста. Звечарэла, і супрацоўнікі даўно разбрыліся. Але ж і цмок не мог з'явіцца без дай прычыны. Трэба, каб нехта апрануў капялюш Цукеркіна і чытаў нейкі твор пра цмока. Аднак я ўласна ставіў аддзел матэрыялізацыі ў рэжым аховы з палову гадзіны таму, і цяпер аб'ёмныя датчыкі сведчылі пра адсутнасць людзей унутры.

Храпіну зацікавілі людскія постаці ў трохпавярховым дамку, да якога рушыў цмок. Выразнае аблічча і ўстойлівасць казалі пра сусветную вядомасць і вялікі наклад твора, з якога матэрыялізаваліся гэтыя літаратурныя героі. Відавочна, Храпінай аб'екты падаліся добра знаёмымі.

— Корвін, — вызначыла мая паплечніца. — Прынц Эмберскі.

— Не можа быць!

— А побач Ларэн. Сцэна з "Ружжаў Авалону".

Вось на што Храпіна была экспертам па фэнтэзі, дык гэта яшчэ пашукаць!

Такім чынам, парушальнікаў рэжыму мы паспяхова ідэнтыфікавалі. Зараз неабходна прыняць захады, каб выправіць становішча. На тое і ўведзена пасада дзяжурнага агента.

— Трэба, па-першае, ратаваць "Парк", затым вышукваць прычыну здарэння, — падсумаваў я.

— Добра ведаю гэтую сцэну, чытала разоў з пяць. Падстрахуй, я ў "Парк", увасоблюся ў Ларэн, паспрабую разбурыць сюжэт для дэматэрыялізацыі, унясу разынку, — Маша павярнула і спехам пацокала туфлікамі ў віртуальны аддзел, пакідаючы шлейф ванільнага паху.

Коратка і змястоўна патлумачу сітуацыю ўсім, хто яшчэ не зразумеў. Вынікала, што нехта, скарыстаўшы прыбор Цукеркіна, пачаў чытаць класіку фэнтэзі "Хронікі Эмбера" за аўтарствам Роджэра Жэлязны, частку другую, "Ружжы Авалона". І нам належала выкрыць зламысніка. Хоць, як я ўжо казаў, у аддзеле матэрыялізацыі было пуста.

Дазволю сабе ўставіць рэмарачку. Ідэю пра тое, што выдуманыя светы недзе насамрэч існуюць, выказаў у шасцідзясятыя адзін вядомы амерыканскі навуковец, які ўмеў размаўляць з дэльфінамі і падарожнічаў па тых самых светах з дапамогай лізергінавай кіслаты.

І толькі капялюш Цукеркіна ўскосна пацвердзіў гіпотэзу і рэалізаваў яе на справе.

"Парк" стварайся пісьменнікамі поруч з чытачамі. Конкурс на пасады быў вялікі. Хачу заўважыць: чытачоў існуе прорва, а вось знайсці годнага літаратара — гэта ўжо не блін спячы. Аўтараў шмат, пісьменнікаў — мала. Сёння з сучаснымі тэхналогіямі нічога не піша хіба толькі гультай альбо не аматар. Усе рынуліся сачыняць, ствараць, выкладваць у сеціве свае опусы, спрачацца, сварыцца, чыё лепей. Адбор у "Парк", так бы мовіць, "сачыніцеляў"-творцаў выдаўся жорсткім. Спачатку камісія псіхолагаў-псіхіятраў, як на прыёме ў спецназ. Пытанне "Навошта вы пішаце?" выбракоўвала палову кандыдатаў. Усе мастацкія кнігі, што мы набываем, не болей чым плод фантазій іх аўтараў, і нярэдка фантазій хворых.

У сектар фэнтэзі патрапіць прасцей. Прыгаданая камісія тут ужо не дужа здзекуецца з літаратараў, ці то не ведаючы, што ёсць фэнтэзі як жанр, ці то не ў стане адрозніць само фэнтэзі ад хваравітых трызненняў усялякіх вычварэнцаў. Так ужо склалася. Так што аўтарцы дзясятка кніжак Машы Храпінай пашанцавала: зачаравала яна  чымсьці камісію, завабіла.

Што ж тычыцца айчынных творцаў "нефэнтэзі", ніводзін камісію не прайшоў.

Чамусьці я ўпэўнены: каб стаць вядомым пісьменнікам у нашай краіне, можна ўвогуле нічога не пісаць. Замест творчасці трэба часцей рабіць сэлфі з помнікамі Купалу-Коласу, святкаваць чарговыя ўгодкі Міцкевіча-Багдановіча, наведваць магілы Караткевіча-Янішчыц, бываць на шматлікіх прэзентацыях, даваць аўтарытэтныя каментары ў сацыяльных сетках і трубіць-гудзецьтрэсці-звінець пра гэта на ўвесь свет праз "Фэйсбук". І ўсе пачнуць лічыць цябе творцам, паслядоўнікам традыцый айчыннай літаратуры, змагаром за бацькаўшчыну. Але гэта проста да слова.

Разумныя галовы хуценька разабраліся ў вынаходцы Цукеркіна і размножылі ўнікальны капялюш, засакрэцілі, паставілі на ўлік і надзелі на галовы чытачоў-творцаў. Спецыяльны аддзел адабраў тузін сусветнавядомых кніжак і загадаў іх чытаць у спецлабараторыі аддзела матэрыялізацыі. Мне пашанцавала трапіць на пасаду чытача, непасрэднага звяна ў ланцугу матэрыялізацыі герояў твораў у “Парку”.

Так у выніку эксперыментаў “Парк” і нарадзіўся на свет божы. Накрытае зверху купалам армаванага шклаагароджы з мікракліматам і ахінутае палямі рознага фізічнага паходжання, гэтае месца ўтрымлівала ў сабе персанажаў казак і фэнтэзі. У перспектыве — стварэнне прасторы для матэрыялізацыі твораў прыгодніцкага ды іншых кірункаў. Фізікі пажартавалі і літаратуры, якая вылучана ўвасобіцца ў “Парку”, далі найменне квантавай.

І я на мастку цяпер пільна і ўважліва сачу за драматычнымі падзеямі пад купалам. Свярбела і трымцела. Цмок, між іншым, працягваў пакрысе мяняць аблічча. З'явіліся рогі і ўзбраенне.

***

...І тут на Корвіна ўтаропілася пара крывавых пранізлівых вачэй, якія імкнуліся зазірнуць прама ў душу. Ён адвёў погляд. Стварэнне стаяла перад вакном і разглядвала Корвіна.

Больш за шэсць футаў было ў ёй, з ілба вылузваліся галінастыя рогі. Голае цела было попельна-шэрым, без прыкмет полу, аграмадныя крылы знікалі ў начной цемры перад вакном. У правай лапе стварэнне сціскала кароткі цяжкі меч з цёмнага жалеззя. Уздоўж клінка свяціліся руны. Левай яно абапіралася на карніз.

— Заходзь сабе на пагібель! — крыкнуў Корвін і падняў меч Грэйсвандзір.

Пачвара гігікнула і паспрабавала зазірнуць Корвіну ў вочы, але ён адводзіў погляд, каб спараджэнне Кола не пазнала яго. Потым стварэнне, быццам фагот, выдзьмула словы:

— Не, ты не той, — мовіла. — Ты ніжэйшы і старэйшы. Але... меч падобны. Хто ты?

— А ты хто?

— Стрыгалдвір маё імя. Гукні мяне, каб я мог згрызці тваё сэрца і вантробы.

— Гукнуць? Ды я і імя такое не вымаўлю, а мой цыроз сапсуе табе страўнік.

Стварэнне рыгнула полымем і заклапочана засапло. Уедлівы дым валіў з яго ноздраў. Толькі цяпер Корвін заўважыў, што істота значна большая па памерах, чым падалося спачатку.

Тым часам Ларэн-Маша назірала, нават правільней сказаць — пільнавала ў ценю. Я ж чакаў пералому, здольнага змяніць сюжэт і гэткім чынам ударыць па цмоку.

***

Чаму фэнтэзі? Рэалізм пакуль што не пасаваў "Парку". Хаця класічная літаратура часам знаходзіла паспяховае ўвасабленне, але тут было не ўгадаць. З казкамі прасцей, бо казкі мы ведаем з дзяцінства. Рэалістычныя ж творы пакуль што вымагалі дадатковых доследаў і адпаведнага фінансавання. Хтосьці з разумнікаў задаўся пытаннем: ці прывабіць Ганна Карэніна столькі ж турыстаў, колькі дыван-самалёт? Пра дыван-самалёт, як і пра Ваньку-дурня, чулі ўсе, а пра Ганну Карэніну — адзінкі, таму класіка Льва Талстога вылецела з праекта ў імгненне.

Маракавалі ўвасобіць кніжкі Стругацкіх, кшталту "Панядзелак пачынаецца ў суботу". Ага, заўтра сёння стане ўчора... Спрэс экзістэнцыя. Свет Стругацкіх ідзе задужа ўсутыч з рэальнасцю, таму ідэя "зрабіць зараз" адпала неяк сама сабой. Хаця з майго гледзішча "Пікнік на ўзбочыне", які ініцыяваў у дваццаць першым ста-

годдзі серыю кніжак і аднайменную гульню "Сталкер", рэалізаваць варта, ад ролевых гульцоў адбою б не было. Але ж тут раптам вытыркнула метафізіка.

Любы правінцыйны горад нашай сінявокай чамусь нагадвае Зону са "Сталкера". Па-першае, тут шмат Кантралёраў, якія крадком пільнуюць за ўсімі і пры зручных выпадках выгрызаюць мазгі тым, хто не паспеў схавацца. Поруч з імі ідуць Крывасмокі, якія ядуць поедам усіх, хто не ў стане абараніцца. Па-другое, тут поўна сталкераў-бадзяг, якія днямі толькі і робяць, што боўтаюцца ў пошуку хабару: вымантачваюць дробязь, каб пахмяліцца, ці высочваюць, каб што на металалом спілаваць, ці артэфакты вышукваюць, якія можна ўкрасці і прадаць. Па-трэцяе, тут безліч анамалій. Трэба вока і вока, каб куды не стаць, не ўліпнуць, не патрапіць і не захраснуць. Па-чацвёртае, сюды можна толькі аднойчы прыехаць, зваротнага шляху няма альбо ён вельмі складаны, бо тутэйшыя анамаліі засмоктваюць усіх, у каго няма грошай. Так, што яшчэ? Яшчэ недзе тут затаіўся Сідаравіч, які кіруе ўсім вакол і адказвае за пералічаныя вышэй працэсы. Праўда, Сідаравіча ніхто дагэтуль не бачыў, але ўсе пра яго чулі...

Уласна тэрмін "сталкер" прыдумалі браты Стругацкія, а пісьменнікі, нават фантасты, пішуць на тле рэчаіснасці, таму сапраўдная Зона ўзнікла задоўга да Чарнобыля, задоўга да Стругацкіх і нават задоўга да рэвалюцыі. Анамальная зона спракавету ўнутры нас саміх, мы самі яе спарадзілі. Ці шмат людзей задумвалася, што толькі Госпад Ісус Хрыстос здольны нас ўратаваць ад уплыву анамалій? Дык не, многім у існаванне Сідаравіча паверыць зручней... Такое вось адажыа чытача-верніка.

Ну і ў працяг тэмы варта задацца пытаннем: а ці шмат хто пра Бога задумваўся, ці пасуюць гэтыя словы нашаму аповеду? Сусветная культура аддаляецца ад Творцы штодня, хоць факт існавання "Парку", дзе жывуць героі твораў, якраз штурхае да думкі, што наш Сусвет не мог

з'явіцца з ніадкуль, але Кімсьці створаны. Аднак пра тое казаць "нямодна". Вось узяць прыкольную стужку "Марсіянін". "Ты застаўся ў палёце яшчэ на пяцьсот дзён, — грызе вантробы жонка астранаўта. — На пяцьсот дзён пакінуў мяне без сэксу!" От жа! Што жывуць без Бога і будуць жыць без Бога да самага скону, нікога не турбуе. Хай бы раўла: "Ты на пяцьсот дзён пакінуў мяне без хлеба!" Дык не, тады кіно будзе нецікавым...

Прабачце, я ўжо загаварыўся. Нешта не ўявіць, каб Гамлет лез на гарышча свайго замка шукаць там Шэкспіра, так і Корвін не вылезе з "Парку" ў пошуку Жэлязны. Гэта робім мы, людзі. Бо, у адрозненне ад насельнікаў "Парку", нам добра вядома, адкуль узялося названае месца.

Наш свет поўны падману і фальшывых каштоўнасцей. Мабыць, тое думаў і пенсіянер палкоўнік Цукеркін, інакш з якой нагоды падчас чытання ўголас газетных перадавіц з капелюша выскоквалі добрыя малайцы і мянтолілі палкамі прамоўцаў, удзельнікаў эксперыменту?

Карацей, падумалі, абсмакталі з усіх бакоў ідэю рэалізаваць "Сталкера" і адклалі на пасля. Да лепшага часу.

Вернемся да мізансцэны з удзелам Ларэн-Машкі.

***

Корвін ударыў насустрач, і пасыпаліся іскры, калі меч Грэйсвандзір сekануў па цёмнай скуры. Потым адскочыў назад. З вакна дзьмухаў ледзяны вецер, хвасталі халодныя кроплі дажджу. Цмок разрадзіўся праклёнамі.

— Сёння я высмакчу змесціва тваіх касцей і зраблю дудкі, а калі прымуся на іх граць, ты спазнаеш страшныя мукі.

— Добра палаеш, — парыраваў Корвін.

Цмок зарычэў, калі задымілася рана на скуры.

Корвін зрабіў чарговы выпад. Ён быў паспяховым, клінок увайшоў прама ў грудзі пачвары і... захрас там. Цмок разрагатаўся.

Корвін адчуў няладнае.

Цмок перастаў смяяцца і замаўчаў, утаропіўшыся за спіну прынца.

— А сяброўка ў цябе вабная.

— Не па тваіх цёслах, мудзіла, — сказала Ларэн-Маша і выйшла з цёмнай часткі пакоя.

Цмок насцярожыўся.

— Нешта не тое? — з'едліва спытала Ларэн-Маша.

— Ты гаворыш не па сюжэце, так не павінна быць, — памаўчаўшы, прамовіў цмок.

— Адкуль ты ведаеш сюжэт? Тут і слова такога не існуе. Хто паслаў цябе? — адразу прыстала Ларэн-Маша.

— Пракляцце прынца Эмбера, — прашаптаў не ў тэму Корвін.

Ларэн-Маша не надала ўвагі.

— Міслі гаміградзіл, Стрыгалдвір! — усклікнуў Корвін, як належала па сюжэце.

Цмок глянуў на прынца, як кот на мыш.

— Мяне гэтым не праймеш, — зазначыў ён упарта. — Але вось дзетачка твая апынулася тут дарэмна, ой як дарэмна... І штосьці ў ёй мне вельмі знаёмае.

— Каціся адсюль! — без цырымоній заявіла Ларэн-Машка, потым выдзерла з грудзей цмока меч Грэйсвандзір і падала клінок Корвіну. — Вазьмі і адыдзі назад, сама разбяруся.

Корвін паслухаўся. Яўна не чакаў спрыту ад дзяўчыны. Цмок аж прысеў ад нахабства. Я за шклом гэтаксама. Так прымітыўна і груба?

— Ні фіга сабе прыбачыцца сон, — фыркнула рагатая галава.

— Што? Які сон? — насцярожылася Ларэн-Маша.

— Чаго прычапілася? Брыдота сніцца пастаянна, — зусім не ваяўніча, а нават з крыўдай пажаліўся цмок, абрысы якога павольна набывалі былы стан. Ваяўнічасць знікала, вочы зрабіліся як у цяляці і глядзелі з пакорлівай стомай.

Ларэн-Маша здранцвела ад нечаканай прамовы цмока, нават апусціла рукі.

— Пачакай, цябе Машай Храпінай клічуць, правільна? — удакладніў цмок. — Ну-ну, чытаў твае творы. Сабіронне, адным словам, бязглуздзіца. Мо хоць у сне з цябе паздзекавацца, а то рэдагаваць заўтра...

Ларэн-Машу быццам улупілі токам. Яна азірнулася, нібыта хацела ўпэўніцца, што я пільна сачу за падзеямі, нябачна прысутнічаю і магу ў любы момант яе падтрымаць.

— Як цудоўна, што ты мне снішся, — мовіў цмок ці той, хто замаскіраваўся цмокам. — Хоць праўду скажу: твая апошняя кніжка дрэнь, і я мушу закрыць серыю.

— Феліцыян Артамонавіч?

— Га! А хто ж яшчэ? Пазнала нарэшце. Хоць у сне я магу сказаць табе ў твар, Машка, і аблегчыць сваю пакутлівую душачку. Як я стаміўся ад цябе і тваіх кніжак! Усё фэнтэзі пішаш, дурніца. Чарговы рукапіс пасля мне прывалачэш. Ізноў мне карпець, рэдагаваць тваю каламуць, — цмок скрушна ўздыхнуў. — Надакучыла ўсё, паляцеў я дамоў. Раніцай на работу ў выдавецтва трэба, ізноў вашае сабіронне сто разоў перачытваць і перапраўляць. Які быў бы цудоўны сон, каб не ты, Маша. Як даўно я мару спаліць у печы ўсё тое нахабства, што вы сачыняеце.

Цмок плюнуў полымем і, развярнуўшыся, узмыў да нябёсаў пад праліўныя хмары. Хутка ён знік за небасхілам.

— Гэй, Феліцыян! — крыкнула ўслед Машка і асеклася. Для яе не было горшай абразы, чым пачуць дурнаслоўі пра свае кнігі, хай нават ад цмока. Вобраз Ларэн растаяў, і па твары цукровай дзяўчынкі бобам каціліся слёзы.

Хоць я шчыра спачуваў паплечніцы, аднак ледзь стрымаў здзеклівы смяшок.

***

— Гэта што было? — запытаў я Машку, калі забег у аддзел віртуалізацыі.

— Не што, а хто. Феліцыян Дзеркачоў, рэдактар выдавецтва, у якім друкуецца мая серыя, — адазвалася пакутніца творчасці, калі сцягнула з сябе рыштунак.

— Пачакай, якім чынам? — разявіўшы рот, я пракручваў у галаве падзеі дня.

Сёння "Парк" наведала дэлегацыя выдаўцоў, рэдактараў і праваўладальнікаў, якія ўзгаднялі аўтарскія правы з дзейнасцю нашай канторы. Іх вадзілі экскурсіяй па аддзелах, паказвалі, дзе сядзяць аператары, як адбываецца матэрыялізацыя і засяленне "Парку". Няйначай зазіралі і ў віртуальны аддзел.

— Чакай, а што носіць на галаве твой Феліцыян? — здаецца, я пачаў здагадвацца.

Машка хутка сцяміла.

— Капялюш! Знешне падобны да капелюша Цукеркіна. Не знімаючы. Ды ён выпадкова пераблытаў сёння і напяліў наш рыштунак!

Так усё стала на свае месцы.

Мы імгненна звязаліся з кіраўніцтвам, распрацавалі аператыўны план па непрыкметным вяртанні прадукту высокіх тэхналогій. З той мэтай з візітам да Дзеркачова напрасілася сама Машка.

Прыгаданы Феліцыян і не спаў яшчэ, проста закімарыў у крэсле за кніжкай, звыкла не зняўшы капялюш. Стомлены рэдактар чытаў твор фэнтэзійнага класіка Жэлязны, удакладняў наяўнасць плагіяту ў рукапісе Храпінай, вядомай фанаткі "Хронік Эмбера". Не ведаю, што ўжо там дакладна сказала Машка сваму рэдактару, але яшчэ адной нагодай сустрэчы стала адмова літаратарці друкаваць кнігу з прычыны недасканаласці.

Апусціўшы вочы, цукровая дзяўчынка папрасіла вярнуць рукапіс на дапрацоўку і неўпрыкмет падмяніла капелюшы.

— Ён ажно падскочыў з радасці, калі пачуў, — прызналася Машка.

От жа! Цмок-дабрадзей, рэзануў праўду-матку.

Я задумаўся. Ад анамальнага поля да жытла цмока-дабрадзея няблізкі свет. Заўтра перад навукоўцамі кіраўніцтва сфармулюе новую задачу, высветліць, якім чынам капялюш Цукеркіна ўплывае на "Парк" на адлегласці.

Напрыканцы дзяжурства я прапанаваў Машцы выпіць кавы. Што і казаць тут, мы былі ўзрушанымі. "Парк" раскрываў перад намі неапісальныя перспектывы і заманьваў-вабіў таямніцамі філасофска-метафізічнага плану. З мяне вырваўся ўздых. Ну як магло здарыцца, што рэдактар і аўтарка сустрэліся ў чужым творы?

Сусвет у сусвеце, нібы цацачная матрошка. Сон у сне, тайна ў тайне, дзе ілюзія і падман і дзе рэчаіснасць? Калейдаскоп, дзе каляровыя каменьчыкі змяняюцца і будуюцца ў новыя вобразы. І як разгадаць таямніцу, калі замест адказу на паверхню часам вылупляецца дуля, ну або цмок ці дабрадзей-рэдактар?

Я не знаходзіў слоў.

— Ц-с-с-с, — Маша прыкрыла мне рот пяшчотнай гарачай далонню. — Больш нічога не хачу чуць. Нічога. Ні пра віртуальныя светы, ні пра кнігі.

Цукровая дзяўчынка адвярнулася са спусцелым выразам твару.

— Я болей не пішу фэнтэзі, верыш? Увогуле нічога не пішу.

Не вытрымаўшы сардэчнага парыву, я абняў пяшчотную дзяўчыну. Штосьці няўмольным брызам дакранулася маёй душы. Тое быў поўны пачуццяў дотык. Рыхтык раскрылася неба і на вобміг паказаліся неапісальна маляўнічыя відарысы, прыгажосць незямная.

Пад шкляным накрывам "Парку" вецер гайдаў дрэвы, русалкі зноў вытыркнулі галовы з вады і пагрэблі

да стромкага берага, вучоны кот нарэшце спусціўся долу, падняў з глебы гуслі і сеў пад дубам з непахісным намерам распавядаць байкі. Віравала віртуальна-казачнае і адначасова рэальнае жыццё. І так было шкада губляць такую ўдалую гісторыю, што я не вытрымаў і рашуча запэўніў:

— Затое пачну пісаць я!

І дома, калі ўжо ў аповедзе не раз згадваў Бога, я глядзеў на Біблію і міжволі ўсведамляў: як ты ні круці, а вынікае, што ўсе мы гэтаксама, падобна насельнікам "Парку", з'яўляемся героямі Кнігі, напісанай Творцам. Героі Кнігі кніг. І наш "Парк" наўпрост адлюстраванне свету...

А дыван-самалёт усё кружляў і кружляў.

# ПАЛЯВАННЕ НА ВАЎКАЛАКА

*“...Даўней на Беларусі, акрамя простых людзей, жылі ваўкалакі, істоты злыя і сквапныя. Багацце ім даваў чорт, а з людцаў жылле яны цягнулі ўжо самі. Днём яны сноўдалі ў абліччы чалавека, а вось уначы... Уначы царавалі жуда і паніка — тыя істоты скідалі чалавечае аблічча і станавіліся ненажэрнымі звярамі, што бегаюць па лясах, харчуюцца жывёламі ды начнымі падарожнікамі.*

*А яшчэ ў беларускіх казках часам сустракаецца негатыўны персанаж у вобразе млынара. Даўней лічылася: хто мае млын — той багаты чалавек. А хто багаты — той, зразумела, прагны і ліхі, з пеклам на кароткай назе. У старадаўніх беларусаў багацце чамусьці асацыявалася з продажам душы д’яблу. І вось вельмі даўно жыў дужа ўжо злы млынар-чарадзей. Днём ён ці то спаў, ці то аглядаў гаспадарку, а ўначы абарочваўся ваўком, і дзе яго насіла нячыстая сіла пасля, пра тое паспалітым людзям было невядома, паданне маўчыць.*

*Як водзіцца ў легендах, у злога пана млынара дачка была, прыгажуня з прыгажунь, нібыта подых анёла выглядам, дзяўчына — казка, дзяўчына — верш, натхненне паэту, адным словам. І працаваў на багацея парабак, звычайны сялянскі хлопец, мо як Пакаці-Гарошак, але не асілак, проста малады хлопец, рамантычна-*

*ўзнёслы, як амаль уся моладзь. Не мог ён абмінуць увагай прыгажуню. А дзяўчына... Што яна бачыла за кароткае жыццё, акрамя млына і злога бацькі? Затрымцела пад дыхніцай, успыхнулі пачуцці. І панеслася...*

*Толькі тата засяшаецца праз ноч у лес па неадкладных справах, дачушка бяжыць на любошчы з парабкам. Справа маладая, добрая і прыемная, нават карысная, але ж шыла ў меху не ўтоіш. Рана ці позна даведаецца татка пра начныя амуры маладых, тады канец свету, хавайся ў бульбу (хоць на той момант бульбы беларусы яшчэ не ведалі, як і назвы «Беларусь»). Трэба заўважыць, у бацькі меўся план парадніцца з суседнімі багацеямі, і дачка тут вельмі да месца. Стаў хлопец чухаць патыліцу: а што ж рабіць? У падобных сітуацыях, дарэчы, хлопцам уласціва чухаць патыліцы, а дзяўчатам — знаходзіць выйсце. Пасля кароткай нарады дачка прапанавала скрасці ў злыдня-таткі чарадзейскае зелле, абярнуцца ваўкамі і бегчы стрымгалоў, наколькі хопіць здароўя, хоць на край свету. Сказана — зроблена. Пакуль млынар днём адпачываў, хітры план быў прыведзены да выканання.*

*Доўга беглі ў абліччы ваўкоў закаханыя ўцекачы. Не адзін дзень, не адну ноч. Паданне сведчыць — спыніліся на стромкім беразе магутнай ракі. І тут цікавая акалічнасць: згодна з міфалогіяй, ваўкалакі не могуць пераскочыць цераз бягучую ваду. Спыніліся яны, абярнуліся назад у людзей і ўбачылі велічную пракаветную прыгажосць тутэйшых мясцін. Бяроз расло вакол незлічона. «Як тут беразна!» — захапілася дзяўчына. Тут яны засталіся жыць, ладзіць гаспадарку, неўзабаве збудавалі хату, а пасля ўжо і дзеці паявіліся. А цягам часу з таго воклічу «беразна!» і пайшла назва мястэчка — Беразіно.*

*Гісторыя з ваўкалакамі даволі слушная для свайго часу і ў нейкім сэнсе мае зерне праўды. Справа ў тым, што князь Усяслаў Чарадзей (нашчадак Рурыка), які*

*ў адзінаццатым стагоддзі валадарыў Полацкім княствам, у склад якога ўваходзіла тэрыторыя згаданага мястэчка, згодна са старажытнымі паданнямі таксама быў ваўкалакам і, як сведчаць летапісныя крыніцы і легенды, начамі гойсаў па лясах і абшарах княства. Праўда, ліхім, у адрозненне ад многіх пярэваратняў, не лічыўся, будаваў школы, развіваў рамёствы, мацаваў княства, а злым быў толькі ў адносінах да ворагаў. Тым і запомніўся. І хто ведае, мо ў тую эпоху на стромкім беразе ракі Бярэзіны побач з бярозамі і пасяліўся першы чалавек?”*

Барташэвіч з цікавасцю прачытаў артыкул, склаў газетку і прыняўся збіраць вуды. Вечарэла каля Бярэзіны, сутонела. Подых ветру надаваў бадзёрасці і спрыяў добраму настрою. Пасля абеду за ўвесь час вылавіў толькі двух падлешчыкаў. І то прыбытак, будзе коціку паласавацца на вячэру. Мужчына загарнуў здабычу ў пакет, закінуў у заплечнік, склаў акуратна ўсе рэчы ў багажнік немаладой “Таёты”, сеў за стырно і павол пакаціў на сельскі тракт, а адтуль на трасу да горада.

Газеты Барташэвіч чытаў зрэдчас, як выпадзе. А тут каля кавярні ў вулічнага гандляра вычапіў вокам чарговы нумар дашчэнту жоўтых па змесце і каляровых у афармленні “Дзівосаў і прыгод”. Ды не столькі сама газета прыцягнула ўвагу, колькі назва артыкула — “Сляды ваўкалакаў”. Некалі для душы Барташэвіч вывучаў фальклор і народныя паданні, таму набыў нумар. Ваўкалакі — захапляльная тэма. Артыкул спадабаўся, перачытаў ажно два разы. Напісана было з пэўным гумарам і гратэскам. Нават патыхала нейкай карнавальнасцю, але гэта мо проста асацыяцыі. Звычайна пра пярэваратняў пішуць злавеснае і таямніча-змрочнае, а тут — з ледзь прыхаваным сарказмам. Матэрыял быў падпісаны Анастасіяй Звягінай, выкладчыцай гісторыі.

І гэтая акалічнасць выклікала дадатковую цікавасць. Па-першае, ніколі раней мужчына не чуў, каб паходжанне назвы населенага пункта звязвалі з паданнямі пра ваўкалакаў, а па-другое, аўтарам была гісторык. Барташэвічу захацелася бліжэй пазнаёміцца з выкладчыцай. Ён спрабаваў уявіць узрост Анастасіі і падумаў, што так лёгка і, галоўнае, чытэльна магла напісаць толькі жанчына маладая і ўзнёслая, адданая навуцы. Хаця, з іншага гледзішча, для жоўтай прэсы іначай і не напішаш, таму і казаць пра сур'ёзнасць матэрыялу няслушна. Аднак мужчына вырашыў прасачыць далей, мо Анастасія яшчэ што цікавае падасць у наступных нумарах.

Дамоў у сталіцу Барташэвіч прыехаў, ужо калі поммрак ахінуў наваколле. Быў задаволены цудоўным адпачынкам на прыродзе. Недзе ў глыбінях душы мужчына лічыў сябе асацыяльным інтравертам-адзіночкай. Мо так і ёсць? Усміхнуўся сам сабе. Працаваў у міністэрстве па надзвычайных сітуацыях, а туды, вядома ж, псіхаў не бяруць. Ну а сёння разняволіўся ў цішыні на рачным беразе і наталіўся душэўнай моцай.

Завітаў у начную краму, набраў прадуктаў, разлічыўся. Калі выходзіў, сутыкнуўся з міліцыянтамі патрульна-паставой службы. Адразу ўбачыў добрага суседа і сябра Лемешука, трэба ж надарыцца такому супадзенню.

— Падкінь на хвілінку да дома, мая затэлефаніла, раўла на чым свет, зірну, што ўжо здарылася, — загаварыў адразу Лемяшук і, не чакаючы адказу, укуліўся ў салон "Таёты", сеў побач, патлумачыў: — Усё адно канец дзяжурства, тады на сваім аўто мятнуся, здам зброю.

Барташэвіч быў не супраць. Як не дапамагчы суседу? Тым болей ехаць не абы-куды, а ў кірунку дома. Ён пазяхнуў, падумаў, што не перашкодзіць раней легчы спаць.

Далей перакідваліся словамі, павольна ехалі ўздоўж залітай святлом ліхтароў гарадской вуліцы. Горад абу-

джаўся для начнога жыцця. Цені сноўдалі, спяшаліся. У святле машыны ўспыхвалі мятлікі. Яны стукаліся аб шкло і знікалі.

— Завернем на запраўку, — Барташэвіч успомніў, што збіраўся ўліць літраў трыццаць паліва, каб на раніцу не губляць дарма часу і накіравацца на рыбалку ў іншае месца.

Лемяшук не пярэчыў. Неўзабаве прыбылі, Барташэвіч з задавальненнем адзначыў, што чаргі няма, заправіліся хутка. Каб скараціць шлях, звярнуў у вядомым месцы з галоўнай дарогі, пакіраваў уздоўж спальнага мікрараёна, пару раз праехаў цёмныя двары.

— Ціха тут, людзі ўжо разбрыліся па хатах, — сказаў сяржант Лемяшук, зірнуў на гадзіннік і салодка пацягнуўся, хруснуў суставамі.

— Ціха. Хоць бы сабака прабег, — у тон прамовіў Барташэвіч.

— У цешчынай вёсцы сёлета іх столькі напладзілася, без дрыну на вуліцу не высоўвайся. І што цікава: няўлоўныя. Толькі службы камунальнікаў прыедуць парадак наводзіць — хаваюцца ад жывадзёраў, носу не кажуць. Дзіва!

— А вось першы, — Барташэвіч ціскануў на тормаз, каб не збіць дварняка.

Дварняк не заўважыў аўтамабіля. Ён ашалела ляцеў насустрач патрульнай машыне, падціснуўшы хвост. Толькі ў апошні момант з віскам нырнуў пад колы і праз імгненне выскачыў некуды збоку.

— Ты бачыў? — здзівіўся Лемяшук. — Ну і нахабства.

— Спуджаны, — прыкмеціў Барташэвіч. — Цікава, ад каго драпака даваў?

— Ад іншых, буйнейшых. Тэрыторыю не падзялілі, грызуцца. У сабак, як і ў людзей, — цывілізацыя, — павучальна заўважыў Лемяшук.

Праз колькі метраў прамільгнулі яшчэ два сабакі з падціснутымі хвастамі.

— Мо мядзведзь уцёк з заапарка? — пажартаваў Барташэвіч.

— Наўрад. Той звярынец, што прыязджаў, днямі выправіўся на гастролі ў іншы горад. Нашыя хлопцы яшчэ суправаджалі да межаў раёна.

Лемяшук прыгадаў, як вадзіў сына ў перасоўны заапарк паглядзець на звяроў. Сын спачатку радаваўся, ды і самому было цікава убачыць жыхароў джунгляў, гасцей з Афрыкі, але потым абодва засумавалі. Паўночнаму беламу мядзведзю перашкаджала спёка, малпа-шымпанзэ ўчапілася ў краты і бясконца хісталася ўзад-уперад, нібы жадала разламаць клетку і выйсці на жаданую волю, маленькі кракадзіл плаваў з чарапахамі ў ванне, дзе не было магчымасці нават павярнуцца, а леў нерухома сядзеў, і ў ягоных вачах чыталася: "Дайце мне толькі вырвацца, я вам пакажу..." Адным словам, не спадабалася.

— Каб жывёльны свет меў здольнасць размаўляць па-чалавечы, мажліва, штораніцу замест птушыных спеваў, а таксама "мяў" і "гаў" мы б чулі спрэс мацюкі. Доўгай бясконцай плыняй, — выдаў не характэрную для сябе філасофскую сентэнцыю Лемяшук.

— Ага, уяві, занесла цябе ў лясок па грыбы, а тамака зязюля. Ты ёй: "Зязюля-зязюля, колькі мне засталося жыць?" І што ў адказ?

— От! Не люблю заапаркаў, суцэльны здзек з жывёлы.

Барташэвіч згадзіўся.

— І цырк таксама.

Машына даехала да канца вуліцы. Дарога падвайлася. Глухія вулачкі вялі ў глыбіні кварталаў, дзе ліхтароў амаль не было, а свяціў выключна месяц. Барташэвіч выкруціў стырно, і "Таёта" паслухмяна ўпісалася ў паварот.

— Хутка вывернем на галоўную вуліцу, там ужо будзе святлей, — пракаментаваў Барташэвіч.

Матор раўнуў, і "Таёта" набірала хуткасць па змрочнай вузкай вулачцы, разганяючы фарамі начную цемру.

Барташэвіч любіў хуткасць, але перад серыяй рэзкіх паваротаў давялося прытармазіць.

— Гуму спаліш, — папярэдзіў Лемяшук, калі пярэднія колы з віскам прабуксавалі па асфальце.

Барташэвіч — добры кіроўца, суперпрафесіянал, сунуліся далей уздоўж дамоў, выхопліваючы фарамі цёмныя зеўры пад'ездаў. Адзін, другі... Выехалі на чарговае перакрыжаванне і збочылі. Праз сотню метраў чакаўся выезд на галоўную вуліцу.

І вось тут Барташэвіч адчуў занепакоенасць. Даўно забытую, але сур'ёзную. Яна спараджалася глыбока схаванымі інстынктамі, выпрацаванымі з маладосці. Інстынкты з'яўляліся часткай яго другога, моцна законспіраванага жыцця, пра існаванне і акалічнасці якога ведалі лічаныя асобы. Ох, нездарма сёння натрапіў на артыкул пра ваўкалакаў. Падзабытае за даўнасцю, але знаёмае прадчуванне сціскала грудзі. Барташэвіч углядаўся ў начны змрок. Нечакана, але прадбачна пачуўся жаночы крык.

— Што такое? — падхапіўся Лемяшук.

Кіроўца апусціў шкло, каб лепш прыслухацца. Крык паўтарыўся.

Барташэвіч выруліў на выгук "Ратуйце!". "Таёта" рванулася да апошняга пад'езда самага дальняга дома. Раптоўна ў святле машыны мільгануў цень агромністага сабакі, разоў у дзесяць большага за звычайнага.

— О-ё-ёй! — вырвалася ў Лемешука.

Барташэвіч дадаў хуткасці. Крык, на гэты раз мужчынскі, змяшаўся з равам рухавіка "Таёты". Барташэвіч ударыў па тармазах у апошні момант, калі яны ледзь не ўперліся бамперам у агромністага кабяля, які ўпіўся ікламі ў плечы мужчыны, непрытомна ляжалага на газоне, і тузаў.

Лемяшук не задумваўся, наколькі правільна і законна ў дадзенай сітуацыі прымяніць зброю, імгненна выскачыў з машыны і з ходу запуляў набой у чорнага,

з цялё велічынёй, сабаку. Але той скочыў і згінуў у начной цемры. Апошняя куля свіснула ў паветры, калі жывёліна сіганула за рог шматпавярховага дома.

Пасля серыі гучных стрэлаў усталявалася цішыня. У Барташэвіча тахкала сэрца. Крыху дрыготкімі рукамі Лемяшук схаваў пісталет.

Побач у траве ляжаў пакусаны мужчына і ціха енчыў. Сяржант з моцным пачуццем сплюнуў, узяў рацыю і паведаміў пра здарэнне. Сістэма прыйшла ў дзеянне, і неўзабаве ў іхнім напрамку ўжо выязджала хуткая дапамога. Лемяшук папрасіў у сябра ліхтарык, прысеў, шукаючы гільзы, панаракаў, што зараз давядзецца адпісвацца за кожны стрэл.

— Затое чалавеку мо жыццё ўратаваў, — зазначыў Барташэвіч.

Страляў Лемяшук трапна, усе ведалі. Таму пакусаны мужчына не рызыкаваў памерці ад кулі, хоць адзінай крыніцай святла былі толькі фары "Таёты". Па шчырасці, Лемешука напужалі выключныя памеры сабакі-цяля. У іншым выпадку пісталет не ўхапіў бы. Гумовы дручок на поясе нават не крануў.

Барташэвіч агледзеў ахвяру, мужчына быў у крыві, якая цякла з ірваных ранаў. Калі тэрмінова не зашыць, праз гэтыя раны следам выплыве і душа.

— Патрывайце крыху, хуткая ўжо едзе, — супакоіў ён пацярпелага.

Паступова вярнулася нармальнае дыханне, знутры ўжо не плюскала.

Побач хтосьці ўсхліпнуў. Барташэвіч толькі цяпер заўважыў у цемры маладую жанчыну, яна прытулілася да цаглянай сцяны высокага будынка і часта дыхала.

Наблізіўся Лемяшук, акінуў вокам з ног да галавы незнаёмку, зацеміў разадраную сукенку.

Калі ў двор заязджала з уключанымі міргалкамі хуткая дапамога, паранены мужчына адключыўся. Медыкі сваю справу ведалі назубок, спачатку намацалі

пульс, затым зрабілі ўкол, паклалі мужчыну на насілкі, упіхнулі ў свой бус, запрасілі абставіны ранення, пацікавіліся самаадчуваннем міліцыянера і Барташэвіча. На жанчыне ж не выявілі ніякіх пашкоджанняў, акрамя парванай сукенкі. І тут жа высветлілася захапляльная акалічнасць: пацярпелы мужчына меў намер жанчыну згвалціць, але тутака з ніадкуль выскачыў невядомы звер і пачаў грызці гвалтаўніка. Медыкі запэўнілі, што тут ужо не іх сфера дзейнасці, і паперлі хутчэй мужчыну ў рэанімацыю, бо небарака траціў шмат крыві. Жанчыне ж далі пракаўтнуць пігулку ад нерваў. Лемяшук паведаміў пра ўсё па рацыі ў дзяжурку.

Пасля ўзнікла паўза, якая надараецца пасля буйнога здарэння наўпрост перад далейшым моцным катаклізмам.

І ў гэтай паўзе Барташэвіч адчуваў, што заўтрашняя рыбалка адмяняецца.

— Ведаеш, Лемяшук, тое не сабака. Воўк. Мы бачылі ваўка, мацёрага драпежніка. Нават я, паляўнічы са стажам, не сустракаў ваўка настолькі вялікіх памераў.

— Першы раз сутыкаюся з падобным, — прызнаўся сябар. — Каб чалавека, ды ў горадзе... Галоўнае, я не прамахнуўся ніводнага разу.

— Ведаем цяпер, ад каго драпалі дварнякі.

***

Абернуты рагожкай старадаўні меч ляжаў на антрэсолі, за трохлітровымі слоікамі гуркоў, рыбацкім рыштункам і гаспадарчай драбязой. Ляжаў у хатнім тайным сховішчы доўга. Барташэвіч ужо і забыўся, калі апошнім разам вымаў каштоўную рэч, каб ужыць для справы. Меч быў неад'емнай часткай яго іншага жыцця.

Клінок вырабілі настолькі даўно, што звесткі пра тую падзею страцілі яшчэ манахі-скрыптары ў эпоху перапісвання хронік і кодэксаў, задоўга да Гутэнберга

і Скарыны. Дзяржальна мяча помніла далоні каралёў і прынцаў, авантурнікаў і патрыётаў, асілкаў і рознага гатунку змагароў. Клінок выкоўвалі, дадаўшы срэбра ў нябесны метал, метэарытнае жалеза, як сведчылі паданні.

Барташэвіч валодаў ім па-майстэрску, бо ўпотай трэніраваўся падчас выездаў на прыроду або не ўпотай — у спартовай залі клуба ўсходніх адзінаборстваў. Дастаўшы меч са спрату, ён звычна ўзважыў зброю ў руцэ, зрабіў некалькі фінтоў-выкрутасаў. Праўда, сцярожка, каб не падрапаць шпалеры і не перасекчы доўгую ножку таршэра.

Дзякуючы рэгулярным трэніроўкам Барташэвіч быў заўсёды ў належнай форме. Ён залюбаваўся віццём на стыку клінка з гардай, арнаментамі і надпісамі ўздоўж ляза. Цікава, як каралі трымалі яго ў руках, шляхетныя людзі, сам Карл Вялікі не грэбаваў, нават паляўнічы на ведзьмаў Ян Сапега пэўны час карыстаўся клінком. А бач ты, захоўваецца цяпер, апавіты анучамі, на паліцы пад столлю звычайнай гарадской двухпакаёўкі за барыкадай са слоікаў з гуркамі. Аніякай павагі да велічнай моцы і старадаўняга флёру. Такая вось спадчына. Барташэвіч пасміхнуўся.

Сёння ў раённым аддзеле міністэрства па надзвычайных сітуацыях даведаўся пра цікавыя рэчы. За апошнія дзесяць дзён ва ўсім горадзе надарылася пяць выпадкаў нападзення дзікай жывёлы на чалавека (і трэба ж — Барташэвіч гэтым часам бавіўся ў водпуску). Ва ўсіх выпадках адзначаліся ваўчыныя ўкусы. Зачухала патыліцы служба аховы прыроды і навакольнага асяроддзя. Ну а з міліцыі паведамілі, што ўсе пяцёра пацярпелых у рознай ступені звязаныя з крымінальным светам. Хто рэкецір, хто рабаўнік, хто гвалтаўнік, хто сядзеў за забойства... Складалася дзіўная карціна: ваўкі мэтанакіравана грызлі злодзеяў. Дэталі начнога здарэння прынёс з аддзела сусед Лемяшук.

— Позна ішла дамоў ад мамы. Раптам прычапіўся злодзей. Адабраў сумачку, хацеў згвалціць, парваў сукенку. Пацярпелая, зразумела, пачала клікаць на дапамогу, раптоўна з ніадкуль з'явіўся... гм... воўк, напаў на гвалтаўніка. І тут своечасова паявіліся мы на "Таёце".

Далейшая інфа канчаткова запэўніла Барташэвіча ў дзіўным перапляценні нітачак лёсаў.

— Пацярпелую завуць Анастасія Звягіна, дацэнт кафедры гісторыі ва ўніверсітэце, — скончыў расповед сябар.

Змест артыкула "Сляды ваўкалакаў" імгненна ўспыхнуў у галаве. У той момант Барташэвіч і зразумеў прычыну абуджэння інстынктаў ягонай патаемнай існасці. Ну а пасля ўжо дома палез на антрэсоль па старадаўні клінок.

Меч паляўнічага.

Але спачатку трэба сёе-тое ўдакладніць.

***

Да заканчэння лекцыі заставалася хвілін пяць. Наста перапынілася, абвяла позіркам аўдыторыю, адзначыла, хто са студэнтаў спіць, хто ўважліва слухае.

— Віткоўскі, — паклікала яна.

Хударлявы студэнт перастаў перашэптвацца з сяброўкай і разгублена павярнуўся да кафедры.

— Вы не падкажаце, колькі княжыў у Полацку Усяслаў?

Студэнт зачырванеў, залыпаў вачамі, прабегся позіркам па аўдыторыі. Ззаду пачуліся смяшкі.

— З 1044 па... ммм... — Віткоўскі думаў. Сяброўка хуценька штосьці выпісвала пальцам на стале.

— Ну?

— Па... 1201! — выдаў небарака.

Суседка гыкнула. Ззаду зашумелі. Наста не стрымалася і сама ледзь прыўзняла ўверх куточкі вуснаў.

— Віншую, Віткоўскі, — сказала яна. — Вы адкрылі невядомыя старонкі ў гісторыі. Ніхто не ведаў, што знакаміты полацкі князь — радня Дункану Макклаўду.

Збянтэжаны студэнт маўкліва апусціў вочы.

— А вы, Ліпская, наступным разам дакладней падказвайце свайму сябру. Пішыце алоўкам, а не пальцам.

Суседка Віткоўскага схавала ўсмешку.

— Такім чынам, — працягвала Наста, — Усяслаў княжыў у Полацку на сто гадоў менш, чым лічыць спадар Віткоўскі. Пяцьдзясят сем гадоў, згадзіцеся, дастатковы тэрмін, каб пакінуць у гісторыі даволі значны след. Утрымаць уладу на такі працяглы час мог толькі няпросты чалавек. У адрозненне ад шматлікіх уладароў, князь Усяслаў не быў тыранам, хаця летапісцы называлі князя «нялітасцівым на кровапраліцце». Але нялітасціва Усяслаў ставіўся толькі да ворагаў. У часы яго княжання развіваліся рамёствы, гандаль, будаваліся храмы, з заморскіх краін прывозіліся кнігі. Акрамя таго, Усяслаў абараняў свае землі ад варожых нашэсцяў. Заўважце, не ва ўсіх школьных падручніках даўней пра тое пісалі.

Наста зірнула на гадзіннік. Пара закончылася. Пачуўся званок на калідоры. Студэнты пачалі хуценька збірацца.

— Можаце ісці, шаноўныя. Сустрэнемся на заліку.

Студэнты развіталіся і шумным гамузам выкульваліся з аўдыторыі.

— Віткоўскі, — спыніла Наста разгубленага студэнта.

— Слухаю вас.

— Вучыце даты. На заліку праваліцеся. Будзе прысутнічаць кіраўніца маёй кандыдацкай. Яна не даруе памылкі, падобнай сённяшняй, нават калі вы патрыятычна настроены. Вы ёй яшчэ паспрабуйце даказаць, што кароль Артур — нашчадак славянскіх правадыроў, як зрабілі на мінулых занятках, зусім будзе завал.

Калі студэнт выйшаў, Наста задумалася над жыццевымі мэтамі. Тры месяцы прайшло пасля ўладкавання на кафедру, і яна толькі цяпер адчула сябе выклад-

чыцай: дзе трэба — мяккай, пры неабходнасці няўмольнай і жорсткай. Студэнты неўпрыкмет прывыкалі, але аб'ектам іх гумару Наста будзе яшчэ доўга. А што зробіш, калі выкладчыца ўзростам мала адрозніваецца ад наведвальнікаў лекцый? У Насты меўся высокі ўзровень ведаў, дзякуючы чаму дзяўчына набыла характэрны выраз твару, постаць і, галоўнае, своеасаблівы адбітак настаўніцкага досведу ў вачах.

Яна склала ў сумку аркушы з нататкамі і планамі, пакрочыла з класа.

На калідоры каля вакна ўгадала ўжо знаёмую постаць. Наста зачыніла дзверы і пайшла насустрач.

Пэўнае імгненне разглядалі адно другога.

— Вось нарэшце я вас і дачакаўся, — першым сказаў Барташэвіч.

Сёння ён быў апрануты больш цывільна, замест рыбацкага камуфляжу — кашуля, джынсы, у дадатак лёгкі пах адэкалону.

— Мой ратаўнік, рада бачыць, — прамовіла Наста, з цікавасцю разглядаючы мужчыну.

Барташэвіч сціпла аднекаўся:

— Гэта мой сябар Лемяшук адкрыў агонь па драпежніку... Хаця невядома яшчэ, хто каго абараняў: мы вас ад ваўка або воўк вас ад гвалту.

— У любым выпадку мне радасна вас бачыць! — перапыніла Наста.

— Выдзеліце мне трохі часу?

— Міліцыянты ўжо размаўлялі, выдала ўсё як на духу. Не ведаю нават, чым дапоўніць.

— А я не з той нагоды.

— Тады калі ласка.

Яны пайшлі па калідоры.

— Давайце пазнаёмімся, — прапанаваў Барташэвіч. — Мяне завуць Вадзім.

— Вельмі прыемна. Мяне можаце зваць Наста.

— Скажыце, гісторыя — цікавая навука?

— Каму як, — уздыхнула дзяўчына. — Для мяне — вельмі. Я вывучаю гісторыю са школы. Добра займацца, калі побач ёсць аднадумцы.

— Здаецца, у вас іх зашмат.

— Маеце на ўвазе студэнтаў? Смеху варта. Гісторыя — прыдатак для іх ведаў. Адзін сёння ляпнуў, што князь Усяслаў княжыў у Полацку на сто гадоў больш, чым сведчаць гістарычныя крыніцы. Відавочна абмовіўся. Праўда, хоць дату пачатку княжання назваў правільна. Увогуле ж той, хто вывучае эканоміку, гісторыю не вельмі шануе. Яна не патрэбная, каб зарабляць грошы пасля дыплома.

— Ну і хай сабе, а Усяслаў пры жаданні мог княжыць і трыста гадоў.

— Ой, адкуль вы ведаеце? — спытала яна з адценнем іроніі.

— Старажытныя паданні кажуць, што знакаміты князь быў пярэваратнем, ваўкалакам, а яны, вядома, жывуць болей, чым звычайныя людзі.

— З пачуццём гумару ў вас усё добра, Вадзім. Вы таксама цікавіцеся старажытнымі паданнямі?

— У нас шмат агульнага. Чытаў ваш артыкул у "Дзівосах і прыгодах". Вы ўдала ўплялі ваўкалакаў у версію паходжання назвы Беразіно.

— То не я — фалькларысты. Я ж толькі пераказала.

— З вашага гледзішча, падобныя стварэнні могуць існаваць насамрэч?

Наста зірнула на Барташэвіча, як на дзівака, ён падміргнуў у адказ.

— Скажу, Вадзім, што аднойчы на прэзентацыі кнігі аднаго задужа правінцыйнага аўтара знаёмая сталічная літаратарка на падпітку клялася ў тым, што ваўкалакі жывуць у Менску, маўляў, яна асабіста знаёмая.

— Гэта ж пасля якой чаркі ўзнікла версія?

— Пасля чацвёртай. А між іншым, паважаная жанчына, у часопісе працавала. Знікла недзе.

— Мо залішне цікавілася, задужа паглыбілася ў тэму?

Наста гігікнула і папрасіла прабачэння.

— Раптам ваўкалакі не любяць, калі імі шмат цікавяцца, а высочваюць падобных людзей і грызуць? — развіваў думку Барташэвіч.

— Занадта жорстка, — не згадзілася выкладчыца. — Можна ж яшчэ ў сваю веру чалавека звярнуць. Цапнуў раз і — хоп! — яшчэ адзін пярэварацень. Армію цемры папаўняць зручна.

— Мяркуеце, усе яны спараджэнне цемры?

— А як жа інакш?

— Тады Усяслаў Полацкі — выключэнне.

— Трэба яшчэ даказаць, што ён быў ваўкалакам.

— Доказы даўно паглынуў час... Наста, калі пішаш пра цемру, можаш выклікаць да сябе ўвагу істот з памраку. І калі так рабіць часта, цемра аднойчы пагрукае ў вашы дзверы.

— Вы дзеля гэтых слоў вырашылі са мной сустрэцца?

— Не толькі. Мне спадабаўся ваш артыкул і карцела проста паразмаўляць пра загадкі гісторыі. Напрыклад, ізноўку пра Усяслава Чарадзея. Бацьку князя звалі Брачыслаў, ён быў праўнукам Рагнеды. А вось хто маці? Гісторыя не захавала. Падобная адсутнасць дакладных звестак наўпрост дае волю фантазіям.

— Жадаеце пакрытыкаваць мой артыкул?

— Не. Проста вось думаю, а што калі маці Усяслава была нейкай там неўрыдскай прынцэсай? Ну раз быў народ гэтакі — неўры, значыць, павінен быць і правадыр народа, а ў правадыра — дачка-прыгажуня. Лагічна? І вось Брачыслаў выпадкова сасватаўся. Акалічнасцей мы не ведаем, ізноўку можна нафантазаваць. Ну праўда, сюжэт недзе пераклікаецца з вашым артыкулам, так. Неўры былі некалі магутным народам. Яны жылі ў лясах на тэрыторыі нашай краіны ў адзінстве з прыродай, лесам, навакольным асяроддзем. Паданні сведчаць, што многія неўры, найбольш знітаваныя з лесам, мелі здольнасці ваўкалакаў. Вось ад дзіўнага

звязу і нарадзіўся волат-пярэварацень. Гістарычная асоба — князь. Я да таго кажу, што легенды ж не ўзнікаюць на голым месцы, усяму недзе прыхаваная падаплёка.

Наста заўважыла:

— Бяда ў тым, што пра неўраў нам амаль нічога не вядома. Самая папулярная крыніца інфармацыі пра неўраў — гісторыя Герадота. Маці ж князя, магло так стацца, увогуле магла быць затумканай, зацкаванай жанчынай, настолькі малазначнай, што нават летапісцы не ўпісалі ў хроніку. Рабыняй.

— Пра гэткі варыянт я і не падумаў.

Яны спыніліся каля дэканата.

Барташэвіч спытаў:

— Наста, а вы паверылі б у рэальнасць пярэваратняў, каб выпала самой з імі сутыкнуцца?

— Вы цяпер наўпрост нагадваеце тую знаёмую літаратарку.

— Справа ў тым... Як бы лепей растлумачыць... Мой сябар Лемяшук лічыцца вельмі някепскім стралком. У момант нападзення драпежніка Лемяшук выпусціў цэлы набой з пяці-сямі крокаў. Усе кулі пасля знойдзены ў траве і на асфальце. Яны нібыта наскрозь жывёліны праляцелі. Разумееце? Чалавек, якому сам міністр уручаў грамату за перамогу ў рэспубліканскіх спаборніцтвах па стральбе, не патрапіў з сямі крокаў у буйнагабарытную цэль. Вось таму я і не ведаю сам, што думаць. Наста, мо раскажаце мне пра ваўкалакаў больш?

***

Першую сутычку са стварэннямі помраку Вадзім Барташэвіч запомніў назаўсёды. Жыццё адразу падзялілася на два адмежкі: да і пасля. Ён нібыта памёр тым незабыўным днём, дакладней ноччу, каб нарадзіцца наноў у іншай якасці.

Палеская глыбінка. Берагі Прыпяці. Ноч. Яркая поўня залівае святлом нябёсы, бачна вакол добра.

Ён у вёсачцы, куды накіравала на практыку вучэльня. Будучы ветспецыяліст. Перадвыходным вечарам наважыўся на танцы-дыскатэку, паклыпаў дзеля цікавасці ды каб разнастаіць уласнае жыццё ў тым правінцыйным трыдзясятым царстве.

Малады Вадзім быў па-студэнцку кволым, скура ды косткі, саплёй перашыбіць можна. А вядома ж, на вясковыя танцы хадзіць лепей, умоўна кажучы, з карданным валам ад "Маза", на ўсяляк выпадак — каб зручней адмахвацца ад тутэйшых п'яных асілкаў. На ражон перці не варта.

Як водзіцца ў падобных выпадках, на танцах прыкмеціў прыгажуню. Скуль яна ўзялася, не ведаў ніхто. Мо з горада да радні прыбыла? Няважна. Вясковыя хлопцы давай падкатвацца са знаёмствамі, дарэчнымі і недарэчнымі прапановамі. Толькі Вадзім стаяў убаку і не набліжаўся да чарнавокай бялявай дзяўчынкі. А куды там, вакол мясцовыя танцоры адзін перад другім вылузваліся, пер'е распускалі. Сунься Вадзім да красуні — умомант рэбры пераломяць, да трох не лічы.

Невядомая госцейка сама падкаціла да студэнтапрактыканта і папрасіла правесці да суседняй вёскі. (Відаць, тутэйшыя гамадрылы былі ёй не да густу.) А гэта кіламетры з тры тупаць праз начны лес. Жахнуўся Вадзім, нядобрыя позіркі вакол заўважыў. Але ж сказаць "ой, чурыкі" і даць заднюю ходу не дазваляла годнасць. Плюнуў, панаракаў сам сабе, а што рабіць, не сам жа напрасіўся. Узяла красуня пад ручку Вадзіма, і крочылі яны вонкі з сельскага клуба пад зласныя і зайздросныя вочы ўслед.

Ішлі павольна, размаўлялі ні аб чым. Прыгажуню звалі... вось імя Барташэвіч начыста забыўся... Імя цяпер не галоўнае. Калі апынуліся за вёскай, Вадзім з нейкай лёгкасцю ўздыхнуў, разняволіўся, нават абрадаваўся, што няма перасьледу, ніхто не пагражае

і не збіраецца натаўчы ў лыч дзеля забавы, так бы мовіць, з ласкі на пацеху.

Але ж разняволіўся Вадзім дарэмна.

З начных ценяў насустрач вылучыліся тры постаці з пахам нядаўна ўжытых кепскай самагонкі і таннага чарніла. Постаці абступілі начных спадарожнікаў і намеры паказвалі самыя сур'ёзныя. Ацаніўшы перспектывы, Вадзім наважыўся даць драпака. Ганьба, канешне. Але, словамі класіка, лепей пяць хвілін пабыць баязліўцам, чым пасля — нябожчыкам. З-за малавядомай, хай сабе і вабнай, прыгажуні з ладнай фігуркай трапіць пад малаткі і скласці галаву ад нажа ў п'янай бойцы ну зусім не свярбела. Асабліва тут, у глыбінцы, калі Вадзім штодня ў каляндарыку закрэсліваў лічбы да канца пастылай практыкі. Вельмі слушна было праявіць сябе сапраўдным мужчынам у наступны раз. Ну як можа кволы інтэлігентны здыхлік супрацьстаяць траім маладым, энергічным вясковым працаўнікам, якія, да таго ж, не зусім цвярозыя? Карданнага вала з сабою, вядома, не прыхапіў.

Тут і надарылася падзея, якая перакуліла Вадзімаў светапогляд і перамяніла адносіны да жыцця.

Пасля кароткага дыялогу, за якім нічога добрага не прадбачылася, аматарка наведвацца на танцы за тры кіламетры, так бы мовіць, з усёй дурасці махнула нагой і трапіла абцасам у горла аднаму незадачліваму шукальніку прыгод. Другому яна тыркнула пальцам у вока і ляснула далонямі па вушах (кліент згорбіўся). Трэці дастаў нож, бліснула лязо, і гучна памянуў чыюсьці маці. Дзяўчына наўпрост выбіла халодную зброю, хітрым рухам выкруціла руку нападніку, дзеўбанула нагой і ўскочыла на шыю, сціснула калені. Праціўнік з хліпаннем і невыразнымі гукамі зваліўся кулём. Вадзім пачуў хрусценне. Пасля яна накінула кухталёў зверху таму, хто згорбіўся, і таўкла яшчэ, калі той паваліўся. Да адключкі. Адна!

— Пайшлі, кавалер, — кінула дзяўчына і пацягнула Вадзіма за ручку.

Не прайшло і хвіліны.

Неяк боязна стала, зніякавеў студэнт. І навошта праводзіць такую?

Тупалі далей моўчкі. Вадзім усвядоміў, што не ён праводзіць, а дзяўчына цягне за руку, вядзе хлопца, нібыта цялё.

Прывяла да возера. На беразе абвіла Вадзіма рукамі за шыю, давай цалаваць, песціць. Ён не супраціўляўся, адказаў узаемнасцю, хоць адчуваў сябе не вельмі. Спрабуй адмоў такой маладзіцы — змесіць у цеста. Але ж Вадзім дармо што кволы, з прыроднымі рэфлексамі ўсё ў парадку было. Пругкае дзявочае цела вабіла ў таямнічым святле поўні. Адзенне паляцела долу. І ў містычным святле месяца ён заўважыў поўсць, густую і бліскучую, смуродам дыхнула з ашчэранай пашчы, чорныя вочы каханкі наліліся чырванню і полымем апраметнай, уласнай скурай адчуў іклы на шыі. Тузануўся спалохана, гучна сапсаваў паветра, але не вырваўся. Навалілася пачвара зверху, закруціла, угрызла, цёплае і ліпкае паплыло на грудзі і жывот, спякотны боль ахапіў каля ключыцы. Капец, падумаў ён, перад тым як выспела пара наступіць цемры. Мільгануў няўлоўны цень, ледзь чутны металёвы ўзмах рэхам адазваўся ўвушшу. Вадзім убачыў, як доўгае і шырокае лязо наскрозь пракалола драпежніцу. І ён знепрытомнеў.

...Хварэў цягам сутак. Трызніў, енчыў, нехта прамакаў анучамі атрутную жыжку з параненай шыі, падносіў да вуснаў чару з прыкрым пітвом. Калі жар адступіўся, здолеў заснуць, моцна спаў, усю наступную ноч навылёт. Расплюшчыў вочы, калі па радыё зайграў гімн. Адзенне змокла ад поту, ва ўсім целе панавала слабасць. З цяжкасцю падняўся, выявіў, што ляжыць на ложку ў чыёйсьці хаце. Пахі зёлак луналі ў цёплым паветры. Зёлак і спірту.

— То будзеш жыць, — павярнуўся на словы, вымаўленыя глыбокім басам, і сустрэўся вачамі з барадатым сівым дзядзькам у манаскім рыззі і з цяжкім крыжам на грудзях.

Так яны і пазнаёміліся: Вадзім і айцец Аляксандр.

З тае пары бярэ пачатак іншае Вадзімава жыццё.

***

Вечар выдаўся ціхі і спакойны. Барташэвіч прыпаркаваў машыну ў двары пад домам, у якім жыла Наста, і прыняўся чакаць. Зірнуў на гадзіннік. Дамовіліся сустрэцца а восьмай вечара і наведацца ў кавярню.

Ён вырашыў браць на жыўца.

Пасля той помнай ночы на Палессі ў Барташэвіча з'явіўся дар прадчування. Айцец Аляксандр навучыў авалодаць дарам і дапамог здольнасці раскрыцца напоўніцу. І калі пасля "вучэбных курсаў", як іх менаваў бацюшка, Вадзім выйшаў у свет, ён ужо не быў кволым здыхлікам. Яму было дадзена прызначэнне вышукваць і вынішчаць сілы помраку ў любым абліччы. Давялося пазбавіцца ад шкодных звычак, заняцца спортам, змяніць прафесію, а дакладней — набыць яшчэ некалькі дадатковых. І бадай, самае важнае: наўпрост змянілася стаўленне Вадзіма да ўласнага жыцця.

Перад тым як перадаць у спадчыну незвычайны меч, айцец Аляксандр расказаў, што да Чарнобыля не карыстаўся старадаўняй зброяй цягам трыццаці гадоў, не было нагоды. То надарыўся перыяд працяглага зацішша. Спакой панаваў у краі. І толькі пасля выбуху рэактара, калі людзі пачалі плынямі з'язджаць з роднай зямлі, ізноўку з'явіліся пярэваратні. Усё часцей і часцей паяўляліся істоты помраку. І сляды іх вялі з адселеных тэрыторый, з трыццацікіламетровай зоны вакол рэактара.

Пасля надарылася яшчэ адно зацішша, і Вадзім не сутыкаўся з пачварамі два гады. Увесь гэты час ён працаваў у аддзеле міністэрства па надзвычайных

сітуацыях, калясіў па краіне і чакаў, пакуль абудзіцца прадчуванне. Дачакаўся.

І гэтым разам выпадак падаваўся надзвычай дзіўным. З нейкай незразумелай прычыны пярэварацень нападаў выключна на благіх людзей. Пяць выпадкаў — пацвярджэнне. Вадзім быў упэўнены: праз выкладчыцу гісторыі можна выйсці на ваўкалака. Прадчуванне!

Меч ён схаваў пад сядзеннем “Таёты” ў спецыяльным зручным ёмішчы, з разлікам, каб пры неабходнасці можна было хутка выхапіць.

— Даўно чакаеце?

— У мяне звычка з’яўляцца раней, — прамовіў Вадзім.

Наста без запрашэння села ў машыну.

— Добрая звычка. Куды паедзем?

— Куды прапануеце.

Барташэвіч завёў рухавік, аўто павольна зварухнулася з месца.

— Я дамаседка. Не ведаю нават, дзе можна правесці вечар кампаніяй. Прабачце.

— Не бяда. Ведаю адно ўтульнае месца.

“Таёта” ўпэўнена набірала хуткасць. Яны прамінулі некалькі святлафораў, звярнулі ў завулак і выехалі на вячэрні праспект. Вадзім уключыў музыку. Наста моўчкі слухала і разглядала рэкламныя шыльды, што віселі на кожным будынку.

— Сара Брайтман, — пазнала яна з першых гукаў. — Падабаюцца яе песні.

— Ухвальна. Люблю музыку, а не дыскатэчныя гопалкі.

— І я не аматарка танцаў.

Вадзім усміхнуўся пра сябе.

— Увогуле люблю адзіноту, — прызналася выкладчыца.

— І я інтраверт-адзіночка.

— Цікава.

Вадзім упісаўся ў чарговы паварот.

— Ёсць на прыкмеце ўтульная кавярня з мілітарысцкім назовам “Гармата”.

— Не супраць, — згадзілася Наста.

На прапанову Вадзіма пагадніліся дзеля хуткаспечанага сяброўства перайсці на “ты”. Перакідваліся словамі, а Барташэвіч слухаў прадчуванне. І дар не расчароўваў, сведчыў: сёння адбудзецца сустрэча з трансфармантам, чалавекам-трансформерам, або пярэваратнем. Прыроду прадчування ніхто толкам зразумець не мог. Усе ўладальнікі-носьбіты дару да Вадзіма, па словах бацюшкі Аляксандра, проста выяўлялі свае здольнасці і карысталіся імі. Мо каб зладзілі навуковую лабараторыю, то здолелі б нешта адкрыць, вынайсці. Айцец Аляксандр казаў, што даўней, вякі таму, існаваў цэлы ордэн, не раўнуючы як рыцарска-манаскі. Людзі палявалі на ваўкалакаў. Цяпер жа так званых “паляўнічых” амаль не засталося. Яшчэ святар сведчыў: недзе ў глыбінях зоны адсялення натыкаўся на намёкі, сляды існавання цэлага закрытага інстытута, які вывучаў уплыў радыяцыі на жывёльны свет зоны і наступствы мутацый. Факт: самі па сабе мутанты існаваць не могуць, выжывае толькі адзін з тысячы. Дзякуй богу, законы прыроды. Можа выжыць наўмысна геннамадыфікаваная істота пад кантролем спецыялістаў. Што калі сённяшнія ваўкалакі маюць штучнае паходжанне, з’яўляюцца вынікам навуковых эксперыментаў на адселеных тэрыторыях?

— Мімікрыя. Здольнасць жывой істоты злівацца з навакольным светам у мэтах бяспекі і выжывання, — заўважыў Барташэвіч.

Выкладчыца пытальна выгнула бровы.

— Ты не думала, Наста, што быць ваўкалакам — гэта форма мімікрыі?

— Слушна, маеш рацыю, — падумаўшы, адказала выкладчыца. — Дзеля выжывання многія істоты мяняюць колер, знешні выгляд, нават выдаюць іншыя гукі.

— А чалавек? Чалавек можа прыкідвацца зверам?

— Нечакана, але калі ўспомніць гісторыю, то можа. Кітайскія баявыя вучэнні, кшталту ушу, усе як адзін вучаць прыкідвацца кімсьці. Школа тыгра, цмока, малпы, змяі, багамола. Заўважым адсутнасць у шыхце школы чалавека. У вядомым сэнсе праглядаецца пэўная мімікрыя.

— Быць зверам прасцей, зверу лягчэй выжыць у суровых прыродных умовах. Так?

— Мабыць. Калі чалавек трапляе ў суворыя ўмовы, ці павінен станавіцца зверам? Ці важна ўсё ж застацца чалавекам? Вадзім, ты філосаф. Сёння і без суворых умоў многія робяцца звярамі і жаруць поедам адзін другога.

— Я да таго вяду, а што калі ваўкалакі — гэта штучна выведзены новы від чалавека, накіраваны на далейшае выжыванне ва ўмовах забруджанага навакольнага асяроддзя і жорсткага соцыуму?

— Навуковы эксперымент? Тады каму ён спатрэбіўся, каму выгада людзей рабіць звярамі?

Барташэвіч не ведаў.

У кавярні “Гармата” яны замовілі пару кактэйляў і сёе-тое павячэраць. Наста заўважыла заклапочанасць на твары новага сябра.

— Цябе штосьці трывожыць?

Замест адказу Вадзім пацікавіўся, ці бачыла Наста хоць раз сапраўднага ваўка.

— Толькі “У свеце жывёл”. Ніколі не думала, што ваўкі бываюць настолькі агромністымі.

— Наста, тое не воўк.

Сяброўка недаверліва глянула.

— Я хацеў сказаць, незвычайны воўк, — паспяшаўся выправіць Барташэвіч.

— Мне таксама здалося. Твой сябар столькі страляў, а ён уцёк...

— Угу, уцёк. Скуру нават не падрапалі кулі, а Валера страляў ва ўпор.

— Надта звышнатуральна. Не можа быць.

— Наста, — Вадзім звярнуўся да яе загаворніцкім тонам. — Бліжэйшым часам табе давядзецца шмат дзіўнага пачуць і ўбачыць.

Выкладчыца была заінтрыгаванай.

— Проста будзь гатовая.

— А менавіта?

— Падобныя драпежнікі — вельмі старажытныя істоты, яны ваўкі толькі напалову.

— Я ўжо недзе чула.

Вадзім матнуў галавой.

— А на другую палову?

— Людзі.

— Пачакай. Ты хочаш мне сказаць, што воўк, які напаў на таго мужчыну, не зусім воўк? Ты сур'ёзна?

— Напоўніцу.

Ну вось, падумаў Барташэвіч, зараз, як і заўсёды ў падобнай сітуацыі, палічаць за дурня. Ну чаму трэба даказваць, што Дзед Мароз існуе насамрэч?

— Працяг легенды пра Усяслава? — асцярожна пацікавілася Наста.

— Паслухай, у часы Рымскай імперыі ў змрочных лясах нашай краіны жыў дзікі страшны народ, — пачаў Вадзім.

— Неўры? Я ведаю.

— Неўры зніклі з нашай зямлі з прыходам цывілізацыі. Куды зніклі — невядома, але пэўная частка, як вядома з паданняў, вырашыла назаўсёды застацца драпежнікамі ў звярыным абліччы. І вось незадача: частка іх ад людскога паходжання поўнасцю пазбавіцца не здолела. Такім чынам і захаваліся ваўкалакі: напалову ваўкі, напалову людзі...

— Цікавая версія, — засведчыла выкладчыца.

— Аднойчы ў неўрыдскія лясы ўступіў рымскі легіён, — працягваў Вадзім. — Салдаты імператара ўжо тапталі Брытанію, ваявалі з германцамі і прагнулі заха-

піць калі не ўвесь свет, дык большую ягоную частку. З лесу ніхто не вярнуўся. Усе легіянеры прапалі без вестак. Згадкі пра дадзены выпадак ёсць у Тацыта, але баюся памыліцца. Далей болей. Даўней існаваў нават цэлы ордэн паляўнічых на ваўкалакаў, задачай было вынішчэнне пярэваратняў па ўсім свеце. Пасля з невядомай трасцы ваўкалакі пачалі знікаць, і ордэн прыйшоў да заняпаду, у паляўнічых прапала патрэба. Неўзабаве наступіў час, калі пра ваўкалакаў увогуле ніхто не чуў дзясяткамі гадоў. Ажно да 1986 года.

Наста нахмурылася.

— Чарнобыль?!

— Так. Першы выпадак нападзення пярэваратняў быў зафіксаваны ў снежні таго года. А пасля пайшло-паехала. Яны ўзнікаюць хвалямі, перыядамі. То год-два нічога не чутно, то пасля навалай, плынню з усіх бакоў і пераважна ў раёне зоны адсялення вакол рэактара. А вось сённяшні наш выпадак наўпрост унікальны. Бо ўпершыню ваўкалакі дабрылі ажно да сталіцы.

Выкладчыца заперхала. У рухах і кашлю Насты з'явілася нешта спачувальна-спагадлівае.

Барташэвіч закрыў рот. Насамрэч мо сказаць праўду?

— Некалі я быў недасведчаным юнаком, пакуль асабіста не сутыкнуўся з пярэваратнем...

— Ой, не кажыце, дзядзечка, а колькі вы ўжылі гарэлкі перад тым?

— Нікольки.

— Ізноўку выплывае на памяць тая знаёмая літаратарка, якая пад чаркай клялася, што ваўкалакі жывуць у Менску, — Вадзімава казань канчаткова развесяліла выкладчыцу.

— Між іншым, мой першы пярэварацень быў у жаночым абліччы.

— Вось-вось, мо прыгаданая літаратарка?

Наста шчыра рассмяялася.

— Ну калі тое была твая знаёмая, яе праткнулі мячом.

— Дык вось чым можна патлумачыць ейнае даўняе знікненне!

Наста раптам зразумела, што памылілася ў разліках. Выпадак надарыўся ў юнацтве Вадзіма, а гэта мінімум гадоў з дваццаць таму, калі саму Насту вадзілі за ручку ў садок, і, зразумела, тады яна яшчэ не была знаёмай з літаратарамі-пярэваратнямі ў жаночым абліччы.

Яна прыгадала начнога гвалтаўніка, які паспеў разадраць на ёй сукенку, адной рукой заціснуў рот і абпальваў вуха словамі, каб маўчала, не піўкнула. І як далей адбыўся літаральна цуд: звер з доўгімі зубалямі, яе збавіцелі на "Таёце", хуткая, міліцыя, усё так знянацку...

— Тое звыш майго разумення. Каб не ўчарашні выпадак, канчаткова палічыла б цябе вар'ятам, — ад душы заявіла дзяўчына.

Барташэвіч пацiснуў плячамі.

— Слухай, а чым ваўкалака можна адолець?

— Срэбранай куляй, срэбраным лязом. Увогуле любой зброяй з утрыманнем срэбра. Золатам гэтаксама, але золата задужа каштоўны метал, таму вякамі склалася традыцыя карыстацца срэбрам і яго сплавамі. Але чаму можна адолець менавіта срэбрам — тут ужо належыць навуковыя доследы ладзіць, каб высветліць. Справа ў тым, што срэбра — цудоўны антысептык, а ваўкалак, як лічылі асобныя, кшталту носьбіта бактэрыяльнага забруджвання.

— Цікава... І як цяпер ты мяркуеш паступіць?

Добрае пытанне. Вадзім распавёў: раз іхні воўк палюе на нягоднікаў, то варта ўзяць у міліцыі спіс асоб у вышуку ці "былых" і пачаць адсочваць кожнага па чарзе ў чаканні, калі драпежнік праявіцца зноў.

— Паляўнічыя маюць дар. Мы можам адчуваць пярэваратня. Тое пачуцце цяжка апісаць. Павышаецца адрэналін у крыві, тахкае ў грудзях, валасы варушацца па ўсім целе. Гэта тлумачыцца прысутнасцю ў ДНК своеасаблівага гена. Мы чуем адзін другога на адлегласці.

— Ой, я, калі сутыкнулася са зверам, таксама нешта адчула.

— Шок, — падказаў сябар і ўдакладніў: — Цябе ж хацелі згвалціць.

— Мо і нешта большае, чым шок і жах, — у Насце абудзілася даследчыца. — Дык раз, па тваіх словах, істоты тыя існуюць на адселеных тэрыторыях, як падобны воўк з'явіўся ў сталіцы?

Вадзім адкінуўся на спінку крэсла, апусціў рукі на столік і шчыра прызнаўся:

— Не ведаю. Але мяркую, загадка хутка разгадаецца.

Яны гаманілі добрую гадзіну. Ідэя браць драпежніка на жыўца з выкарыстаннем дзяўчыны нарэшце аформілася ў Барташэвіча ў канкрэтны план. Мо яно і выглядала жорстка, бязлітасна, але карцела ўпаляваць пачвару. Усе тлумачэнні ён дасць маладой выкладчыцы Анастасіі Звягінай потым. Альбо не дасць.

Барташэвіч разлічыўся за пачастункі. Развітаўся з Настай, спаслаўся на неадкладныя справы, чым вельмі здзівіў новую сяброўку (нават не прапанаваў падвезці назад да дома, якое нахабства, а здаваўся выхаваным мужчынам!). Затое ў знак прабачэння выклікаў за ўласны кошт таксі. І калі з двайнымі пачуццямі і лёгкай абразай у сэрцы Наста забралася ў салон аўто і ляснула дзвярамі, Барташэвіч паспеў дабегчы да сваёй "Таёты" і неўпрыкмет паехаў следам. Тым момантам у ім зноў ажыло прадчуванне.

***

Ярка-жоўтая таксоўка збочыла ў знаёмы завулак. Вадзім уважліва сачыў. Яшчэ некалькі паваротаў. Таксі спынілася метрах у дваццаці ад цёмнага пад'езда. Барташэвіч выключыў фары, на хаду выцягнуў са схованішча пад сядзеннем меч і спыніў "Таёту". З дапамогай прадчування Вадзім здагадаўся, што ваўкалак таіцца ў зеўры пад'езда. Разынка хітрага плана хавалася

ў тым, каб справакаваць звера нападам на дзяўчыну, навязаць сутычку і перамагчы. Ну раз воўк нападае на злодзеяў, чаму не паспрабаваць выкарыстаць гэтую акалічнасць? Барташэвіч вылез з аўтамабіля.

Наста выйшла з салона і няспешліва пакрочыла да дома. Таксоўка стаяла з заведзеным рухавіком.

“Едзь ты, зараза”, — папікаў Барташэвіч таксоўшчыка.

Наста адмерала палову шляху да пад'езда, калі таксі нарэшце схавалася за паваротам.

“Зараз, тут, або ніколі!”

Абы атрымалася правільна зымітаваць нападзенне.

Вадзім спрытна пабег у бок жанчыны і кінуўся зверху.

— А-а-а, патрапіла! Я цябе зараз!

Ён з ходу штурхануў выкладчыцу і паваліў на траву, усеўся зверху і пачаў зрываць адзенне. Наста забілася ў істэрыцы, у намаганнях скінуць Барташэвіча.

— Дапамажыце! Гвалцяць!

Вадзім здзіраў дзявочы станік. Па-іншаму аніяк!

Прадчуванне не падвяло. З чорнай зеўры пад'езда вылецеў цень.

Вадзім у імгненне абхапіў Насту і перакруціўся разам з ёй некалькі разоў. Паспеў. Туды, дзе яны толькі што былі, упаў агромністы воўк з ашчэранай пашчай.

Вадзім скочыў на ногі і выставіў меч. І тут іх позіркі сустрэліся: чырвоныя агеньчыкі ваўка-пярэваратня і зрэнкі Вадзіма. Усяго імгненне ментальнага кантакту. Цягучая сліна папаўзла ўніз са смуродлівай пашчы ваўкалака.

Паляўнічы прыгнуўся, выставіўшы клінок уверх і наперад. Некалькі фінтоў, спробы кінуцца, спробы адступіць. Драпежнік скочыў і ў палёце натыкнуўся на лязо, віскнуў і ўпаў за спінай Вадзіма. Той паспеў перамяніць пазіцыю. Пярэварацень атакаваў ізноў, іклы са стукам сашчапіліся каля Вадзімавага твару.

Звер ужо быў падрапаны срэбрам і імкліва губляў моц. Барташэвіч уклаў усе сілы ў наступны ўдар. Праціўнік паспеў хістануцца ўбок, і меч прасвісцеў, літаральна збрываючы поўсць. Вадзім ліхаманкава крутануўся вакол сябе, рассякаючы лязом паветра. Ваўкалак кінуўся пад ногі. Мужчына некалькі разоў ударыў нагой па храпе, пачуўся хруст. Ранены драпежнік заскавытаў і падвоіў спрыт, але ўпустую, прыпаў да зямлі, ляпнуў хвастом і кінуўся ў апошнюю атаку. Вадзім чакаў кідка, скочыў насустрач і маланкава ўтыркнуў клінок прама ў ваўчыныя рэбры.

Воўк зваліўся паляўнічаму пад ногі.

Затым запала паўза, якая бывае ў раптоўным канцы моцнага катаклізму. Людзям вакол здаецца, што мінула вечнасць, а на самой справе не больш за хвіліну.

Вадзім супакоіў дыханне, павярнуўся да Насты. Дзяўчына пераводзіла позірк з забітага звера на паляўнічага. Той няспешліва наблізіўся, рыўком паставіў няспраўджаную ахвяру на ногі. Нейкае імгненне Наста стаяла, потым яе плечы дробна затрэсліся, слёзы самі паплылі па шчоках. Выкладчыца ўткнулася тварам мужчыну ў грудзі.

— Ну, ну, цішэй, — супакойваў Вадзім і гладзіў шурпатай далонню Насту па валасах. — На сёння ўсё скончылася.

На пэўную хвілю прыкрыў павекі.

У доме ўжо грукалі фіранкамі і балконнымі дзвярамі. Узрушаныя людцы вызіралі на двор, цікавіліся, што за крыкі і лямант унізе.

— Пойдзем, — прашаптаў Вадзім. — Трэба абавязкова прыбрацца і хутчэй з'язджаць адсюль.

Ён абняў Насту за плечы і давёў да "Таёты", дапамог сесці ў салон. Потым адкрыў багажнік, вярнуўся да забітага ваўка, узяў за лапы і пацягнуў да машыны. Меч з нерухомага цела не вымаў.

***

Ехалі праз ноч да бліжэйшага ляснога масіву, каб пазбавіцца ад цела. Вадзіму заадно карцела паказаць сяброўцы зваротны працэс трансфармацыі ваўкалака. Наста трымалася, хоць раз-пораз хліпала. Дармо сабе. Яно і зразумела — такое перажыць.

Вадзім на хаду ўвёў сабе ін'екцыю антысептыка. Калі дзеўбануў нагой па ваўчынай храпе, параніўся аб іклы. Спыніў машыну, перавязаў рану.

Наста назірала за яго дзеяннямі, потым прывяла ў парадак сваё адзенне.

Нарэшце Вадзім збочыў на лясную дарогу, праехалі яшчэ метраў сто і спыніліся.

Вадзім пагасіў святло. Вакол ні душы. Ён дастаў ліхтар і сказаў Насце:

— Выходзь, не бойся. Табе трэба на сёе-тое паглядзець.

Калі выйшлі, Вадзім выцягнуў з багажніка цяжкае цела драпежніка на траву.

— Бачыш? — спытаў ён.

Забіты воўк быў здаровым у памерах.

— А зараз глядзі ўважліва, — прамовіў Вадзім і вышмаргнуў меч.

Узяў ліхтар, накіраваў святло на ваўка і абняў дзяўчыну, каб, чаго добрага, не знепрытомнела.

Хвіліну нічога не было. Потым па ваўчынай скуры прабеглі хвалі, лапы пачалі выцягвацца. Паступова змяншаўся застылы аскал, прападалі іклы. Поўсць станчалася. Ваўкалак прымаў іншае аблічча. Заднія лапы выпраміліся, сагнуліся ў каленях, набылі форму чалавечых ног. Вострыя кіпцюры схаваліся ў пальцах, пярэднія лапы станавіліся рукамі. Чэрап закругляўся, абрастаў чорнымі валасамі. Неўзабаве на лясной траве ляжала цела чалавека.

Дзяўчына ўражана назірала фантастмагарычнае відовішча. І войкнула напрыканцы, быццам пазнала кагосьці ў гэтым мёртвым целе.

— Хопіць, — кінуў Вадзім. — Пара ехаць. На золку з першымі прамянямі сонца ён згарыць. Нават следу не пакіне.

Вярталіся дадому па залітым неонавым святлом начным праспекце. Вакол сноўдалі машыны, у якіх ехалі па сваіх справах мірныя людзі.

— Куды мы едзем? — ціха спытала Наста.

— Сам не ведаю, — прызнаўся Вадзім. — Шчыра кажучы, пасля падобнага канцэрта ты доўга не заснеш. Прапаную падацца да мяне, любы напой на выбар і доўгая размова да раніцы. Мяркую, у цябе выспела шмат пытанняў, можна не гадаць, ты імі наўпрост набрыняла.

Наста пацвердзіла і адказала згодай.

— Толькі спачатку можна цябе папрасіць не крыўдаваць за маю выхадку? Зразумела ж, я не збіраўся цябе гвалціць і прычыняць пакуты. Тое, так бы мовіць, ваенная хітрасць.

Насту апанаваў слупняк. Калі яна і думала пакрыўдаваць і абурыцца на Вадзіма, то трэба пачакаць да раніцы. Пакуль жа — не.

— Разумееш, у чым справа, Наста? Чаму воўк не крануў цябе і чакаў у пад'ездзе? Ваўкалак паляваў на злачынцаў. Перакуліўся свет.

Вадзім ледзь не праехаў на чырвонае святло, звярнуў з праспекта на другую вуліцу. Крыху падглядаў краем вока: Наста ўнурылася ў думкі, потым палезла ў сумачку, нядоўга корпалася, выняла невялікі, трошкі пажоўклы чорна-белы фотаздымак.

— Я павінна сказаць табе, Вадзім.

— Слухаю.

— Пятнаццаць гадоў таму, калі я была яшчэ малодшай школьніцай, мой бацька паехаў працаваць на адселеныя тэрыторыі непадалёк ад Чарнобыльскай АЭС. Ён слаў лісты, тэлефанаваў, расказваў пра тамтэйшае жыццё, а пасля змоўк. Назад не вярнуўся. Аніякіх вестак. Ніхто, нават міліцыя, не змагла адшукаць.

Тата згінуў. Я ўсё жыццё нашу з сабой бацькава фота. Ён быў для мяне вельмі дарагім чалавекам. Паглядзі сам.

Вадзім збочыў і прыпыніў машыну, узяў кранутую часам картку, разглядзеў твар на партрэце і шумна ўдыхнуў паветра, наколькі хапіла лёгкіх.

З фота пазіраў твар знішчанага сёння пярэваратня.

— Цяпер мне многае зразумела, — прамовіла Наста. — Хаця пытанняў яшчэ шмат.

— Прабач, — выдыхнуў Вадзім і вярнуў картку.

Бракавала слоў, каб пракаментаваць належным чынам усё, што сёння адбылося. Надараюцца часам выпадкі, калі любыя словы, нават самыя правільныя, могуць стацца залішнімі, непатрэбнымі. Свет наш зусім іншы, не такі, як мы звыклі бачыць, успрымаць. Усё вакол значна складаней.

Наста ўжо ніколі не стане былой, як некалі тое здарылася і з Вадзімам. Так ужо да скону, пакуль не паўстанеш перад Творцам. Вадзім усвядоміў гэта, калі апрытомнеў у хаце айца Аляксандра і ўбачыў крыж. Цяпер наступіла чарга і выкладчыцы Анастасіі Звягінай. Ён павярнуўся да дзяўчыны і сустрэў яе погляд. Здаецца, любыя тлумачэнні цяпер былі лішнімі.

І Наста прамовіла тое, што было лагічным, правільным і адзіным годным у дадзеным выпадку. Нарэшце тое, што Вадзім яшчэ на пачатку іх знаёмства рыхтаваўся пачуць.

— Вы прымаеце ў сваё кола жанчын?

Пытанне завісла ў паветры. Яно было рытарычным, дзеля прафармы.

Вадзім варухнуў стырно і ціснуў на педаль.

Наста глядзела ў вакно на мільгаючыя слупы электраперадач, дамы ў начным змроку, людскія постаці і разумела: яе лёс вызначыўся ўжо тады, калі выбрала гістарычную навуку.

"Таёта" Вадзіма ляцела праз начны змрок. Шлях быў толькі наперад.

# ДОМ, ЯКІ ЗДЗЯЙСНЯЕ ЖАДАННІ

Імя — Надзея.
Прозвішча — не пазначана.
Узрост — 22 гады.
Матэрыяльна незалежная.
Дзяцей няма.
Захапленні — мастацтва (пішу алеем), музыка, міфалогія.
Мэта знаёмства — сяброўства, мажліва, блізкія адносіны.
Фотаздымак прыкладваецца да асноўных звестак.
Праглядаў старонкі — на сённяшні дзень 15.
Астатнія дадзеныя адсутнічаюць.

***

Шэрая рвань аблокаў захінула неба, і ўстойлівая імжа ледзянымі струменямі хвастала ў твар, змешвала на зямлі ў парку жоўклае лісце з брудам, псавала настрой.

Я стаяў на каменным ганку двухпавярховага асабняка, што месціўся далёка па-за горадам, збіраўся націснуць клапыжок званка, калі пачуў выразнае “Бом-м-м!”.

Гук вымусіў мяне спыніцца.

Сэрца забілася мацней у прадчуванні хуткага знаёмства, перахапіла дыханне, запульсавала ўвушшу... і я не знаходзіў смеласці пазваніць у дзверы.

"Бом!" прабіла дванаццаць разоў. Гук зыходзіў з-за дзвярэй, аднекуль з глыбінь хатніх пакояў.

Я зірнуў на гадзіннік. На ім было без пяці хвілін дванаццаць.

Я некалькі разоў выдыхнуў і націснуў клапыжок.

Настала невыносная пара маўклівага чакання, калі хвіліна здаецца бясконца доўгай. Зрабілася шчымліва.

Нарэшце дзверы прычыніліся і паказаўся малады жаночы твар. Зусім не той, што выстаўляўся на сайце знаёмстваў. Не той, што я чакаў.

Мы з хвіліну глядзелі адно на аднаго, затым я ціха павітаўся.

— Вам каго? — пацікавілася жанчына незвычайна нізкім голасам.

Крыху павагаўшыся, я назваў імя.

— Надзеі пакуль няма, але хутка мусіць з'явіцца, — адказала жанчына і ацэньвальна разглядзела мяне з галавы да ног, ажно заняёмчыла.

— Праўда, вы можаце пачакаць у пакоі.

Жанчына дапамагла мне распрануцца і правяла ў гасцёўню.

У вочы кінуліся адразу антыкварная мэбля, вельмі шмат старадаўніх рэчаў, якія месціліся паўсюдна. Усё было расстаўлена з густам, знаходзілася нібыта на сваім месцы. Здавалася, аднімі адну рэч — і разбурыцца вытанчаная гармонія пакоя, які больш нагадваў музей.

Жанчына прапанавала ўсесціся ў велізарнае крэсла супраць горача натопленага каміна.

— Гарбата, кава, каньяк? — спытала яна.

Я папрасіў кавы.

Жанчына паднялася на кухню, і я выпрастаў рукі да каміна, адчуў цеплыню.

Мае ногі тапіліся ў таўшчэзным дыване. Крэсла было ўтульным. Цяжкія зялёныя парцьеры закрывалі вакно, і чырвоныя вугельчыкі ў каміне патыхалі спакоем, вельмі прыемным у гэтым музейным паўзмроку.

Усе хваляванні з нагоды знаёмства зніклі гэтак жа хутка, як і з'явіліся.

Нечакана я ўбачыў шафу, што займала палову сцяны побач з уваходам. Яна аказалася забітай плыткамі, кампакт-кружэлкамі і звычайнымі аўдыякасетамі. На куце месціўся монстрападобны музычны цэнтр. Я падумаў, што наконт захаплення музыкай Надзея не падманула.

Жанчына хутка вярнулася з падносам. Прыемны водар дарагой кавы шлейфам распаўсюдзіўся па хаце.

— А вы хто? — спытала жанчына, паставіўшы паднос на шыкоўны круглы столік каля крэсла.

— Сябар Надзеі.

Яна выгнула бровы.

— Штосьці я вас не прыгадваю.

— Мы нядаўна пазнаёміліся, — схлусіў я і задумаўся.

Насамрэч я знаёмы з Надзеяй ужо з паўгода. Блукаючы па павуцінні сеціва, я аднойчы натрапіў на сайт знаёмстваў. Надзеін фотаздымак выхапіў выпадкова. У сеціве сотні тысяч і болей фотаадбіткаў людзей, якія мараць з кімсьці пазнаёміцца. Хто дзеля сяброўства, хто дзеля стварэння сям'і. Апошніх я не вельмі шаную і стаўлюся да іх непрыязна. Але твар Надзеі ўрэзаўся ў памяць. Праз дзень я зноў завітаў на сайт знаёмстваў, знайшоў яе выяву і доўга разглядаў. Потым напісаў ліст, не спадзеючыся на адказ.

Надзейка адказала. Завязалася ліставанне.

Прызнаюся, мяне заўжды свідравала пытанне: ці можна назваць знаёмства ў сеціве сапраўдным? Таму я схлусіў, сказаўшы, што мы пазнаёміліся нядаўна.

Мы пілі каву і, здавалася, няёмка маўчалі.

Жанчына несумненна была прыгожай. На выгляд гадоў мо пад трыццаць. Чорныя вочы гузікамі, выгнутыя бровы, смалістага адцення валасы. Мармуровасць твару надавалі таксама пафарбаваныя ў чорны колер вусны. Апранутая ў чорную баваўняную сукенку, якая

падкрэслівала правільныя рысы фігуры. На шыі залатога колеру калье, якое больш нагадвала ашыйнік. Вельмі шыкоўны ашыйнік...

Нібыта парцалянавыя рукі трымалі кубачак. Доўгія пальцы заканчваліся чорнымі бліскучымі пазногцямі. Жудасная прыгажосць. У моладзевым асяроддзі такіх завуць готамі. Жанчына не спяшалася пачаць гутарку, я загаварыў першым.

— Мабыць, вы сястра Надзі?

— Настолькі падобныя?

— Не сказаў бы...

— Я — сяброўка, як і вы, толькі мо бліжэй, — запэўніла жанчына і дадала пасля: — Насамрэч мы падобныя толькі духоўна.

— Аднолькавыя захапленні?

— Не толькі.

— Погляды на жыццё?

— Магчыма, — яна невыразна паціснула плячамі.

Мы крышачку памаўчалі. Час ад часу цішыню парушала патрэскванне вугалля.

— Я заўважыў процьму запісаў...

— Надзя сабрала досыць неблагую калекцыю. А вы аматар музыкі?

— Па шчырасці, я музыкант.

— О-о-о, — чорныя вочы жанчыны раптам зрабіліся агромністымі, нібы прадонне. — Паважаю музыкантаў.

— Дзякуй.

Яна паставіла кубачак на стол і паднялася з крэсла.

— У гэтым выпадку я што-небудзь пастаўлю.

Жанчына наблізілася да шафы, пачала шабуршэць кружэлкамі. Я міжволі заглядзеўся на яе лыткі, адзначаючы іх ідэальную форму. Потым схамянуўся, адагнаў прэч памаўзлівую думку. Адвярнуўся да гарачага каміна.

— Знайшла, — абмовілася жанчына. — Мяркую, "Іглз" зараз будзе ў тэму. Вам падабаецца "Іглз"?

Я пацвердзіў.

Неўзабаве пакой напоўніўся гукамі "Гатэля «Каліфорнія»". Акустыка ўражвала. Першыя акорды здаліся чароўнымі.

Яна вярнулася да століка, але не сядала. Стала па-за спінкай майго крэсла. Прамовіла:

— У агонь можна глядзець бясконца доўга.

Я згадзіўся.

— Мне падабаецца агонь, — сказала яна. — Агонь — гэта стыхія. Раней лічылася, што свет складаецца з чатырох стыхій: агню, вады, паветра і зямлі. Я люблю агонь. Ён прыемны.

Апошнія словы яна прамовіла шэптам.

— Давайце патанцуем, — нечакана прапанавала жанчына, якую я пра сябе паспеў назваць Багірай — па асацыяцыі з персанажам мультфільма "Маўглі".

Я разгубіўся. Патанцуем? Вельмі прыемна. А што падумае Надзея, калі неўзабаве вернецца?

Яна нібы прачытала мае думкі.

— Давайце, тут такая адзінота... — Багіра дакранулася рукой майго пляча, я адчуў лёд і полымя чорных пазногцяў. — Песня скончыцца хутчэй, чым вернецца наша сяброўка.

Штосьці мне зрабілася не па сабе.

— Вы мужчына ці не? Жанчыне не да твару прасіць двойчы.

Незразумелая сіла вымусіла мяне падняцца. Мы зблізіліся сярод гасцёўні, крыху абняліся. Музыка павольна загойдала нас на сваіх хвалях...

Унутры я быў збянтэжаным, хоць выгляду не падаваў. Багіра ўчапілася кіпцюрамі мне ў плечы і быццам юрліва прымяралася, дзе ўкусіць перш за ўсё. Мяне ледзь не перасмыкнула — на яе твары ляжаў адбітак смяротнага граху. Пачварная жанчына.

Засмактала недзе пад лыжачкай...

Непрыемная сітуацыя. Вельмі.

— А што вы іграеце? — пацікавілася Багіра.

— Пахавальныя маршы, — вырвалася з мяне.

Я глядзеў на партнёрку па танцы анёльскім тварам нявіннасці і чакаў рэакцыі.

У ейным позірку міргнуў агеньчык.

— Вельмі цікава паслухаць... — прашаптала яна ў адказ.

— Пры выпадку я вам сыграю, — запэўніў я.

— Даволі смела, — прамурчэла Багіра пасля непрацяглага роздуму. — Спадзяюся, вы не пакінеце мяне расчараванай.

У знак згоды я апусціў вейкі.

— Чаму вы не спытаеце маё імя?

— Я ведаю яго.

— Няўжо?

— Вы Багіра, чорная пантэра, якая палюе на чужых мужчын і толькі чакае зручнага моманту, каб учапіцца ў чыйсьці каўнер.

— Вас нельга назваць ветлівым, але вы мяне ўразілі, — прамовіла жанчына ўдумліва, назіраючы за маім тварам. — Несумненна, у мяне іншае імя... У мяне было мноства імёнаў, якія ніколі спаўна не выражалі маёй сапраўднай існасці. Вось Багіра насамрэч мне пасуе. Завіце мяне менавіта Багірай. А вас як зваць?

— Вальдэмар.

— Арыгінальна.

Я сціпла падзякаваў.

— Вы злуяцеся, што прымусова танцуеце са мной?

Я прамаўчаў, у думках пасылаючы нябёсам мальбу пазбавіць мяне ад нечаканай знаёмай.

— Вас свідруе, што Надзея ўбачыць нас удвух, пакрыўдзіцца і ваша кароткае знаёмства завершыцца. Яна вам падабаецца больш, чым я?

Багіра раптоўна закінула нагу мне за сцягно і моцна прыціснулася, абшчапіла рукамі за шыю, я адчуў пах яе смаляных валасоў. Унутры адразу ўспыхнула палкае жаданне паваліцца з ёю і тут жа жорстка авалодаць, аддацца на імгненне пякельнаму полымю жарсці.

— Вальдэмар...

“Калі ласка, завітвайце ў гатэль «Каліфорнія» — гэтае цудоўнае і прыгожае месца”, — спявалі “Іглз” па-ангельску.

— Хопіць! — раўнуў я.

Багіра не чакала такой рэакцыі.

Я сілай адарваў яе ад сябе, гняўліва пачырванеў, вярнуўся да каміна, павярнуўшыся спінай.

Яна запляскала ў далоні.

— Брава, Вальдэмар! Надзея павінна ганарыцца вамі. Не ведала, што ў наш век яшчэ засталіся мужчыны, здольныя даць адпор спакусе.

— Цяпер будзеце ведаць, — агрызнуўся я.

— Прабачце. Я паводжуся як апошняя дурніца, — раптоўна пасур'ёзнела Багіра. — Мне сорамна, шчыра прызнаюся. Прабачце. Пайду збяру на стол, падсілкуемся, пакуль Надзі няма, вы, бадай, галодны, да нас няпроста дабірацца на перакладных, — Багіра пакрочыла да вінтавой лесвіцы. — Вы тут пакуль не сумуйце, Вальдэмар. У гэтым доме шмат цікавага.

Яна знікла, яе мяккія крокі былі амаль нячутнымі.

Я зірнуў на гадзіннік: мінула хвілін дваццаць з моманту, як я пераступіў ганак.

“Да нас няпроста дабірацца, — падумаў я. — Да нас. Жывуць разам?”

Каб прывесці ў парадак думкі, я прыняўся даследаваць пакой.

Я наблізіўся да шафы с кружэлкамі, заклаў рукі за спіну і доўга разглядаў плыткі. Калекцыя сапраўды ўражвала. Наўздагад дастаў некалькі штук. Патрапілі Джым Морысан, кельцкі этнас, “ВКЛ”. Музыка на любы густ. Нават меліся Cannibal Corpse. Потым вярнуў запісы на месца і не мог зразумець, што здарылася? Надзя здавалася пунктуальнай дзяўчынай. У рэшце рэшт, на сустрэчы ў чатах сеціва ніколі не спазнялася. Мо сапсаваўся гарадскі аўтобус?

Я рассмяяўся з сябе. Наўрад уладальніца багатага асабняка-музея будзе карыстацца грамадскім транспартам. Мінімум таксоўка. Аптымальны варыянт — сваё аўто. А раз сваё аўто, маглі сустрэцца ў горадзе і прыехаць сюды. Ці Надзеі свярбела ўразіць мяне ўласнай маёмасцю, таму і вымусіла чакаць аўдыенцыі, быццам на прыёме каралевы Брытаніі?

Я развярнуўся, прайшоўся ўздоўж сцяны, увешанай жывапісам, палічкамі з парцалянавымі і каменнымі статуэткамі, падсвечнікамі і рознай нятаннай драбязой. На палотны і антыкварыят амаль не звяртаў увагі, знаходзіўся думкамі ў іншым месцы.

Злавіў сябе на тым, што думаў пра Багіру. Бач ты, ні разу не сустракала мужчыну, які б устаяў перад яе чарамі. Смешна. Раптам наплыла думка, што, у адрозненне ад Надзеі, сяброўка задужа разбэшчаная.

Я пакрочыў да вакна, побач з якім вісеў здаравенны гадзіннік нявызначанага стагоддзя. Ківач марудна боўтаўся зад-перад. Здаецца, яго медную паверхню не чысцілі з эпохі цара Гароха.

Цяжкія зялёныя парцьеры закрывалі ўсё вакно цалкам. Я адхінуў трошкі, каб зірнуць на двор. На вуліцы лупіў дождж. Цяжкія струмені расплываліся па тоўстым шкле, і ўбачыць, што там за вакном, не было магчымасці. Размытыя каляровыя цені маячылі перад вачыма, лівень насамрэч зарадзіў не на жартачкі.

Пальцы выпадкова намацалі штосьці глянцавае. Я зірнуў і ўбачыў вокладку кнігі “Псіхічныя адхіленні і падваенне асобы”.

Доўга глядзеў у вакно на дождж і асэнсоўваў назву...

Праз нейкі час захінуў парцьеры, як былі, сеў у крэсла перад камінам.

Сумна.

“Калі ласка, завітвайце ў гатэль «Каліфорнія» — гэта цудоўнае і прыгожае месца”, — заклікалі “Іглз”.

Песня была зацыклена на паўтарэнне і ўжо гучала бадай чацвёртым разам.

***

Я ўжо пачаў нервова барабаніць пальцамі па падлакотніках крэсла, калі Багіра паклікала падняцца на другі паверх.

— Вальдэмар, вы не супраць паабедаць прама на кухні? — удакладніла Багіра і патлумачыла: — Вельмі неахвота насіцца з ежай уверх-ніз.

— Не супраць.

Прызнацца, карцела паглядзець, як выглядае асабняк на другім паверсе. Нічога звышнатуральнага я не сустрэў. Кухня як кухня. Нават занецікавіла. Праўда, абсталяваная па апошнім слове тэхнікі.

Багіра дастала з мікрахвалёўкі смажаную курку, паставіла на акуратны распісны столік, дзе ўжо чакалі місы з салатамі, зелянінай і нарэзаны тонкімі кавалачкамі хлеб. Вытанчаны пах прыпраў казытаў у носе.

Мы селі.

Пакуль абедалі, частыя вадзяныя кроплі гучна барабанілі па даху. Багіра не адводзіла ад мяне вачэй і ела зусім мала, як птушаня. Я ж, наадварот, адчуў апетыт і палічыў, што лішнія калорыі не перашкодзяць, тым больш прыгатавана было вельмі якасна і смачна.

Пасля мы пілі каву і размаўлялі.

— Прабач, я насамрэч цябе збянтэжыла, — апраўдвалася Багіра.

— Без праблем, — я надаў сабе абыякавы выгляд.

— Гэты дом стары, яшчэ пазамінулага стагоддзя.

Я ўважліва слухаў.

— Бацькі нашай агульнай сяброўкі набылі асабняк, калі ён быў у вельмі знявечаным стане. Легенды сведчаць, тут жыў вядомы мастак. Захаваліся архівы, дзе пазначана дата пабудовы — 1875 год. Уяўляеш, Вальдэмар, дом з пазамінулага стагоддзя, — распавядала Багіра. — Надзін бацька ўклаў у рэстаўрацыю і аднаўленне шмат сродкаў. Ён займаецца антыкварыятам, вельмі заможны чалавек.

— Прабач, — перабіў я. — Якім чынам асабняк перайшоў у прыватныя рукі? Сядзібы панскіх часоў пад дзяржаўным кантролем.

— Цуд. Пасля рэвалюцыі ўладальнікамі дома сталі мясцовыя жыхары, затым тут месціўся сельсавет, а ў 90-я, калі ўзяліся выплачваць кампенсацый нашчадкам тых, кім ахвяравалі падчас савецкіх рэпрэсій, дом вярнулі далёкаму сваяку былых уладальнікаў, а той ужо перад сконам прадаў.

— Неверагодна, — я амаль паверыў.

— Выпадковасць, — запэўніла жанчына. — Шмат месца ў жыцці займае выпадковасць.

— Надзея нічога не расказвала.

Багіра памаўчала.

Неўзабаве мы налілі па другім кубачку кавы.

— Дом утойвае шмат загадак, — ціха прамовіла жанчына.

— Напрыклад?

— Існуе паданне, што раз у год тут здзяйсняюцца самыя патаемныя жаданні кожнага, хто пераступіў парог.

Я паціснуў плячыма.

— Мабыць, сёння той самы дзень.

— Што тут смешнага, Вальдэмар? — здзівілася Багіра. — Ты маеш патаемныя мары?

Я задумаўся на паўхвіліны. Так я табе і скажу.

— Можаш не адказваць. Калі ёсць жаданні, дом іх здзейсніць.

— На дадзены момант мне карціць хутчэй убачыць Надзейку, — выдыхнуў я.

— Вернецца, — запэўніла Багіра. — Калі скончыцца дождж, Надзейка вернецца. Надзея заўсёды вяртаецца, калі канчаецца дождж. Як вы пазнаёміліся, калі не сакрэт?

— Без сакрэтаў, праз сеціва.

Багіра шматзначна прамычэла сабе пад нос.

— Выпадкова?

— Атрымліваецца, так, — я коратка ўздыхнуў.

Жанчына задумалася.

— Але ж цябе прывёў кон.

— Не разумею, — я разгубіўся.

— Дому патрэбны гаспадар.

— Прабач, запярэчу. Я знаёміўся не дзеля асабістай выгады і мяне зусім не цікавіць пасаг. Дарэчы, пра асабняк я даведаўся толькі сёння.

— Дарэмна злуеш, — сказала Багіра. — Насамрэч толькі ты так лічыш. Справы склаліся зусім па-іншаму. Праўда шакуе, Вальдэмар. Не ты выбіраў. Дом абраў цябе.

Я з'едліва скрывіўся.

— Па-твойму, дом жывая істота.

— На свеце мёртвыя рэчы не існуюць, калі хочаш ведаць. Тут усё жывое...

Бліснула маланка і грымнуў гром. Багіра непрыкметным рухам расpляскала каву.

Эх, не трываю я пафасу. Пад залішкамі пафасу хаваюцца злыдні. Я зморшчыўся, не чакаў пачуць падобныя словы. Здаецца, я крыху памыліўся наконт Багіры. Працяла нечаканая здагадка: Багіра проста вар'ятка. Мажліва, з шызафрэнічным ухілам. Як я не зразумеў адразу, заўважыўшы пякельны агеньчык у яе позірку? Недарэмна ж за парцьерамі на падваконні ляжыць фаліянт па псіхіятрыі. Па спіне прабегліся мурашы.

Сяброўка Надзі некалькі імгненняў углядалася ў мой твар, пытальны позірк разбіўся аб каменную маску майго экзістэнцыйнага пафігізму.

Багіра зноў заварыла кавы. Духмяны водар бадзёрыў. Не заснуць цяпер да раніцы. Калі па-добраму, то варта сабраць манаткі ды сысці адсюль як мага спрытней. Але ж на вуліцы лівень, тупаць дадому далёка. Дый хацелася дачакацца інтэрнэт-сяброўку, каб расставіць усе кропкі ў гісторыі нашага знаёмства. Хоць, з іншага гледзішча, мне ўжо ніякага знаёмства

не хацелася. Навідавоку перада мной пэўна няўдалы жарт. У любым выпадку трэба дачакацца, пакуль вернецца нармальнае надвор'е.

— Раскажы мне пра дом, — папрасіў я. — Хачу пачуць усю гісторыю з пачатку.

— Гісторыя дома заняла б вялікую кнігу, але я распавяду пра галоўнае ў агульных рысах, — выдыхнула Багіра. — Некалі палац пабудаваў вельмі добры, душэўны чалавек, у якога была прыгажуня жонка. Яны шчасліва жылі ў дабрыні, пяшчоце і спагадзе. Здавалася, каханне іх вечнае, бясконцае, як неба. (Цьфу, можна без пафасу?) Гэта адбылося ў далёкія дні дзевятнаццатага стагоддзя. Аднойчы здарылася жахлівае: жонка здрадзіла мужу. Сапраўднае каханне — калі здолееш дараваць блізкаму чалавеку здраду. Муж не здолеў, не вытрымаў ганьбы, у адзіны момант ціхая сямейная ідылія лопнула бурбалкай. Муж страшэнна раззлаваўся, адбылася трагедыя.

Багіра цяжка ўздыхнула, я ўважліва слухаў.

— Ён забіў яе. Адной куляй з паляўнічай стрэльбы, затым пакінуў усё як ёсць і сышоў на край свету.

Жанчына замаўчала. Мне прымроіўся ў галаве сюжэт са стрэльбай. Я чакаў працягу гісторыі.

— З тае пары дом блукае ў часе і прасторы. Ён выбірае людзей, падобных да былога гаспадара, вымушае кожнага прыйсці сюды, выпрабоўвае. І хто вытрымае выпрабаванне, стане гаспадаром дома, — завяршыла Багіра.

— І што? Да гэтай пары ніхто не вытрымаў іспытаў?

— Ёсць маленькі сакрэт. Выпрабаванне можа прайсці толькі сапраўдны гаспадар дома.

Я ледзь усміхнуўся.

— Не ўяўляю. Гаспадар жа даўно памёр.

Вочы Багіры ўспыхнулі нездаровым бляскам.

— Няма ўпэўненасці. Паданне сведчыць, што жонка таго гаспадара не адразу памерла ад кулі, яна пра-

кляла мужа, які з таго моманту асуджаны вечна бадзяцца па зямлі.

Спытаўшы, што адбываецца з гасцямі, што не прайшлі іспыт, я атрымаў зусім ужо "вясёлы" адказ:

— Дом іх простаператрушчвае ў дробны мак сваімі сценамі-сківіцамі.

— Благая перспектыва.

— Я пажартавала. Замест аплаты за прытулак кожны пакідае часцінку сябе.

— І якую часцінку прапануеш мне пакінуць? Руку, нагу, галаву ці... — я шматзначна з прытворнай трывогай зіркнуў сабе ўніз.

— Душу. Вось нашае сапраўднае багацце. Боль, радасць, няшчасце, каханне. Пачуцці добрыя або благія. Энергіі нервовых нітачак у нашым целе. Дом імі сілкуец-ца. Таму яму непатрэбныя абыякавыя людзі. Дом рады самаадданым гасцям, лепей сказаць, сентыментальным, у якіх пачуцці дамінуюць над халодным розумам.

Не, я зусім гэтага не разумеў, хаця патыхала старой добрай фантастыкай. Але ж, прабачце, фантастыка — гэта адно, а сутыкнуцца сам-насам са звар'яцелай бабай — зусім іншае.

— Гвалтоўна выціснутыя эмоцыі дому не трэба, Вальдэмар. Патрабуецца сапраўднае пачуцце — з глыбінь сэрца. У чым хаваецца сапраўдная прычына твайго знаёмства з Надзеяй? Мо калісьці ў тваім лёсе здарылася трагедыя? Спытай сябе.

Ну якія, да халеры, трагедыі? Я жыў амаль шчасліва. Аднак наша размова мусіла набыць характар псіхатэрапіі або гутаркі з дэльфійскім аракулам.

Ніякая яна не вар'ятка, раптам чамусьці вырашыў я. Проста безнадзейна адзінокая жанчына, кранутая на старажытных паданнях. А адзінокая жанчына, зразумела, страшнейшая за мірны атам. Дзве багатыя сяброўкі жывуць пад адным дахам. Вядомая справа: чым больш багацця, тым глыбей адзінота.

— Уражвае, калі шчыра, — з мяне вырваўся ўздых. — Упершыню сутыкаюся з падобным феноменам.

— Страшна, так?

— Зусім не, — я павагаўся. — Не ведаю.

Я памаўчаў.

— Лічыш мяне вар'яткай? — спытала Багіра.

Я не адказаў.

Здаецца, дождж зарадзіў да вечара. Кампанія Багіры надакучыла мне гарчэй перцу. Пляваць на дом і непагадзь, я стаміўся. Мне карцела хутчэй дабрацца да сваёй утульнай кватэры.

Я падняўся, сціпла падзякаваў за пачастунак, папрасіў перадаць Надзейцы прывітанне і няспешна пакрочыў да выхаду.

— Зайдзі ў спальны пакой, Вальдэмар.

Я разгубіўся.

— Зайдзі, — яна паўтарыла настойліва. — Напаткаеш тайну.

Чарговы ўзровень гульні? Нічога не разумею.

— Па калідоры направа, — растлумачыла яна. — Заблукаць немагчыма.

Я павярнуўся і крочыў за дзверы. Мне хацелася хутчэй паставіць кропку.

Шлях да спальні — сцежка ў каматоз. Ногі самі данеслі мяне да інкруставанай залачонай ручкі замка, што адчыняў браму ў невядомае.

Што Багіра мне падліла ці падсыпала? Даўно я сябраваў з правізаркай. Аднойчы яна паказвала мне спецыяльныя прэпараты, якія набыць без рэцэпту нельга, наркатычныя рэчывы. Прамаўляла назвы складаных хімічных формул, нібы шаманскія заклёны. Сярод іх сустракаюцца і такія, што пры асаблівых умовах могуць выклікаць галюцынацыі.

Навошта я тут? Я не ведаў, але ўнутры свярбелі цікавасць, страх, і нешта ледзяное абдымала плечы. Я адчыніў дзверы і з пачуццем запраграмаванага зомбі ўвайшоў у пакой.

Мяне ўразіла вялікая карціна, амаль на ўсю сцяну. Перад ёй стаяў кандэлябр з шэра-чорнай свечкай. Побач месціўся круглы столік, на якім прытаіліся некалькі спісаных лістоў і канверты. Паўзмрок.

Цёмная скура канапы ўздоўж сцяны.

Пстрыкнуўшы запалкай, я паднёс вясёлы аганёк да свечкі, каб лепш разглядзець карціну. На свечцы затанчыла халоднае сіняе полымя, пялёстак якога аказаўся значна большым у памерах, чым я чакаў.

Не. Нармальныя свечкі так не гараць. Злітуйся, Божа, аб чым гэта я? Патыхнула скразняком, хоць дзверы за сабой я шчыльна зачыніў.

І карціна ажыла...

Вушы набрынялі шэптам мінулага, сыходзячага з мазаікі халодных фарбаў, якія сведчылі маю прыналежнасць і непрыналежнасць да падзей векавой даўніны. На карціне былі Багіра і я. Яна ляжала з дзірачкай паміж грудзей, а мае рукі трымалі стрэльбу. Увушшу гучала жахлівая гісторыя трагічнага кахання, расказаная Багірай. Нібыта паўсталі здані. Я зразумеў пачуцці ката Шродынгера, які сядзеў у сваім карабе, жыў і не жыў адначасова. І нельга гэта праверыць, пакуль не адсунеш вечка, каб зазірнуць унутр. Свядомасць адмаўлялася ўспрымаць, кіруючыся здаровай логікай.

Пастаяўшы з хвіліну, я задзьмуў свечку, і здані зніклі. Нібыта пасля працяглай сваркі, мы з ценямі прыйшлі да паразумення, што, хутчэй за ўсё, зямля круглая.

Я пакрочыў прэч.

Багіра чакала каментароў.

Я прастаяў нерухома, здаецца, вечнасць. Насамрэч хвіліны тры. Я разглядаў яе, не ведаючы, аб чым спытацца.

— Падабаюся? — пацікавілася Багіра і выгнулася, нібы котка, спакушаючы мяне абрысамі фігуры.

Я ўважліва паглядзеў у яе чорныя, падобныя да сінгулярнасці чорных дзірак, вочы. Захацелася пагладзіць яе супраць поўсці.

— Скажы, навошта ўсё — знаёмства ў сеціве, ліставанне, сустрэча? Навошта я тут? Табе не здаецца, што залішне ўсё... Карціну Надзея малявала? Вы даўно за мной сочыце? Вы абое задумалі нешта благое?

Мяне пасунула ўбок, захлынула хваляй раптоўнай слабасці ў нагах.

— Хочаш праўду? — яна прыўзнялася. — Пераспі са мной.

Да мяне не адразу дайшоў сэнс.

— Пераспі? — я аслупянеў.

— Ты ж хацеў Надзею, давай, не губляйся. Я і ёсць Надзея.

— Ты... Ты... — я не знаходзіў слоў.

— Не прыкідвайся святошам, Вальдэмар, — яе голас цішэў і пераўтвараўся ў шэпат. — Вазьмі мяне і пра ўсё астатняе забудзь. Мы павінны спатоліць смагу дома, знішчым векавы праклён, і дом перастане цягнуць жыццёвыя сілы з нас.

Яна паднялася з-за стала, наблізілася нячутнымі пругкімі крокамі. У яе чорных зрэнках свяцілася маё разгубленае адлюстраванне. Лютая злосць ахінула ейны твар. І не проста злосць, яе апанавала чорнае натхненне наўпрост з апраметнай. Я ледзь не войкнуў перад гіпнатызуючым позіркам раз'юшанага драпежніка. На кароткае імгненне падалося, што яна зараз учэпіцца мне ў шыю і пачне грызці.

— Пакінь Надзею, — гучным шэптам прамовіла Багіра. — Пакінь... дзеля мяне. Застанься назаўсёды са мною — і зведаеш таямніцы, я адкрыю для цябе недасягальны свет, навучу зазіраць у будучыню і мінулае, вандраваць паміж зоркамі. Мы павінны зліцца ў адзіным мігу жарсці, дазволь дому выпіць нас да дна.

Я адхіснуўся.

— Вальдэмар. Ідзі да мяне.

Вочы Багіры гарэлі нядобрай чырванню. Злосць на твары набрыняла юрам. Здаецца, яна была гатова вось-вось кінуцца на мяне і згвалціць.

Я адсоўваўся далей, прыкідваючы адлегласць да выхаду. У мяне было мала шанцаў.

— Ты не зможаш вырвацца адсюль, пакуль не загадаеш жаданне. Дом не адпусціць, і... я не дазволю!

Я працягваў адступаць.

— Глядзі!

Адным рухам Багіра разадрала сукенку, агаляючы, нібы спелыя яблыкі, грудзі.

Бліснула маланка, грымнуў гром.

З майго лба сарвалася кропелька вільгаці і застыла ў паветры.

Стоп-кадр!

Паўза.

З яе горла вырывалася булькание і здзеклівы смех.

Паміж грудзей Багіры чырванела акуратная дзірачка, несумненна след кулі. З яе плынню струменілася кроў, відавочна намаляваная чырвонай фарбай, якую я зараз жа распазнаў па паху.

Нібыта ў зачараваным сне, я тузануўся, вырваўся з гіпнатычных кайданоў і пабег да выхаду.

— Застанься!

Я не слухаў. Стрымгалоў скаціўся па лесвіцы. За некалькі крокаў да дзвярэй мяне, здаецца, ахінулі туман і здранцвенне, нахлынулі жуда і пуд, ногі зрабіліся ватнымі, час замарудзіўся, я адчуў пад сабою бездань...

Мяне накрыла коўдрай бяспамяцтва. У чорнай пустаце, па-за целам і светам, нібы з замшэлага куфра выплыў змест нашага ліставання. І чуліся выразныя гукі "Бом!".

Мяне чымсьці атруцілі, казаў ужо. Няйнакш наркатычным рэчывам, пэўна, моцным барбітуратам. Даўней я вельмі марыў пакаштаваць сапраўднага абсэнту. Палыновая выцяжка, як кажуць, з моцным смакам, горыччу і галюцынагенным эфектам. Мне свярбела і карцела, а дзе ж узяць, сапраўдны абсэнт выраблялі сто год таму, цяпер ён іншы. Напэўна, абсэнт аказваў падобны ўплыў.

Ізноў чулася “бом-бом!”. Ці мо гэта ўжо звінела ў галаве? Ці мо гэта ўжо тагасветны звон бомкаў па мне?

Відовішча на карціне ў спальным пакоі застыла перад вачыма і насцігала мяне, напаўзалі жахі... Там, на карціне, напісанай алеем, я стрэліў з ружжа. Ці мо мне здавалася, што стрэліў? Ці мо не я? Мне тэрмінова патрабаваўся антыдот. Свет вакол быццам кінуўся ў скокі. Падступілі ваніты. Цікавая гісторыя інтэрнэт-кахання.

“Бом-бом!” — надакучліва і ўпарта бомкала, гудзела наваколле.

Я нарэшце здагадаўся, што гэта не гадзіннік і не нябесныя трубы па маю пакутлівую душачку. Няйначай хтосьці невядомы званіў у дзверы, хацеў трапіць у хату. Я прыслухаўся, наколькі было магчымым у маім стане прыслухацца. Свядомасць плыла, я гайдаўся, нібыта на арэлях, і з абыякавым спакоем чакаў адключкі. Цеплыня разлівалася па целе. Цеплыня і цемра. Я не павінен спаць, думаў я, і сам сабе адказваў: ну і хай.

Падалося ці не, але быццам хтосьці цяжкімі, гулкімі ўдарамі-штуршкамі ламаў дзверы, з крыкам і натхненнем.

Шкада, віртуальнае сяброўства абярнулася залішняй драмай. Больш ніколі не буду знаёміцца з жанчынамі ў сеціве. Не буду, калі выжыву. Шанцуе ж нарвацца на прыгоды. Ото ж! Дзень гневу і роспачы...

Яна няўмольна набліжалася ззаду, я чуў крокі. Я чакаў стрэл у спіну або ўдару рытуальным нажом.

Мне хацелася абярнуцца і глянуць апошні раз, але сілы пакідалі мяне, я пачаў падаць,валіцца, нібы гара ў мора, чырвоны ворс дыванка ляцеў насустрач майму твару. Апошнім імгненнем я існасцю адчуў, што мы не адны. Хтосьці ўварваўся ў хату. Дужы, вялікі, з крыкам: “Надзея, стой!”

Аднекуль чуўся здзеклівы смех, чыйсьці голас настойліва шаптаў:

— Ніхто не можа выйсці без дазволу, раней пары...

“Калі ласка, завітвайце ў гатэль «Каліфорнія» — гэта прыгожае і цудоўнае месца”.

Паўза.

Звон увушшу.

Цішыня.

Я памёр.

***

У дзяцінстве я баяўся цемры. А яшчэ больш — людзей у масках. Маскі — страшэнныя пачвары са свету дзіцячых жахаў, са свету пудлівых сноў. Маскі мёртвыя ва ўласнай існасці, таму падсвядома выклікаюць сполах. Аднойчы я спужаўся так, што наплюжыў у шорцікі.

Мяне пужала старэйшая сястра. Яна насоўвала маску Бабы-Ягі, і для мяне адразу мяняўся свет вакол. Сястру я ўжо не бачыў, перада мной паўставала злавесная цётка з пачварнай усмешкай на пластмасавых чырвоных вуснах, якая харчуецца дзецьмі, і ўвесь вялікі свет вакол раптам змяншаўся ў памерах, сціскаўся да цеснай прасторы, у цэнтры каторай існуюць толькі спароджаная маёй фантазіяй пачвара і яе ахвяра ў маёй асобе. Ахвяра і пачвара...

“Прывітанне, Вальдэмар!

Сёння мне кепска.

На вуліцы імжыць, пахмурнае неба, шэрасць. Я сумую, музыка не дапамагае. Пэндзаль выслізгае з пальцаў, маляваць немагчыма. Настрой на нулі. Не разбяруся, чаго болей хочацца. Карацей, дэпрэсняк. Калі надвор’е пахмурнае, у мяне заўсёды дэпрэсняк.

Баюся, я пакутую на раздваенне асобы, бо гэтымі днямі я раблюся зусім іншай. Дакладна не скажу якой, але іншай. Здаецца, мая знешняя абалонка раскрываецца, падобна кокану, і я ператвараюся ў невядомую істоту. Яна жахлівая. Часам здаецца, я назаўсёды застануся ў яе абліччы. Раней падобнага са мной не назіралася. Я быццам не я і жыву не ў сваім целе.

Маркота пакідае мяне, як толькі надвор'е змяняецца ў лепшы бок. Але пакуль ідзе дождж, я іншая. Мае думкі камянеюць, я не належу гэтаму свету. Вальдэмар, на мяне хтосьці палюе, разумею, гэта падобна да вар'яцтва, але мне страшна.

Што б ні здарылася, не прыходзь да мяне на сустрэчу, калі кепскае надвор'е, нават калі мы папярэдне дамовімся. Схлусі што-небудзь, прыдумай прычыну, каб мы не сустракаліся, але не прыходзь.

Вельмі цябе прашу, не паяўляйся, калі надвор'е пахмурнае.

Звонка чмокаю.

Твая Надзейка".

***

Цемра. Цішыня. Цяплынь...

Я спаў і не думаў абуджацца, вылузвацца з прыемнай разняволенасці. Хтосьці дужы падхапіў мяне пад пахі, павалок і ўпіхнуў ва ўтульны фатэль. Моцныя пальцы памацалі пульс на шыі.

— Што ты яму дала? — грымнуў скрышальны бас.

Адказам быў здзеклівы істэрычны смех і плыня слоў па-лацінску, рыхтык нізка вершаў Вергілія. У іншай сітуацыі тое пытанне выклікала б ува мне абурэнне. А цяпер я проста адключыўся.

Заўважым: да маёй радасці, я не памёр. Расплюшчыць павекі было цяжка, быццам нехта трымаў за твар, у галаве ж лунаў туман і лёталі анёлы. Фігуральна, у вядомым сэнсе. Аднак мне ўдалося вярнуцца ў нармальны свет і амаль у прымальны стан. Панаваў паўзмрок. Рукі намацалі плед, якім мяне клапатліва накрылі. У целе адчувалася слабасць, але не хворая, а як пасля доўгага здаровага сну, які аднаўляе сілы і энергію. Досыць хутка я ачуняў. Прыўзняў галаў, заўважыў мужчыну ў фатэлі насупраць, які пільна разглядаў мяне ў чаканні абуджэння.

— Колькі часу? — спытаў я.

— Палова на восьмую вечара.

— А...

— Надзя спіць.

Прызнацца, я не ведаў, што спытаць далей. Хаця "што здарылася" сарвалася з языка, завісла ў паветры. Мужчына сабраўся з думкамі. На выгляд здаравяку было прыкладна пяцьдзясят пяць. Высечаны нібы з каменю твар, высакародная сівізна, разумныя пранізлівыя вочы і моцныя далоні. Былы ваенны? Спартовец?

— Мне вельмі прыкра за паводзіны маёй дачкі, — з яўным нежаданнем пачаў ён, з невялікімі паўзамі паміж слоў. — Як вашае імя?

Я адказаў.

— Мяне завуць Артур Аляксандравіч, — ён склаў далоні як перад малітвай. — Па-першае, прашу прабачэння за тое, што з вамі здарылася. Надзея хворая. Абставіны гэтак склаліся, што сёння яна засталася без належнага нагляду, ці, правільней сказаць, кантролю. Завяраю, больш гэта не паўторыцца. Па-другое, я вас папрашу, малады чалавек, захаваць усё ў тайне і проста забыцца на пачутае і ўбачанае. Вы выйдзеце за ганак, акуратна прычыніце браму, сядзеце ў таксі, якое я выклічу, назаўсёды з'едзеце адсюль і забудзеце зваротны шлях. Вам зразумела, паўтараць не трэба?

Сказана было няўмольна жорсткім тонам, які па меншай меры не любіў пярэчанняў. Іншым разам мне нічога не засталося б, як паслухмянаму хлопчыку, ветліва развітацца з грозным бацькам. Я ўжо намыліўся так і зрабіць, але звярнуў увагу на незаўважную акалічнасць. Мужчына сказаў "выклічу таксі". Каб быў насамрэч настолькі пагрозлівым, выклікаў бы ўжо загадзя. Мне ж свярбела ведаць больш.

— Артур Аляксандравіч, — я зрабіў паўзу. — Мушу быць прамым і шчырым. Мне падабаецца Надзея,

і я не менш сур'ёзна стаўлюся да абставінаў. Думаю, паміж намі моцныя пачуцці.

Суразмоўца адкінуўся на фатэлі, прыкрыў вочы, рукі ўпалі.

— Вось гэтага я і баяўся.

І ён перастаў быць пагрозлівым.

— Вы даўно знаёмыя? — вочы глядзелі цяплей.

— З палову года. Пазнаёміліся ў інтэрнэце. Ліставаліся, сябравалі, сёння Надзея запрасіла ў госці, — я вырашыў нічога не прыхоўваць. — Дарэчы, я ўжо сцяміў, што ў Надзеі пэўныя праблемы, дзяўчына нездаровая, і па вашым жаданні магу сысці і больш не паказвацца. Але ж зразумейце правільна. На другім паверсе ёсць вялікая карціна, мой сумесны з Надзяй партрэт. Я паўгода марыў пазнаёміцца ў рэальным жыцці з вашай дачкой. І цяпер, у самы захапляльны момант, мне свеціць ад варот разварот. І што, не патлумачыце?

Мужчына на імгненне напяўся.

— Я пачуў тут столькі ўсяго, Артур Аляксандравіч, і пра вас, і пра дом, і самае галоўнае — убачыў вашу дачку ў нечаканым ракурсе, — цісну я. — Хіба вы не раскрыеце таямніцу цікавага палатна, на якім нехта намаляваў мяне і Надзейку ў дужа драматычных абставінах?

— Вось чаму мне падаўся знаёмым ваш твар. Аказваецца, вы той самы чалавек з карціны. Ну...

Ён падумаў, узважыў і відавочна зрабіў выснову, што проста так выпхнуць госця за дзверы не атрымаецца. Прасцей употай прыдушыць. А яшчэ лепей і танней — расказаць. Якія могуць быць таямніцы? Раз у маладога чалавека пачуцці, павінен усё зразумець і языком не будзе мянташыць, дзе не трэба.

— Напэўна, сама Надзя вам пра сваю хваробу ані гу-гу?

— Толькі адно: не прыходзіць да яе ні з якой нагоды ў непагадзь.

— Так-так. Добра. Вы рашучы малады чалавек, так таму і быць.

Я сабраўся слухаць.

— Мы прыехалі з іншага горада некалькі гадоў таму. Адкуль менавіта, вам мо ведаць і залішне. Я быў тамака няпростым чалавекам. Надзейка, мая любімая дачушка, задужа шанавала мастацтва. Карціна зверху — яе пэндзля. Яна заўсёды шукала крыніцы натхнення, як і ўсе мастакі. На мой бацькоўскі смутак, знайшла яго ў наркотыках. Я вельмі вінаваты, у свой час не дагледзеў, закруцілі справы, праца, а калі даведаўся, стала позна. Давялося радыкальна вырашаць праблему. Я парваў усе сувязі дачкі. Пасля перажылі доўгае лячэнне ў рэабілітацыйным цэнтры, пасяліліся ў новым месцы, каб пачаць новае жыццё. Маці, скажам так, у нас няма. Паверце, я не бачыў іншага выйсця.

Да пачутага я паставіўся з належным паразуменнем. Наркотыкі тлумачылі многае. Добры ўчынак для бацькі — дзеля дачкі перамяніць лад жыцця.

— Надзея скончыла мастацкую вучэльню. На кайф забылася, і здаецца, што ўсё благое згінула ў мінулым, але наплыла іншая бяда, — Артур Аляксандравіч павагаўся. — Насланнё. Або наступства ранейшага ўжывання цяжкіх наркотыкаў. Расплата за грэх. У Надзеі ўзніклі псіхічныя адхіленні. На тле дэпрэсіўнага разладу — падваенне асобы. Яна пачала бачыць сябе іншай, не той, кім яна ёсць на самой справе. Разумееце?

Я слухаў.

— Спачатку мне самому было дужа не па сабе. Раней я займаўся антыкварыятам, на ўзроўні звычайнага калекцыянера, але ведаю і мастацтва і культуру, разбіраюся ў гісторыі. Хоць я не эксперт у асобных пытаннях, аднак жа і не пяць капеек варты ў базарны дзень. Маёй памылкай было набываць гэты дом. Каб наперад ведаць, што нас чакае!.. Купляў па газетнай аб'яве. Спакусіў нізкі кошт, былы гаспадар прадаваў

за капейкі, бо жыў недзе ў Сібіры і сюды перабірацца лічыў марнатраўным, таму імкнуўся хутчэй пазбавіцца ад нечаканай спадчыны. Акрамя ж цэнніка, мяне спакусіла гісторыя дома. Гаспадар аказаўся з радаводам, ды такім, які за савецкім часам не рэкламавалі. Хаця я асабліва не ўнікаў у тонкасці. Не з простых сялян карані былога ўладальніка. За што сваім часам хоць і ацалеў, але ў Сібір саслалі. Задумаў я прыкласці намаганні і адрэстаўраваць набытак, вярнуць належны выгляд. Тое быў душэўны пакліч. Мастацтва дзеля душы, то трэба ж дзеля чагосьці жыць, правільна?

Я пацвердзіў.

— Дачушка праз інтэрнэт накапала ўсё, што тычыцца дома. Выявіла за мяжой далёкую радню былога ўладальніка, даведалася аднекуль вельмі жахлівую легенду з жыцця былых насельнікаў. Крывавую легенду, між іншым.

— Пра помсту падманутага мужа і праклён? Я чуў.

— Даю слова, што не ўсё чулі.

— Толькі пра лёсавызначальны стрэл з ружжа ў грудзі жанчыны, у сэрца. Ахвяра адразу не сканала, а ў нечалавечых пакутах вымавіла праклён, з-за якога гаспадар застаўся жыць і бадзяцца па зямлі навечна. І дом гэты нейкім чынам ажыў, набыў здольнасць паглынаць чалавечыя душы. От! На Стывена Кінга цягне.

Бацька Надзеі ледзь пасміхнуўся. Ці мо падалося ў паўзмроку штучнага святла?

— Тагачасны гаспадар практыкаваў алхімію. Ён наўмысна забіў жонку рытуальным спосабам, прынёс у ахвяру, каб ажывіць дом, уліць энергію жыцця ў сцены. Пасля лічыў сваё жытло адушаўлёным механізмам. Цела ж сужонкі муміфікаваў і ўтрымліваў ва ўласнай спачывальні цягам дваццаці гадоў. Ставіў эксперыменты, пакуль нехта не ўгледзеў і не данёс у паліцыю. Гаспадару суд прызначыў спачатку падарожжа на шыбеніцу, але вестка даляцела да імператара, і вышэйшым

наказам алхіміка адвезлі ў вар'ятню, дзе ён сам зрабіўся аб'ектам навуковых доследаў у галіне псіхіятрыі. Цела жонкі пахавалі ў зямлю, як належыць добрым хрысціянам. Родзічы гаспадара выракліся ад яго, дом прадаць не змаглі (хто пагодзіцца купіць пасля здарэння?), а гісторыя трапіла ў газеты. На двары тады ўжо панаваў 1895 год. Адметная рыса: гаспадар-алхімік, як сцвярджалі, быў мастаком. Да слова сказаць, жонка насамрэч здраджвала мужу. Вельмі не даспадобы ёй прыходзіліся алхімічныя эксперыменты. Вакол віруе свецкае жыццё, балі-маскарады, кавалеры, а тут помрак і цемрашальства. Жанчыну можна зразумець.

— Сапраўды ўражвае, — я хацеў падзякаваць за звесткі, але разумеў, што гэта яшчэ не канец.

— Пасля я і сам не ведаю з чаго ўсё пачалося. Надзея вельмі натхнілася паданнем дома. Вырашыла намаляваць эпізод, у якім абражаны гаспадар катуе жанчыну. Го! Натхнілася — няправільнае слова, Надзея літаральна захварэла ідэяй. Усё не магла ўявіць, як выглядала тая бедная жанчына, якім з твару быў муж-алхімік. Перавярнула архівы, звязвалася з нашчадкамі, усё ў пустую. Нават праз інтэрнэт адшукала згадкі пра жудаснае здарэнне ў газетах таго перыяду, бо трагедыя раз-пораз выплывала на старонкі прэсы яшчэ доўга, мо пакуль цара не скінулі. Але знайсці выяву галоўнага героя не выходзіла, і Надзея знайшла вас.

Артур Аляксандравіч зрабіў націск на апошнім слове.

— Надзя падсыпала вам у ежу і пітво лекі, якія сама ўжывае, гм, калі на вуліцы кепскае надвор'е.

Я адчуў занепакоенасць.

— Думаю, вас хацелі соннага прынесці ў ахвяру.

— Нават так? — усклікнуў я.

— Так. Добра, я своечасова вярнуўся з горада, і калі не здолеў адкрыць дзверы, адразу сцяміў, што нешта адбылося, пачаў ламаць. Пра вас і падумаць не мог, я ж не ведаў, што ў дачушкі амуры. Эх, мо варта ўсё

ж было забараніць інтэрнэт? Але ж, на жаль, сеціва ў вядомым сэнсе адзіны масток паміж Надзяй і светам.

— ?

— Паверце, малады чалавек, Надзея ўяўляе сабой пэўную небяспеку для вас. Разумею, я ўласным унушальным выглядам магу адпудзіць імавернага зяця, але ж самую галоўную пагрозу можа несці мая дачка.

— А калі я скажу, што закахаўся?

— Памагай Бог. Я не супраць.

Усталявалася працяглае маўчанне. Я лічыў удары свайго сэрца. На семдзесят восьмым бацька Надзеі працягнуў казань.

— От, як вы заўважылі, малады чалавек, далей пачынаецца Стывен Кінг. Да Надзеі стала прыходзіць тая жанчына, прынесеная ў ахвяру жонка.

Ён паглядзеў ва ўпор у мой твар.

— Пакрысе, паволі, на хвілiначку, а затым надоўга. Надзея раптам мяняла паводзіны. Звычайна вясёлая, абаяльная, ласкавая, усмешлівая, прыветная дзяўчынка, якую я помню з нараджэння, пачала на пэўны перыяд рабіцца напружанай, змрочнай, злавеснай істэрычкай, рабіцца другой, іншай. Нібыта хтосьці шчоўкае клапыжком бра. Хоп — і ўжо не Надзея, не мая дачушка, а нехта дурны і ў размове, і ў стылі паводзінаў, іншая асоба, зусім без прыемных манераў. Візглівая, некіруемая, цяжка падпарадкаваць. А пасля зноўку — шчоўк! — і перада мной Надзейка. Як ужо было зазначана, шчаўчкі клапыжка не хаатычныя, а падпарадкоўваюцца сістэме. Дачка страчвае адэкватнасць падчас кепскага надвор’я. Варта засвяціць сонейку — і перад вамі мілая Надзейка. Варта наплыць цьмяным хмарам — і ў абліччы дачушкі пасяляецца злавесная істота з помраку, яна сцвярджае, што жыла ў гэтым доме больш за сто гадоў таму, і заяўляе пра сваё жаданне адпомсціць мужу, які забіў яе ў 1875 годзе. Вось такая мая Надзейка. Непадрыхтаваны чалавек

можа і рады не даць. Таму калі напачатку я выстаўляў вас вон, па-першае, турбаваўся за вашае жыццё і здароўе.

Бадай, пасля пачутага варта папіць вады, аб чым я і паведаміў гаспадару. Артур Аляксандравіч прапанаваў заварыць кавы. Я ўжо даволі ачуняў ад лекаў, падсыпаных мне Надзеяй, і адчуваў звычайную сілу і моц. Здаецца, мне пашанцавала, у арганізм трапіла мала атрутных рэчываў і я не сканаў з-за перадозу. Мы падняліся на кухню. Мужчына патлумачыў, што Надзея праспіць да раніцы, ён зрабіў патрэбную ін'екцыю.

Пад каву бацька маёй сяброўкі працягваў расповед.

— У мяне захаваліся з мінулага жыцця добрыя сувязі. Я неадкладна завёз Надзею ў Навінкі. Дарэчы, там паляжаць сёння не лічаць заганай і здаровыя людзі, так бы мовіць, нервы падлячыць. Мы жывем у век стрэсаў і прыхаваных дэпрэсій, і ў добрых клініках існуюць нават чэргі з запісам на месяцы наперад. Надзея правяла там больш за чатыры тыдні. Урачы дыягназавалі шызафрэнію, выражаную ў падваенні асобы, навыпісвалі лекаў, надавалі рэкамендацый. Па сакрэце: у краіне мо ў паловы жыхароў псіхічныя адхіленні рознай ступені, калі ўсіх класці на стацыянар, дурдомаў не хопіць. Таму пакідаюць на пастаяннай аснове ў закрытых інтэрнатах толькі ўжо самых адмарожаных шызаў, каму ўжо наканавана, хто ўяўляе небяспеку грамадству. Прадбачу вашае пытанне наконт навязлівай ідэі помсты мужу. Я перакананы, што пад маім кантролем Надзечка не здзейсніць неахайны ўчынак. Пакуль яна са мною, я гарантую.

Я падумаў і згадзіўся. А які добры бацька пакіне дачку ў вар'ятні, каб кожны санітар лапаў яе за вабноты потнымі далонямі? Суразмоўца нібыта прачытаў мае думкі.

— Бачу, вы мяне разумееце. Гэта прыемна.

Ува мне ўзнікла думка паспрабаваць пазбавіць Надзею крыніцы яе навязлівага стану — перасяліць у іншы дом.

— Спрабаваў, жылі ўжо на кватэры цягам года. Нічога не атрымалася, — з горыччу засведчыў бацька. — Яе неадольна цягне сюды, яна збягае, адмаўляецца ад ежы, не хоча размаўляць нават у яснае надвор'е. Хоць ты бі ў лапаць, нічога не дапамагае. Да таго ж, амаль містыка, пакупнікоў няма, каб палац прадаць. Заклятае месца. Бракуе ахвотнікаў набыць дом, разы з чатыры аб'явы рассылаў, з рыэлтарскімі канторамі звязваўся. Той-сёй прыпрэцца, паглядзіць — і лататы. Ніхто не хоча.

Усталявалася напружаная атмасфера. Каб яе разрадзіць, Артур Аляксандравіч зазначыў:

— Калі не заўважаць забабоны і іншае, то тут шыкоўнае месца, з прыгожымі краявідамі, тут утульна. Увогуле мне тут падабаецца. Каб не хвароба дачкі, жыў бы шчаслівым.

Ён зрабіў паўзу.

— Дык што вы цяпер скажаце, малады чалавек?

Я дапіў каву і падзякаваў.

— Прызнацца, я не аматар спыняцца на палове кроку.

— Даводзіце справы да завяршэння? Ухваляю.

— Я амаль гатовы і сёння прасіць рукі і сэрца Надзеі, нягледзячы на тое, што сам ледзь не стаў ахвярай.

Я прызнаваўся шчыра і ад душы. За паўгода нашага ліставання ў сеціве я прасякнуўся пачуццямі, душой амаль прыляпіўся да сяброўкі. Мо нічога і не здарылася б, каб загадзя ведаў пра немач. Відавочна, Надзея таксама думала пра мяне як пра абранніка. І не хацела прыносіць мяне ў ахвяру. Іначай не стала б яна пісаць да мяне ліст-папярэджанне, у якім прасіла ні пры якіх абставінах не прыходзіць, нават пазбавіцца ад думак завітаць у госці, калі на вуліцы непагадзь. Яна папярэджвала, што ў дажджлівую пахмурную пару робіцца іншай, небяспечнай. Яна добра ўсведамляе ўласнае

становішча, а значыць, існуе шанец на вылечванне і ўратаванне. Шанец павінен быць, аб чым я неадкладна ўголас заявіў.

— Вы рашуча настроены, малады чалавек. Я ўражаны. Аднак і вы зразумейце мяне правільна.

— А я і разумею, — перабіў я суразмоўцу. — Трэба шукаць спосаб вылечыць вашу дачку.

— Ёсць ідэі?

Не разважаючы, я выпаліў тое, што ляжала на сэрцы ўвесь час пасля абуджэння ў фатэлі:

— Хваробы душы надзейна лекуе толькі Творца душаў.

— Вы верыце ў Бога?

— А вы — не?

Мужчына скептычна скрывіўся.

— Артур Аляксандравіч, а што перад намі, як не апантанасць? Надзейцы патрэбны экзарцыст.

— Чорнае натхненне, — адазваўся ён нарэшце. — Мастаку, творцу патрэбна крыніца натхнення, без гэтага бадай аніяк. Вось дачка і знайшла крыніцу ў паданні з гісторыі дома. Выпіла забруджанай вады, пакаштавала забароненых пладоў і наталілася чорным натхненнем, на ніве чаго і стварыла карціну-шэдэўр, адлюстраванне, адбітак жахаў далёкай мінуўшчыны.

Ён ляснуў далонню па стале.

— На дом пакупніка не знайсці, а карціну ўжо могуць адарваць з рукамі. Дзеля цікавасці фотаздымак выставіў у інтэрнэце, і дня не мінула, як прапанавалі добрыя грошы, — ён пахітаў галавой.

— Маеце рацыю ў тэрмінавызначэнні, Артур Аляксандравіч. Я — музыка, таксама творца, і скажу вам наступнае. Ведаеце, як паміж сабой часам выканаўцы блэк-метал мянуюць сваю музыку? Чорным блюзам. Вельмі сугучна з чорным натхненнем. Толькі адэпты блэку натхняюцца рознымі формамі сатанізму, а нашая Надзейка натхняецца старажытнымі паданнямі,

якія ўзніклі на глебе алхімічных містэрый. То вы ўжо паверце мне як спецыялісту: у абодвух прыкладах сапраўдная крыніца натхнення хаваецца ў глыбінях апраметнай, прама ў пекле, зусім не ў небе. Хвароба Надзеі ў гэтым святле выглядае наступствам не ўжывання наркотыкаў, а кантакту з замагіллем. Падобныя кантакты забаронены Богам. Недзе дзяўчынка ўлезла ў забароненае, і яе знарок засмактала ў твань.

— Вушам не веру, і вы з блэк-рокераў?

— Я з былых. Цяпер спяваю ў праваслаўным хоры.

У цішыні гадзіннік прабіў на ўвесь дом дзевяць вечара. Час ляцеў неўпрыкмет.

Бацька Надзі прапанаваў выклікаць таксі, я не пярэчыў. Развіталіся па-сяброўску. Я пранікся павагай.

— Паверце, калі крыніца чорнага натхнення ў пекле, то ўратаваць, вызваліць Надзю можа толькі Той, Хто на нябёсах. Толькі сіла Збавіцеля Госпада Ісуса Хрыста здольная разарваць кайданы памраку, вярнуць чалавека на святло.

Я ўздыхнуў напрыканцы. Ужо мне гэта было добра вядомым.

Артур Аляксандравіч пацісну́ў маю руку і па-бацькоўску ўсміхнуўся.

***

Пасталеўшы, я перастаў баяцца масак і больш не ўспамінаў старэйшую сястру, што так любіла пужаць мяне маскай людажэрнай Бабы-Ягі. Прынамсі, маскі носяць усе дарослыя. Маскі бываюць розныя: для жонкі, мужа, сям'і, падатковага інспектара, міліцыянта, выбарчай акругі, калег па рабоце. У каго адна маска на ўсё жыццё, а хто мяняе іх па сто на дню. А што ж там пад маскай? Пакажыце твар!..

І вось сёння я зноўку сутыкнуўся з жахам з уласнага дзяцінства і прыгадаў сястру. Зараз я збіраўся высветліць важную рэч (о, справа гонару!): якая з дзвюх асобаў

была сапраўднай. Усё ж Надзея супраць уласнага жадання насоўвала маску Багіры, калі псавалася надвор'е, або Багіра апраналася ў Надзею, калі ліставалася са мной у сеціве? Без штучных твараў, бадай, толькі дзеці, таму іх і ёсць Царства Нябеснае. Дзеці не носяць масак.

Адшукаць адказы я спадзяваўся ў дзённіку Надзеі, які знайшоў паміж папер у спальні, калі аглядаў уразіўшую мяне карціну. Невялікую памерамі кніжачку-нататнік я ўпотай паклаў у прасторную кішэню джынсаў.

Яны нешта ведалі, чагосьці мне не дасказалі, Надзея і яе бацька. А я меў намер разабрацца. Першая старонка дзённіка пачыналася са слоў "чорнае натхненне і як яго дасягнуць". Менавіта тут усе адказы і прычыны немачы маёй каханай. Я хацеў, каб Надзея вылечылася. Але ж варта ведаць, з чаго гэта пачалося, у якую бездань зазірнула недасведчаная душа. Даведацца асцярожна, каб выпадковым чынам не зазірнуць туды і самому.

Аднак дзённік можна і не чытаць, каб з упэўненасцю паўтарыцца: душэўныя хваробы лекуе толькі Творца душаў, Валадар Сусвету, Спрадвечны Бог.

Што ж, здані мінулых жахаў, прывіды знявечаных лёсаў калі-некалі прарываюцца да нас скрозь таўшчыню часу. І тады мы сутыкаемся з тым, што проста так не растлумачыць.

Усе яны сведчаць, нагадваюць няўмольнае — вечнасць блізка.

Яна сярод нас...

# БЛУКАЧ

Дзядзька Хведар менаваў ровар лісапетам і дадаваў-тлумачыў следам: “Па-навуковаму — віласапет”, чым вельмі весяліў Тамаша, наваспечанага суседа. Тамаш на свой лад намагаўся выправіць маўленне дзядзькі Хведара, але ўпустую, бо, вядома, на вёсцы — свая мова, не тая, што ў горадзе, а ў Жальніцы дык і пагатоў існаваў уласны дыялект. Увогуле ўся Жальніца была асаблівай, рыхтык тут іншы народ жыў, са сваім забабоннем і паданнямі.

Тамашу ўлетку стукнула дваццаць сем, і з той нагоды халасцяк набыў за капейкі ў Жальніцы лецішча, бо “ўсё жыццё накапляў”. З дзядзькам Хведарам пасябравалі з першага дня, калі толькі Тамаш пачаў даводзіць набытак да “прыстойнага стану”. Старой хацінцы патрабаваўся добры рамонт: дзе падбіць, дзе падфарбаваць, падладаваць. Дзядзька Хведар адразу па-бацькоўску паставіўся да Тамаша, дапамагаў, выдатнага суседа паслаў Бог! Пасля дваццацівасьмідзённага адпачынку Тамаш вярнуўся ў горад, унурыўся з галавой у газетную працу, шчыраваў у раёнцы, але па выходных наведваўся ў сваю хацінку ў Жальніцы, бо свет не надта далёкі — кіламетраў з дваццаць ад горада.

Навіна пра прыезд археалагічнай экспедыцыі ды раскопкі ўсяго ў некалькіх кіламетрах ад лецішча ўзрушыла Тамаша, і ён зазбіраўся ў камандзіроўку,

праўдамі-няпраўдамі вымантачыў з рэдактара дазвол затрымацца на некалькі дзён. “Шчыра паміж намі: каб і па гаспадарцы на лецішчы дарабіць недаробленае за водпуск”, — патлумачыў. Заўжды строгі рэдактар дбайна завярнуў дулю (“А хто пісаць будзе?”), але Тамаш паставіў на стол трохлітровік вясковых пачастункаў “ад дзядзькі Хведара і цёткі Машы”. Газетны начальнік падумаў, узважыў, дастаў з трохлітровіка гурок, захрумсцеў з асалодай і несхаць мовіў “добра”. І ў сваёй традыцыі нагрувасціў зверху заданнем. “Бракуе краязнаўчых матэрыялаў. Разнюхай новенькае, незацяганае і напішы!” — дабраславіў шэф, і Тамаш хуценька ногі ў рукі, пакуль рэдактар не перадумаў, што гэтаксама было ў традыцыі.

У зямельцы беларускай багата археалагічных помнікаў і размаітых артэфактаў-выкапняў. Ды закон праканетны даецца ў знакі — збяруцца навукоўцы са студэнтамі раскопкі ладзіць, як амаль адразу непагадзь на тыдзень. І тут не выключэнне. Дождж сцябаў у твар, калі Тамаш саскочыў з прыступак аўтобуса і паклыпаў да лецішча мясіць чаравікамі бруд. Вырашыў адразу: надвор’е не перашкода, тым болей сярод археолагаў даўні сябар-гісторык, з якім працяглы час не бачыліся.

На просьбу пазычыць ровар на пару дзён дзядзька Хведар згадзіўся без праблем, не пярэчыў, толькі параіў рухацца сцярожка, бо дзе-нідзе дужа слізка.

Калі на кароткі час з неба спыніла ліць, Тамаш выкаціўся з вёскі і пастырнаваў прытаптанай сцежкай праз лес. Ехаў даволі хутка насуперак дзядзькавай парадзе. Часам спыняў хаду, пехатой абмінаў паваленыя дрэвы. Напаткаў старадаўнія могілкі, каменныя жорны выпіралі з купін, затым перасек леснікоўскую дзялянку. Карцела дацямна дабрацца. Шпарка круціў педалі, нарываўся на галлё і трэскі, часам з такой моцай, ажно падкідвала колы. Тое і сыграла злы жарт. Шкада, не прыслухаўся да парадаў добрага дзядзькі.

Ровар наляцеў колам на перашкоду. Падкінула ўверх, штурханула, Тамаш на імгненне страціў кантроль. Стырно вырвала з рук, заслізгацела пад шынамі, павольна, рыхтык у замаруджанай кінастужцы, "лісапет" пачаў завальвацца на бок. Бліснула адчайная думка: "Капец!" — і Тамаш паляцеў кулём. На бяду сцежка змяілася ўзбоч дзялянкі, дзе днямі плённа адпрацавалі леснікі. Неверагодным злучэннем абставін Тамаш з размаху ўлупіўся лбом у невялікі, але ўсё ж цвёрды пень. Зазвінеў свет, зайграла музыка...

Дождж валіў сабе. "Струмені дажджу рыхтык металёвыя струны", — выплыла на памяць празаічная паэтыка Бёля, Тамаш расплюшчыў вочы. На пні сядзела жаба і з цікавасцю разглядала Тамаша.

— Ты хто? — спытала квакля.

"Божа, я здурнеў", — вырашыў хлопец і паварухнуўся. Рукі-ногі, здаецца, ацалелі, але па целе разлілася нечаканая слабасць. Відаць, добра ўперыўся лабэшнікам. "Б'юць чалом, як пісалі ў летапісах", — і Тамашу зараз жа ўспомнілася, чаму ён мусіў перціся праз непагадзь у лес да археолагаў. Увушшу крыху гуло, лёгкая кантузія. Ён страсянуў галавой. Шчымеў лоб, торгала пад скурай.

— Мяне завуць Тамаш Ян, — падказала памяць.

Жаба вытарашчылася і быццам з паразуменнем паставілася да пачутага.

— А ты і насамрэч здурнеў. Падумаць толькі: размаўляеш з жабай, — здзекавалася квакля.

Яна з'едліва бліснула правым вокам і спрытна скочыла з пня. Здаровая, з ёмісты кулак, брыдкая да ванітаў.

Тамаш прыўзняўся на карачкі, ізноўку страсянуў галавой, каб прагнаць мароку, тады падняўся ўвесь. Хацелася злякана перажагнацца. Жаба хутка знікла, быццам і не было, і Тамаш вырашыў, што бачыў здань, наплылую пасля пацалунку з пнём. Ён абтрусіў з адзення

бруд з ігліцай, сплюнуў нешта ёлкае і колкае. Ледзь соўгала ў бакі.

Крыху панявечаны ровар ляжаў побач. Стырно можна было параўняць, а вось пярэдняе кола патрабавала замены: перакрывіла абод, не хапала спіцаў. І як цяперака ехаць? Дый назад вяртацца няёмка, сорамна перад дзядзькам Хведарам. Скажа: “З’еў лісапет сухім ротам”.

Тамаш учапіўся за стырно і так-сяк пакаціў ровар павольнай хадой, ледзь узняўшы пярэдняе кола, — нязручна! Куртка з джынсамі змакрэлі, дый не бяда, хутка высушыцца ля вогнішча ў археолагаў. Прызнацца, тутэйшыя сцежкі Тамашу не знаёмыя, рушыў так, як папярэдне тлумачыў па тэлефоне сябрук.

Сутонела ў лесе хутка, прыцемкі неўзабаве накрылі наваколле. Тамаш меркаваў па разліках праз якіх трыццаць-сорак хвіль ужо дашкандыбаць. Наважыўся зазваніць, але сувязь не працавала, словамі Хведара — “не лавіла антэну”. Ён сплюнуў і ўпарта пакрочыў. Сцежка закружляла, але раптам вывела да паляны, сярод якой месцілася драўляная спаруда. Пра гэтае месца сябрук не згадваў, калі тлумачыў шлях. “Заблукаў”, — вырашыў Тамаш. Ён павярнуў назад. Каб шыбаваць спрытней, усклаў ровар рамай на плячо. Абмінуў могілкі, дабраўся да знаёмай дзялянкі. Але толькі ўпэўніўся, што нідзе не мог збіцца са сцежкі. Задуменна пашкрэб патыліцу. Было не да смеху. З-за дажджу пахаладнела. Тамаш патупаў ізноў, было мулка плечуку.

Тамаш успамінаў тлумачэнні сябра. Дзялянка, затым старадаўнія могілкі, пасля колькі часу праз лясок — і заўважыш кастрышча і чырвона-белыя намёты. Во скулля табе, а не намёты. Сцежка ўпарта выводзіла да драўлянай спаруды на паляне. Спаруда выглядала спраўнай. Прыземістая ды раскінутая ўшыркі, не як звычайныя хаты. Дах “пірамідкай”, ча-

тырохскатны. Дзіва. Тамаш разглядзеў у пomraку комін, патыхнула дымам і смажанінай. “Мо леснічоўка ці дом паляўнічага”, — мільганула здагадка. Зафыркаў конь у стаенніку па-за будовай. “Нішто сабе гаспадарка”, — Тамаш здзіўлена павагаўся і вырашыў завітаць і ўдакладніць, у які бок ісці да ўрочышча Чорны Смык, дзе атабарыліся археолагі: тутэйшыя павінны ведаць. Ён зрабіў колькі крокаў.

“Но, пайшла, халера”, — прагучала дзесьці наперадзе. Тамаш знерухомеў і ўчапіўся ў ровар. З-за хаты выехаў вершнік, вусаты мужык кіжлаватага выгляду ў зацухмоленым рыззі. Навідавоку на падпітку, ледзь сядзеў на рабрыстай кабыле і трымаў лейцы, на разявіўшага рот Тамаша не звярнуў увагі. “Но, пайшла, воўчае мяса”, — вершнік вылаяўся, памянуў нячыстую сілу, і кабылка патрушляла з вялікай неахвотай. Тамаш доўга глядзеў услед, не заўважыў, калі перастала зверху ліць. У пэўным ачмурэнні прасунуўся бліжэй. Вочы выхапілі вялікую шыльду “Халодныя ногі. Кубоўнік пана Шмуйлы”.

“Аграсядзіба, — зрабіў канчатковую выснову Тамаш. — Так, няйначай аграсядзіба, і займаюцца тут няйначай агратурызмам”. Падумаў, што неахайны дзядзька-вершнік не вельмі нагадваў агратурыста.

Тамаш пакінуў ровар перад ганкам, прытуліў да сцяны — халера не возьме — і баязліва пагрукаў калтычком у масіўныя драўляныя дзверы.

***

...Уздоўж сцен стаялі шырокія лавы. Ладна збітыя драўляныя сталы туліліся па кутах. Сядзелі ў паўзмроку два чалавекі, елі і пілі. Тамаш адразу заўважыў незвычайныя строі прысутных, быццам з кніжкі пра старадаўнія часы. Наведнікі карчмы зіркнулі на прыхадня. Адзін быў у святарскім адзенні, на грудзях блішчэў крыж.

“Калі ласка, запрашайма ў кубоўнік пана Шмуйлы”, — з характэрным акцэнтам мовіў маляўнічы мажны дзядзечка з пэйсамі, магутным шнобелем і вуснамі-ладкамі. Ён, відаць, і быў пан Шмуйла. Тамаш падумаў пра ролевыя гульні людзей, чый дах паехаў на ніве гістарычных рэканструкцый.

Гаспадар выцер далоні аб фартух і пытальна вытарашчыўся на госця.

“Сёння ў нас паесці і выпіць удосталь”, — прарыпеў затым пан Шмуйла і запрасіў Тамаша прысесці непадалёк ад кампаніі.

Тамаш з грукатам адсунуў лаву і ўладкаваўся.

Пакуль гаспадар варушыў чапялой у прыску і варочаў саганы, Тамаш з цікавасцю акінуў поглядам памяшканне і прысутных. Ладзіць аграсядзібы не таннае захапленне, усё ж у капеечку ўлятае. Але існуюць адмыслоўцы, якія пераўтвараюць сялянскія падворкі ў выспы старадаўняй культуры. Тамашу даводзілася бываць у стылізаваных “старажытных” дамках, дзе побач з кроснамі і ручнікамі на абразах суседнічалі плазменныя тэлевізары памерам з палову сцяны і ноўтбукі на сталах. У так званай карчме-“кубоўніку” гэтаксама праглядалася стылізацыя. Простыя драўляныя сцены, драўляная падлога. Праўда, было чыста. У зеўры вялікай печы штосьці шкварылася і свіршчэла, напаўняла прастору апетытным водарам. Пан Шмуйла папраўдзе перагуляў у гісторыю: ні плазмы, ні сродкаў сувязі Тамаш не заўважыў, роўна як ніякага намёку на электрычныя правады і разеткі. Пакой асвятляўся полымем з печы, ды пасярэдзіне са столі звісала драўлянае кола сялянскага вазка, паверх якога капцелі свечкі.

Тамаш разглядзеў прысутных. Мужчына ў святарскім строі меў прыязны тыпова славянскі твар з дагледжанай напаўсівой барадой. А вось прыяцель бацюшкі чамусь адразу навеяў персанажа з “Дзікага палявання”: кароткія вусікі, круглыя акуляры, кепачка-

блінец у клетку, акуратна складзеныя ружовыя вусенкі блішчэлі з-за гарачага тлушчу. Тамаш адразу ахрысціў незнаёмца лялечным чалавечкам. Лялечны мужчына калупаўся ў місе са смажанінай, але прыпыніў занятак пад Тамашовым позіркам.

“Боже, царя храні!” — грымнула з Тамашовай кішэні. Бацюшка перажагнаўся, з далоні лялечнага чалавечка выслізнуў відэлец. Тамаш дастаў з кішэні мабільнік і выключыў мелодыю. Мінулай суботай парыўся ў лазні дзядзькі Хведара, той, як дзіця, гуляўся са смартфонам, вучыўся будзільнік ставіць. Вось і выставіў на чатыры дні наперад, дый песеньку падабраў, гора-патрыёт. Тамаш панаракаў сам сабе, вярнуў рэч у кішэню.

— Сядай з намі, хлопча, — запрасіў бацюшка, і Тамаш падзівіўся глыбокаму святарскаму басу.

— Калі не грэбуеце, — амаль прабляяў лялечны чалавек.

Тамаш не вымушаў сябе ўгаворваць, перасеў куды запрасілі. З кампаніяй весялей. Заадно можна і дарогу распытаць да месца з дзіўнай назвай Чорны Смык. Хіба ж добрыя людцы адмовяць?

У хатцы, стылізаванай пад старажытную, было ўтульна. Тамаш, калі набываў лецішча, і сам раз-пораз падумваў стварыць у ім “нешта нейкае”, наколькі грошай хопіць. І зараз нават узрадавала, узрушыла, што побач маецца аграсядзіба з цікавымі гаспадарамі, будзе дзе досвед пераймаць ды чаму навучыцца. З той нагоды знаёмства з прысутнымі Тамаш не цураўся і назваў сваё імя з прозвішчам.

— Айцец Аляксандр, — сваёй чаргой ветліва прадставіўся бацюшка.

— Пан Грыб, павятовы ўрач, — прыўзняўся з лавы лялечны мужчына.

На стале ўжо стаялі місы з ежай ды экзатычнага выгляду кубкі з пітвом. Пан Шмуйла адазваўся каля печы ды хутка сабраў тое-сёе, паставіў перад Тамашам.

— Апошняе даядаем, — нібыта з роспаччу ўздыхнуў бацюшка.

— Дык зразумела, эканамічны крызіс у краіне, нікому не стае сродкаў, — мовіў Тамаш і дадаў: — Нават ва ўсім свеце праблемы ў гэтым плане, каму ж невядома?

Пан Грыб пераглянуўся з бацюшкам.

— Скажы мне, пан Тамаш, а што за музыка ў цябе дзіўная?

— Гэта? — Тамаш дастаў тэлефон і пакруціў у далоні. — Дый панапіхаў усякага-ўсялякага на рабоце, сам яшчэ не слухаў.

Пан Грыб з цікавасцю ўтаропіўся ў слухаўку.

— Дзіўная скрыначка, — зачаравана мовіў павятовы ўрач.

Тамаш скептычна схмыліў вусны.

— Вы быццам смартфона ані разу не бачылі.

У адрозненне ад лялечнага чалавечка, айцец Аляксандр здзіўлення ніякага не выказваў, але набыў тварам насцярожаны выгляд.

— І гэтая музычная скарбонка грае песні? — пацікавіўся святар.

Замест адказу Тамаш запусціў “Короля и шута”. Пакой карчмы напоўнілі гукі песні, у якой мужыкі елі мяса, запівалі півам і не разумелі конюха.

Пан Шмуйла паставіў перад Тамашам яшчэ місу з чымсьці духмяным і сеў супраць, не міргаў.

— Тэхнічны прагрэс, шаноўнае панства, вось ён — век рэвалюцыі ў дзеянні, — выдыхнуў лялечны мужчына, якому прозвішча Грыб зусім не пасавала.

Тамаш выключыў песню.

— А вы ўражваеце, шаноўныя. Упершыню бачу, каб так глыбока рэканструявалі мінуўшчыну, — ён ляснуў далонню па стале. — Хоць кіно здымай!

Пан Шмуйла падпёр рукамі галаву і разважліва перапытаў:

— Пан Тамаш мае на ўвазе сінематограф?

— Моднае слоўка, — уставіў пан Грыб.

— Не трэба, у нас свайго тэатру ўдосталь, — мовіў гаспадар карчмы і з выразам сусветнага смутку на твары дужа ўжо гаротна падкрэсліў: — Аж няма дзе схавацца.

— А можна даведацца, дзе вынаходзяць падобныя музычныя скарбоначкі? — папытаў лялечны чалавек.

— У Японіі, на Тайвані, шмат дзе, вядомая справа, — растлумачыў Тамаш і накаціла нешта, не стрымаў пачуццяў: — Ды хіба вы не ведаеце, людцы мае? Сорамна, дарослыя мужчыны, а ў нейкую дурасць гулі пачалі. Зразумела, у вас дакладны закос пад старадаўняе, але відавочна з фанатызмам. Хопіць ужо, я дастаткова ўражаны і спяшаюся запэўніць шаноўнае спадарства: падобнага ў жыцці не сустракаў. Няма гаворкі, тутака ў вас жывы музей. Знадворку мужык у адзенні парабка верхам на кані гойсае, ці, лепей сказаць, трушляе, конік той нейкі звятохлы ўжо дужа, у чым там душа трымаецца? Назва карчмы "Халодныя ногі" вельмі пасуе, калі ўлічыць наяўнасць могілак непадалёк. А гэтыя драўляныя сцены, гатаванне ежы ў печы, вашыя строі — усё нібыта з кінахронікі пачатку дваццатага стагоддзя. Людцы мае, я вас запэўніваю: нідзе на Беларусі нямашака нічога падобнага. Вас рэкламаваць трэба, турыстаў вадзіць і драць з іх па тры скуры. Тое, што вы "Короля и шута" ніколі не чулі, я паверу, хай сабе, але тое, што вы быццам смартфона ні разу не бачылі, — прабачце, гэта цераз край. Ролі рэпетуеце, здымаецца кіно, так?

Тамаша слухалі і не перабівалі, прамова скончылася паўзай, пасля якой адазваўся першым бацюшка:

— Ты тут чужынец, хлопча. Выбачай, не са зла кажу. Проста сведчу: ты не наш.

Ён стрэльнуў вачамі на госця.

— Прабачце, мяне апанавала абурэнне, — Тамаш супакоіўся, — дык тое з уражанняў, бо падобную аўтэн-

тыку, як у вас, я насамрэч упершыню бачу. Гэтыя місы, стравы, кубкі...

— Не, справа ў іншым, — запярэчыў айцец Аляксандр.

Тамаш пытальна ўзняў бровы. Бацюшка па-хрысціянску шкадаваў за словы, якія мусіў сказаць.

— Схавай свой рыштунак ад вачэй падалей, пан Тамаш, — параіў гаспадар карчмы. — Час зараз непрадказальны, а за песеньку пра цара могуць і...

Ён выразна чыркнуў пальцамі па шыі.

— Небяспечна ў нас, — патлумачыў пан Грыб. — Злодзеі шастаюць размаітыя, бандыты.

— А, вось вы пра што, — здагадаўся Тамаш.

— Распавядзі лепей, куды кіруеш, добры моладзец? — змяніў тэму гутаркі бацюшка, затым напяў на відэлец скварчыну, адкусіў, прыняўся малоць.

— Па шчырасці, збіўся са шляху, — прызнаўся Тамаш. — А шыбую да месца з назвай Чорны Смык. Справа ў мяне там.

Бацюшка заперхаў. Пан Грыб выразна глянуў на айца, а Шмуйла запытаў, якая справа.

— Сяброў павінен напаткаць.

Прысутныя разам змоўклі і насупіліся. Тамаш чакаў. Пан Грыб крадком употай паглядаў на госця.

— На хутары Чорны Смык з сённяшняга дня кіруюць чырвоныя, тамака ўсталявалася савецкая ўласць, новая ўлада, халера яе бяры, — з горыччу растлумачыў Шмуйла, не вытрымаўшы доўгай паўзы. — Заўтра будуць і ў нас. І бегчы няма куды, так абярнулася. Асабліва лютуе камісар Рабаконь, як кажуць. Эх...

Столькі непадробнай скрухі набрыняла ў Шмуйлавым “эх”, але ён з патаемнай надзеяй дадаў:

— А мо абмінуць вытлукі гэтае месца?

— Пачакайце, а Чорны Смык хіба хутар? — на “ўласць” і астатняе Тамаш не адрэагаваў.

— Спракавету, — пацвердзіў бацюшка.

Тамаш пашкрэб патыліцу.

— Не супадае штось.

Ён зусім забыўся пра падзенне на дзялянцы, і за апошні час на ілбе вылез гузак, які раптам адазваўся і заторгаў болем. Тамаш паморшчыўся.

— Там зараз павінен быць лагер археолагаў, — засведчыў ён. — Раскопкі мяркуюцца.

— Не ведаю пра архе... арха... хай сабе там, але Саветы тамака ўжо дакладна, — запярэчыў пан Шмуйла, — і з песенькай "Божа, цара храні" вам, паночку, лепей не паказвацца, бо грабуць усіх.

Гаспадар карчмы гаротна развёў рукамі.

— Чаму так мала народу сёння? Разбегліся, што вошы, паўцякалі. Мы тутака на водшыбе, але і нам пудліва: у чырвоных доўгія рукі, заўтра мусяць атабарыцца і тут. Зладуюць з карчмы якісь дом саветаў, а нас да сценкі. — Ён уздыхнуў. — Мы тут людзі адзінокія, лёс такі, нам то і ўцякаць нехцам, а па-другое, тут блізкія пахаваныя. Вось сабраліся сёння, мо ў апошні раз. Далібог!

— Ну вы і артысты, — толькі і мовіў Тамаш, калі напрыканцы пранікнёнай прамовы пан Шмуйла ўсхліпнуў.

— Карацей, зробім наступным чынам, — вырашыў бацюшка. — Ноч на дварэ, куды табе сунуцца праз непагадзь, хлопча, начуйма з намі, у цеплыні каля печы. А на досвітку, пакуль Рабаконь не наехаў, Шмуйла, пан Грыб, а мо і я пакажам табе напрамак на Чорны Смык, ідзі сабе. Глянеш сам, ці сябры табе цяперашнія тамтэйшыя насельнікі. Паразумеемся на тым?

Тамаш быў згодны. Насамрэч з місы ды з патэльні смачна пахла. У хаце было цёпла, а за сценамі зноў узяўся лівень, шамацеў і шапацеў сабе з натуральнай прыроднай моцай.

— Шмуйла, ты дарэмна не ясі смажаніну, — дакорліва папікнуў бацюшка. — Мо апошні вечар у жыцці.

— Не, нашчадкі Аўраама свінню не ядуць, — аднекваўся шынкар.

Тамаш папрасіў гарбаты, і пан Шмуйла прынёс травянога ўзвару. Тамаш уздыхнуў і не запярэчыў, тым болей гарачы ўзвар меў прыемную пахкасць.

Калі знадворку ўперыла бліскавіца ды грымаценнем страсянула хату, усе, акрамя Шмуйлы, перажагналіся, а пан Шмуйла войкнуў. У дзіўнай для Тамаша атмасферы выспела гутарка. Запраўляў усім бацюшка, наракаў, што свет змяніўся і ўжо ніколі не стане, якім быў, што ўсё ідзе пад адхон, да Армагедону. Тады гутарка міжволі паплыла пра хутар Чорны Смык. Тамаш скінуў сонную замарач і з цікавасцю наструніў слых. Тым больш мабільная сувязь адсутнічала, праверыў крадком, а за вакном узялася нежартоўная навальніца. Ды бацюшка, як далей высветлілася, аказаўся захаплялльным апавядальшчыкам. “Хлопцы мусяць пачакаць, дайду ўжо раніцай”, — вырашыў Тамаш.

— Адкуль пайшла назва Чорны Смык, паспалітыя людзі ўжо не памятаюць, — гудзеў бацюшка. — Жыў на хутары адмысловы майстра скрыпак Фіма Ліберман, празваны тамтэйшымі насельнікамі д’яблавым музыкам. Чаму? Граў на ўласнавырабленых інструментах з хуткасцю лесапілкі. Ды як зайграе, бабы ў плясы кідаюцца, у шляхотных паненак ногі самі ў скокі — не суняць. Я ж у той момант малады быў, толькі з семінарыі, — тут айцец Аляксандр перажагнаўся. — І атрымаў у Жальніцы прыход. Зразумела, пазнаёміўся з Фімам. Свярбела падштурхнуць скрыпічнага майстра бліжэй на шлях да ісцінай веры. У Фімы жонка была — вачэй не адвесці, прыгажуня з прыгажунь, светлая, блакітнавокая, ва ўсёй акрузе ніводная кабеціна ў параўнанне не ішла. Зразумела, жанчына не габрэйскага кораня, і звалі Альжбэтай ці, карацей, — Бэтай, Бэацькай. Нехрышчонай яна была, а як пабраліся з Фімам — невядома, дакладна не ў святой царкве. Чуткі нібы ў тумане

плылі: Фімава абранніца з нячыстай сілай на кароткай назе, у поўню па лясах швэндаецца, зёлкі збірае, намовы шэпча. Той не дзіва, Бэацька — паляшучка, аднекуль з-пад Гомля. А на Палессі спракавету ледзь не кожная баба варажбітка. Так яно ці не, але Госпад не дабраславіў іхні звяз дзецьмі. Хоць трэсні. І якім чынам паляшучка з яўрэем маглі сысціся? Відаць, нячыстая справа.

Бацюшка перапыніў дых і каўтнуў з кубка, выцер бараду.

— Любоўная ліхаманка, — з выглядам знаўцы ўставіў пан Грыб.

— Няйначай, — згадзіўся бацюшка. — Прыблудныя яны былі, нетутэйшыя, аднекуль са свету. Хутароўцы ды насельнікі Жальніцы адзін другога ведаюць і шлюб бяруць са сваімі. А скуль той Фіма прыплыў з Бэацькай — адно Богу вядома. А Фіма на скрыпачцы піліў: "Цілі-цілі, скрыпачка, ляціць баба з прыпечка..." — як сёння помніцца. Аднак я пра іншае. Не даў Бог ім дзетак. Як ні намагаўся Фіма абзавесціся нашчадкамі — не змог, нават да мяне завітваў параіцца, ці можна нехрышчонаму габрэю свечку ў храме паставіць.

Пан Шмуйла не паверыў, але прамаўчаў, не перабіваў.

— Вельмі пакутаваў з-за бяздзетнасці, але, як потым высветлілася, мужчына ён быў здаровы, Альжбэта не магла дзетак мець. Гараваў-гараваў Фіма ды пачаў заляцацца да Веркі, удавіцы. Засцярог Фіма не слухаў, заклікі ўтаймавацца ляцелі міма вуха. Ведзьма ягоная, дармо што вочы блакітныя, плявала атрутай. Калі ж я выправіўся з Веркай пагутарыць, тая адшыла і ледзь не абразіла мяне, бацюшку. Мовіла: "Я ж удавіца, мужа Бог забраў, палез панскі лес красці, войты знарок хрыбет перашыблі, дык што зараз — без мужняй ласкі векаваць? А я ж кабета спраўная, мой чамадан — каму хачу, таму і дам!" Ну і вылезла Верцы бокам. І не толькі ёй, а ўсім траім. Невядома, у які час Бэацька праведала

пра мужаву здраду, мо падказаў хто. Мажліва, калі ў Веркі пачаў расці жывот ды пагалоскі пайшлі пра Фіму. Ветрам жа, вядома, не надзьмула. Бэата тры дні і ночы правяла ў лесе ў толькі вядомых ёй мясцінах, і чым тады займалася, не ведаў аніхто. Выпетрыла ўшчэнт, не раўнуючы смалу вазіла ў пекле, вочы страцілі бляск, валасы — хвалістасць, цела — вабнасць. Нагадвала нябожчыка бляклым тварам. Як сцвярджаў потым Фіма, жонка мовіла толькі адзіны сказ: "Я пракляла яе". І назаўжды змоўкла, ніхто не чуў апасля ні гуку ад Бэацькі.

Калі выспеў час Верцы нарадзіць, Фіма сядзеў дома і ў змрочным задуменні зыркаў з-пад ілба на маўклівую жонку. У думках вінаваціўся перад ёй, пасля нешта глыбока тужлівае іграў на скрыпачцы.

А Верка разрадзіцца не магла. Павітуха завіхалася, на ўсе лады торкала-поркала — і дарэмна. Мучэнні доўжыліся дзень і ноч, цяжкія роды. Верка не вытрымала і памерла. Што ж тычыцца дзіця...

Тут бацюшка перажагнаўся.

— Тое, што выскачыла з Веркіных нетраў, немагчыма апісаць. Я ўласнавоч не бачыў плоду іх кахання з Фімам, але немаўляці не спяшаліся перавязаць пупавіну. Павітуха — стрымгалоў бегма з хаты, кранулася розумам і праз тры дні гэтаксама памерла. Ну а тутэйшыя хуценька збілі дзве труны і зладзілі хаўтуры, пахавалі ў адной яміне і маці, і дзіця. На сарачыны хата, у якой адзінокая Верка прымала Фіму, згарэла ўшчэнт. Людзі расказвалі пра бліскавіцу, што ўдарыла з яснага неба. Пасля Бэата прапала, апошні раз бачылі, як крочыла ў лес, там і згінула. Мо ў твань засмактала, мо рукі наклала на сябе — невядома. Фіма гараваў надта, спаліў свае скрыпкі, тыя, што не паспеў прадаць, і запіў моцна. Пасля сабраў манаткі і падаўся ў свет. Вось такая гісторыя. Трыццаць год мінула ўжо, трыццаць год.

Калі айцец Аляксандр змоўк, ніхто працяглы час не абмовіўся словам. Прысутныя стрававалі вячэру. Гучна патрэсквала вогнішча. Пан Шмуйла вылез з-за стала, каб падкінуць у печ, нейкі час варушыў чапялой у прыску, затым вярнуўся і сеў на месца.

— А сёння ж Поўня, — зазначыў бацюшка і памацаў вялікі срэбраны крыж на грудзях, затым выразна паглядзеў на прысутных.

— Ну-с, захапляльная гісторыя, — пракаментаваў павятовы ўрач. — Прызнацца, уразілі, не даводзілася чуць, хоць, здаецца, я амаль усё пра ўсіх у акрузе ведаю.

— Дык мала сведак тых далёкіх падзей засталося, — патлумачыў бацюшка. — Хо, вы ў той час пад стол пешшу хадзілі, мабыць.

— То так, — згадзіўся пан Грыб і выразна дадаў: — То так.

— Я вось чаму Поўню згадаў, — бацюшка перамяніў позу і сербануў з кубка. — Хутарскія пачалі байкі баяць, быццам па начох на могілках здані каламуцяць. Енкі з Верчынага долу чутны, быццам плача неўтаймаваная душачка. Звярнуліся да мяне насельнікі: асвяці, бацюшка, магілку пакутніцы, хай людзям не шкодзіць. Апаганіў хтосьці магілку, крыж зламаў. Кажуць, цяпераka сама Верка вылазе з долу з дзіцем за ручку і шукае, заве праз цемру ночы ці то Фіму, ці то мужа...

Бацюшка пагладзіў бараду, вытрымаў паўзу.

— Лягло на сэрца дапамагчы хутароўцам. Меркаваў правесці абрад, запячатаць дол да Другога Прышэсця Госпада нашага Ісуса Збаўцы. Так, асвяціць і запячатаць. Хай сабе там нехрышчонае дзіця ляжыць, але ж Верка была верніцай. Наўмысна вось, хай людзі бачаць, каб забабоны зніклі.

Гісторыя ад бацюшкі цягнула на добры фільм жахаў. Тамаш употай пазяхнуў і ўголас паведаміў, народны фальклор — гэта файна. Пан Грыб адразу шыкнуў, маўляў, не перабівайце, малады чалавек, калі ласка.

— І вось да месца надарылася аказія выпадкова сустрэцца з айцом Змітром, — працягваў бацюшка. — Быў у Менску па справах павятовых. Гаманілі з айцом Змітром, я і распавёў пра жарсці, што ў нас тут пад бокам творацца. Пасмяяліся з ім, паківалі на забабоны. І тут бацюшка Зміцер бярэ з кішэні вось гэты крыж, надзяе мне на шыю і дабраслаўляе менавіта з гэтым крыжам правесці патрэбны абрад. Маўляў, старажытная рэліквія, з Ерусаліма трапіла. З пракавету, калі дзе мрэц з долу выпаўзаў, тым крыжам карысталіся, быццам калісь належаў самому святому Філімону.

Бацюшка ўзяў крыж, што вісеў на грудзях, паднёс да твару, каб уважліва разглядзець. Старадаўняе срэбра таямніча паблісквала.

— Прызнацца, мяне гэта крыху збянтэжыла, — уздыхнуў святар і адпусціў крыж, які павіс і гайдануўся на цяжкім срэбраным ланцугу. — Бо раней я нічога не чуў пра рэліквію. Дый пра святога Філімона не вельмі шмат. Ну раз айцец Зміцер блаславіў, — а між намі поўнае паразуменне, — я згадзіўся і без залішніх ваганняў узяў крыж. Абяцаў пасля вярнуць. Аднак бесклапотная душа айцец Зміцер, хто б мог падумаць, што чырвоныя неўзабаве займуць Чорны Смык і наваколле?! Цяпер там нельга паказвацца. Убачыць той камісар Рабаконь срэбраны крыж — і бывай, рэліквія. Храм Божы разрабавалі ў Жальніцы, як толькі ўехалі ў вёску, я ледзь уратаваўся, вяскоўцы дапамаглі. Цуд! Але куды падацца зараз, дзе шукаць айца Змітра, мо ўжо да сценкі павялі?..

Тамаш забыўся на ежу, якая паспела астыць, так было цікава. Узяў кус пячонкі, пакаштаваў — смачна. Выдатна на аграсядзібе. Кабаноў гадуюць, і свіная чума не бярэ. А мо бярэ, таму зарэзалі, каб папярэдзіць? Пра тое Тамаш не ведаў. Ён яшчэ раз праверыў мабільнік — глуха. Няўжо не дабівае вышка? На лецішчы ў Жальніцы з сувяззю няма праблем. Відавочна, непагадзь паўплывала.

— Крыўдна, бацечка, калі гэтакая каштоўнасць дастанецца рэвалюцыянерам, — разважліва мовіў Шмуйла і тыцнуў пальцам у бок крыжа на грудзях айца Аляксандра. — Рэліквія аніяк.

— Дык і я пра тое, — згадзіўся "бацечка". — Ім, анцыхрыстам, пляваць на рэліквію, яны бачаць срэбра.

— То так, — пацокаў языком гаспадар карчмы.

— Вось прыпрэцца Рабаконь са сваімі галадранцамі заўтра і спаліць кубоўнік.

— То не кажыце, бацечка, — замахаў рукамі Шмуйла. — Сам не свой з перапуду.

— Нам усім галоў не знесці, гаспада, — падвёў выснову лялечны чалавек.

"Гаспада" рэзнула Тамашу слых, яўна не да месца зварот.

"Гаспадзін" пан Шмуйла пашкрэб магутны нос. Хітрынка з'явілася на мясістым твары.

— А што калі нам схаваць рэліквію, бацечка? Ды схаваць надзейна!

Айцец Аляксандр паціснуў плячамі.

— Заўтра нас усіх мо не стане, трэба схаваць так, каб ні нашым, ні вашым.

— Ваша слова, бацечка, — з гатоўнасцю ўзрушыўся Шмуйла.

— Ну што ж, — айцец Аляксандр перакінуў цераз галаву цяжкі ланцуг, паклаў крыж на далонь, потым наблізіў да вуснаў і пацалаваў. — Даруй мне і ўсім нам, Госпадзі! Хацеў перадаць на схоў у іншае месца, ды, відаць, не лёс. Вось ніколі не думаў, што з юдэем разам...

Бацюшка не дагаварыў, перажагнаўся і працягнуў рэліквію гаспадару карчмы.

— Я хуценька!

Шмуйла ўсхапіўся з лавы, выцягнуў з-за печы ёмістую бляшаную скарбонку і анучы. Вярнуўся, усталяваў скарбонку на стол на свабоднае месца.

— Годная рэч, нібыта загадзя ведаў, што спатрэбіцца, — патлумачыў Шмуйла.

Ён беражліва апавіў крыж анучай, затым яшчэ адной і паклаў у металёвую скарбонку, шчоўкнуў вечкам.

— А схаваем мы вось сюды.

Шмуйла выбраў на падлозе толькі яму вядомае месца, узяў са стала нож, сагнуўся, калупнуў лязом і адняў дошку. Пад дошкай прысутныя ўбачылі выемку на локаць глыбінёй. Дбайны Шмуйла відавочна меркаваў хаваць там незлічоныя скарбы. Гаспадар уладкаваў скарбонку, якая ідэальна ўпісалася па краях выемкі, затым накрыў зверху рагожкай і ўставіў дошку на месца.

— Тутака ніхто выпадкова не адшукае, — запэўніў ён. — А калі карчму спаляць, то і пагатоў. Хто сунецца калупаць папялішча?

— Ненадзейнае сховішча, — засумняваўся бацюшка.

Заінтрыгаваны Тамаш успомніў сяброў, чорных капальнікаў, і хацеў ляпнуць, маўляў, дурні знойдуцца, але прыкусіў язык на ўсяляк выпадак.

— Ды хто, апроч нас, будзе ведаць? — уставіў свае слова і пан Грыб.

Усе згадзіліся. Далей было ўжо не так цікава.

Лівень скончыўся, не барабаніў па даху. Тамаш вырашыў, што дужа ўжо позна і зараз найлепшым варыянтам выглядала застацца ў стылізаванай карчме, пакуль сонца не пачне ўзыходзіць.

Гаманілі пра штосьці і далей, але Тамаш не прыслухоўваўся, адчуў стому за ўвесь дзень і ў смак пад'еў, Шмуйла падліў травянога вару яшчэ. Неўпрыкмет ахінула салодкай комай сонная замарач. Занурыла ў здранцвенні. Тамаш і сам не заўважыў, як неўзабаве спачатку прыкархнуў, паклаўшы галаву на стол, а затым паглыбіўся ў моцны сон без сненняў. Ніхто не патурбаваў.

***

— Матроха! — пачулася спачатку здалёк, затым крыху бліжэй. — Матроха, прыгажунька мая, ты дзе?

Гукала жанчына, голас звонкі, пявучы, малады. Тамаш салодка спаў, і голас штурхануў да абуджэння. У разняволеным памежным стане паміж сном і бадзёрасцю розум здольны ствараць і паказваць захапляльныя відарысы. Хлопец яшчэ амаль спаў, але ўжо разважаў, як выглядае ўладальніца прыгожага голасу. Фантазія малявала топ-мадэляў з насценнага календара ў рэдакцыі.

— Матроха, дурнічка мая, куды схавалася? — гукала жанчына ўжо зусім блізка.

Тамаш нарэшце расплюшчыў вочы. Ён не адразу ўсвядоміў, дзе знаходзіцца. Позіркам выхапіў невялікі пень, на пні сядзела вялікая рапуха, якая з цікавасцю ўтаропілася ў Тамаша. У жабы торгалася падбароддзе. Тамаш ікнуў. І імгненна ўсхапіўся. Сон нібыта здзьмухнула моцным ветрам. Затрашчэў хмызняк, і з-за сцяны пасохлых раслін, шчодра аздобленых павуціннем, вылезла светлавалосая дзяўчына ў чырвонай куртцы.

— А мамкі мае, хто вы? — незнаёмка не чакала сустрэць на лясной сцежцы мужчыну са сцясаным лабэшнікам і на секунду знерухомела.

Раптоўны боль гузака нагадаў Тамашу пра ўчарашні палёт чалом у пень на ўскраю леснікоўскай дзялянкі, дзе цяпер і адбывалася ўся мізансцэна. Дзяўчына крытычна аглянула Тамаша, затым заўважыла пень і ўзрадавана ўсклікнула:

— Матроха! Знайшлася! Хадзі да мамы!

Яна кінулася да жабы, падняла яе з пня і беражліва агарнула далонямі. Здаецца, жабе гэта спадабалася. Тамаш быў гатовы пакля сціся, што квакля яму падміргнула.

— Я страціў прытомнасць, — прамармытаў Тамаш і пашукаў вачамі ровар.

“Лісапет” дзядзькі Хведара ляжаў побач. Тамаш падняў ровар, агледзеў звернутае стырно і скрыўленую сядушку. Няўпэўнена пакратаў кола. Падзівіўся. Учора кола было непрыдатным да язды. Ён нёс ровар на плячы і прытуліў да карчмы. Стой! А дзе карчма? Тамаш дзіка заазіраўся, пакруціў галавой направа і налева. Мабыць, ягоныя рэзкія рухі і фрызура мелі неахайны выгляд, таму што рассмяшылі незнаёмку, якая прыкрыла далонню рот; у вачах мільганулі ў вачах іскрынкі.

— Дык вы ўпалі з ровара і страцілі прытомнасць! — здагадалася прыгажуня. — А мне падалося, тутэйшы вясковы боўдзіла ад раніцы накідаўся вінчыкам і спачывае сабе. Прабачце за прамату, шаноўны.

— Ды я не проста ўпаў, я цудам ацалеў, — Тамаш пакратаў лоб.

— Вох-вох, дык у вас мо страсенне мозга? Вам мо да доктара трэба? — паспагадала дзяўчына.

Незнаёмка аказалася гаваркой, Тамаш не паспеў слова сказаць, як пачуў прапанову:

— А ведаеце што? Тут непадалёк мая машына, давайце, пайшлі са мною, я з аптэчкі вазьму пластыр і наляплю вам на лоб!

Хоць прагучала не вельмі, але выглядала на карысную рэч, і Тамаш згадзіўся.

Пакуль ішлі, абмінаючы пні і вецце, дзяўчына распавяла пра жабу, якую сцярожка несла паміж далонямі.

— Матроха ў мяне з вясны жыве, калі хочаце ведаць. Нават маецца ў нас спецыяльна абсталяваны тэрарыум. Вось учора мяркую сабе ў лес выехаць, пасоўкацца з ножыкам, грыбоў пашукаць, заадно Матроху пагуляць выпусціць на гадзіну. Яна ў мяне бывае пагуляецца, хрушчоў якіх паловіць ды вяртаецца хутка на тое месца, дзе выпусцілі. А ўчора дудкі, знікла. Я пабедавала сабе, а тут і дождж прыспеў, ды моцны лівень улындзіў, павярнула дамоў без жабкі, сваёй улюбёніцы. Вы не смейцеся, яна ў мяне зачараваная царэўна.

Тамаш і не думаў падымаць смех, бо ўжо ведаў падобных аматараў прыроды. У рэдактара на лецішчы жыў вожык, той яму лісце кідаў і яблыкі.

— Ну а сёння мне нешта торкнула ў галаву: дай, думаю, яшчэ раз наведаюся на ўчарашняе месца ды праверу, мо Матроха вырашыла вярнуцца? Так што вам пашанцавала. Хоць першую дапамогу атрымаеце.

Скрозь зараснікі на лясной дарозе паказаўся чырвоны "Форд". Калі наблізіліся, прыгажуня папрасіла крыху пачакаць і палезла па аптэчку, з цёплага салону патыхнула водарам парфумы. Жабу ўрачыста вярнулі ў акварыум, які чакаў тут жа, на заднім сядзенні.

Тамаш не адмовіўся б зараз ад кубка гарачай кавы. Ён адчуў голад і каўтнуў сліну. Спрытнымі рухамі незнаёмка выняла пластыр, касметычнымі нажнічкамі адрэзала патрэбную колькасць і паднесла да Тамашова гузака. Ён адзначыў, якія ў дзяўчыны пяшчотныя цёплыя далонькі, з якіх быццам выпраменьваюцца гаючыя хвалі, што нясуць цеплыню і спакой. Пра тое, што далонькі толькі што трымалі мярзотную жабу, неяк і не думалася. Нават зняёмчыла, калі Тамаш адчуў, як у глыбіні цела варухнуліся і пачалі расці натуральныя пачуцці, як раптам завабілі светлыя валасы прыгажуні, што ляжалі на плячах, хвалямі струменіліся па чырвонай куртцы, якімі глыбокімі падаліся шэра-зялёныя вочы. Ён засароме́ўся. А мо і пачырванеў, як хлапчук. А што рабіць, халасцяк жа. І не стары яшчэ.

— Ну вось, нарэшце, — дзяўчына дакладнымі рухамі прымацавала пластыр, пагладзіла пальцамі і дадала, што лясны незнаёмец будзе жыць — да вяселля загаіцца. Па ўзросце Тамаш даваў ёй не больш за дваццаць пяць.

— Скуль вам вядома, я мо ўжо жанаты.

— Пярсцёнка няма. Ці вы з тых мужчын, што знімаюць заручальнік, як толькі застаюцца без нагляду?

Тамаш не адказаў.

— Вольга. Мяне завуць Вольга.

Яна падала руку, Тамаш паціснуў і назваў сваё імя.

— Што ж, будзем знаёмыя. З параўнальна нядаўняга часу я жыву ў вёсцы Жальніца тут непадалёк, хата на самым ускрайчыку. Магу прапанаваць вас падвезці, але ж куды дзенем ровар?

Прапанова адправіцца ў дарогу ва ўтульным цёплым "Фордзе" была вабнай, дый карцела працягнуць знаёмства, якое Тамаш палічыў удалым. Але ж насамрэч куды падзець дзядзькаў "лісапет"?

— Ведаеце што? — з уздыхам вырашыў Тамаш. — А я гэтаксама з Жальніцы. Дакладней, там мая хата. Праўда, тутэйшыя мясціны я пакуль кепска вывучыў, мо падкажаце, дзе тут археолагі лагер разбілі? Няйнакш вы чулі пра раскопкі непадалёк ад вёскі, бо я якраз да іх ехаў, ды збіўся са шляху і заблукаў.

— Дык вы ночачку правялі ў непрытомнасці? Вы ж напэўна змоклі! — Вольга ўсплёснула рукамі.

— Ну, адчуваю я сябе нягблага, толькі гузак даецца ў знакі, — прызнаўся Тамаш. Акрамя кубка гарачай кавы, ён бы яшчэ не адмовіўся залезці на спякотны палок у лазні. Ды каб венічкам...

— Тыповы мужчынскі самаздзек! За вамі патрэбны тэрміновы нагляд, — спачувальна мовіла Вольга. — Я вас абрадую: ведаю тое месца, дзе вашыя сябры маглі атабарыцца. Там, здаецца, спалены яшчэ немцамі ў вайну хутар, мне бабуля расказвала. Сядайце на ровар і кіруйце тым напрамкам, на якім былі.

Тамаш вельмі здзівіўся.

— Вы хочаце сказаць, я зусім не заблукаў учора і не збіўся са сцежкі?

— Ані, — пацвердзіла Вольга.

Ён сумеўся.

— Слухайце, Вольга, тамака далей у лесе на паляне штосьці кшталту аграсядзібы маецца, так?

Вольга пытальна выгнула бровы.

— Яна стылізаваная пад старадаўнюю карчму. Там яшчэ людзі, пэўна акцёры-аніматары. Так?

— Не, ніякай аграсядзібы там у паміне няма, а карчмы дык і пагатоў. Вы няйначай прыснілі.

Тамаш утаропіўся долу: відаць, ёмка пацалаваўся з пнём, раз настолькі рэчаісныя відовішчы наплылі. Адна гісторыя айца Аляксандра чаго вартая. Таямніцы падсвядомасці...

— Ну што ж, Вольга, тады яшчэ пабачымся.

Тамаш развітаўся, спехам параўняў стырно і сядушку ў ровары, развярнуўся і пакаціў далей.

— Пачакайце, Тамашу, — пазвала Вольга, ён вярнуўся.

— Тыя мясціны, дзе вы апрытомнелі, непадалёк ад старых руінаў, тутэйшыя мянуюць выклятым месцам і абмінаюць бокам. Час ад часу там нешта нездаровае надараецца, не зусім нармальнае. Мясцовы фальклор захаваў жахлівыя легенды. Калі завітаеце ў госці, раскажу сёе-тое.

— Руіны?

— Так, дзе я вас натрапіла. Але ж вы не верыце ў забабоны?

— Ні ў якім разе! — запэўніў Тамаш.

— Тады вам прасцей жыць. Але на ўсяляк выпадак беражыце сябе.

Тамаш пацiснуў ейную пяшчотную далонь на развітанне і пакрочыў лясной сцежкай на пошукі сяброў. Вольга доўга глядзела Тамашу ўслед, быццам чакала, што ён абернецца. А ён і абярнуўся адзін раз, памахаў рукой. Вольга павярнула да "Форда".

Руіны Тамаш знайшоў хутка. Ён адмераў крокам прыкладна столькі, колькі ўчора прашкандыбаў ад леснікоўскай дзялянкі да карчмы. І спыніўся каля нагрувашчвання ляснога смецця, затым разглядаў навалёнае і не даваў веры. Хоць страляй, учора тут была шырокая спаруда з чатырохскатным дахам. Вунь і могілкі праглядаюцца скрозь лес. Дыхтоўны будан быў. Успомніў смак

смажаніны і кроплі на барадзе пана Грыба. Дый айцец Аляксандр з шынкаром Шмуйлам уяўляліся жывымі. Не маглі яны быць зданямі. Ці маглі? Няўжо Вольга мае рацыю і ён усяго прытрызніў доўгае буйнасюжэтнае сновішча? Мо насамрэч здані выбіў ілбом, нібыта крэменем — іскры? Што толькі чалавек не пабачыць у мроіве... Тамаш абышоў бокам выклятае месца і вырашыў, што яно насамрэч выклятае ва ўласнай пакінутасці.

Недзе ён чытаў пра так званыя разломы ў часе. Быццам бы яны раскінутыя па ўсім свеце. Глядзіш бывае на чалавека, які выпадкова трапіў на відэакамеру. Вось ён ідзе сабе па справах і раптам — гоп! — няма чалавека, быццам і не было. Прападае без намёку, нават слядоў не застаецца. Затым відэа з камеры трапляе на ютуб, набірае мільён праглядаў, а аўтару плывуць грошыкі ў кішэню. Не, задужа фантастычныя тэорыі Тамаша не захаплялі. Ён прыкінуў і так, і гэтак, па ўсім атрымлівалася, што памеры руінаў візуальна супадалі з учарашнім буданам, хатай-карчмой. Бясспрэчна, дужа даўно тут стаяла хата. Пад друзам і веццем Тамаш разглядзеў нават цудам ацалелы фасад, дзе-нідзе выпіраў мур. Відавочна, спаруда развалілася за даўнасцю гадоў. Як леснікі да гэтай пары не прыбралі? Мабыць, хутка дабяруцца, бо да дзялянкі, на якой мусіў пераначыць Тамаш, рукой падаць. І Тамаш прыгадаў, як у дзевяностыя ўласнавоч бачыў спарахнелы будан, у якім жылі парабкі Ваньковічаў на Бярэзіншчыне ў Калюжыцах. Цалкам захаваўся фасад, а дах і сцены абваліліся. Людзі жылі ў дзевятнаццатым стагоддзі, а напаўзруйнаваная спаруда захавалася да канца дваццатага. І рэвалюцыю перажыла, і немцаў, а каменныя сутарэнні побач з домам парабкаў тутэйшыя скарыстоўвалі ў гаспадарчых патрэбах да гэтай пары ды ласкай памінalі пана, захавалася ж — цуд!

Хлопцы не павераць, калі раскажу, падумаў Тамаш і вырашыў было маўчаць, але ўспомніў, што самы

“галоўны” археолаг, сябрук Міша, дужа захапляўся старажытнымі міфамі, паназбіраў процьму паданняў, хоць кніжку пішы і выдавай. А гісторыя пра Фіму Лібермана вельмі прыгожая, вось толькі якім чынам абазначыць, што пачуў яе ў сненні? Мусіць прызнацца.

Раптам у кішэні варухнула-заторгала слухаўка.

— Алё, Тамашу, выбачай. Мы з-за непагадзі перанеслі раскопкі на пару тыдняў. Учора хацеў паведаміць, ды сувязь прапала. Спадзяюся, ты грэў бакі на печы і носу на вуліцу не вытыркаў.

Тамашу карцела вылаяцца. Паскуды! А яшчэ сябры называюцца. Ён цяжка ўздыхнуў і павярнуў да вёскі. Трэба вытапіць лазню і забрацца на палок грэцца.

***

Дзядзька Хведар поркаўся ў двары, калі Тамаш закаціў ровар праз расчыненую браму. Гузак на лбе сусед прыкмеціў адразу.

— Тамашу, хто табе натоўк лыч з ласкі на пацеху? Бандыцкая куля? — Хведар рагатнуў.

Тамаш моўчкі прытуліў ровар да плота.

— А як раскопкі, дзе тыя навукоўцы? — насядаў дзядзька.

— Не даехаў, трапіў у аварыю, — растлумачыў Тамаш і абцерусіў з мокрага адзення пясок з ігліцай, наколькі атрымалася.

— А мокры які! — усклікнуў дзядзька Хведар. — Хутчэй сцягвай апранахі, вешай сушыцца вунь на дрот пад навесам ды хадзем у хату гарбатку піць. Пашукаю табе нагавіцы з кашуляй.

Ростам і ўшыркі дзядзька амаль адпавядаў Тамашу, і той сціпла згадзіўся на прапанову.

Калі ўвайшлі ў хату, цётка Маша ўсплёснула рукамі, убачыўшы белую палоску пластыру на лбе госця. Дзядзька падаўся ў свой пакой да куфра з адзежай.

— Мой ты хлопча, — шчыра пашкадавала цётка Маша, — а як жа ты гузак набіў?

— Ат, — Тамашу не хацелася прызнавацца, што ён не вельмі ахайна ехаў на "лісапеце", але ж суседзі не адчэпяцца з роспытамі. — Натыкнуўся на сук, ударыўся галавой, вось. Тама дзялянка, санітарныя парубкі, а непадалёк яшчэ руіны і могілкі.

Цётка Маша ўважліва паглядзела на хлопца.

— Ля руінаў упаў? — удакладніла яна насцярожана.

Тамаш кіўнуў.

— Выклятае месца, — заўважыла цётка. — Там заўсёды нешта адбываецца. Летась Мацей, што праз хату жыве, заблукаў. Не было ажно трое сутак, вярнуўся пашкоджаным у розуме, бо сцвярджае да сёй пары, што блукаў усяго гадзіну, а не тры дні.

— Пэўна, штукар ваш Мацей. А чым харчаваўся ўвесь час?

— А ён прызнаецца? — пытаннем адказала цётка Маша і дадала: — Дый ці толькі адзін Мацей там блукаў?..

Неўзабаве вярнуўся Хведар, сунуў Тамашу ў рукі чыстае адзенне, сухое, з густым нафталінавым пахам.

— На во, пераапраніся. Памеры як на цябе.

Ён павярнуўся да цёткі Машы.

— Ну, накрывай на стол, будзьмо абедаць.

Тамаш падаўся ў сенцы. Дзядзькава адзенне прыйшлося амаль у пару.

— Як на цябе, — паўтарыў Хведар і цокнуў языком, калі Тамаш вярнуўся.

Селі за стол.

Фасолю цётка Маша менавала "квасоль". Суседзі ўзбагачалі мову — адмысловы жальнікаўскі дыялект. Клапатлівая цётка Маша выняла з печы ладны ў памерах саган "квасолі" з мясам, паставіла на стол разам з нарэзанай зелянінай у місах.

— Падсоўвай столку і бяры відзёлку, — дзядзька Хведар паказаў на стул і загадаў: — Сядай і еш!

Не лепшы харч на галодны страўнік, але Тамаша сёння ўгаворваць не варта. Дбайная цётка Маша клапатліва наклала пачастунак па талерках, пабралі лыжкі, відэльцы, пачалі есці.

Тамашу свярбела даведацца пра руіны больш. Як добраадукаваны чалавек, ён быў упэўнены, што большасць з'яў у свеце мае навуковае тлумачэнне. Вось сёння ноччу чаму ён апынуўся розумам невядома дзе? Няйначай побач ёсць лясная твань, з якой выдзяляецца атрутны галюцынагенны газ. Раз-пораз газ прыносіцца ветрам да населеных месцаў, і тады людзі побач пачынаюць "блукаць", як той Мацей. Ну а іначай нічым не растлумачыць. Тым болей цікава паслухаць версію суседзяў.

— Раскажыце пра выклятае месца, калі ласка, — папрасіў Тамаш, калі талерка перад ім амаль спусцела.

— Дурноцце там робіцца з людзьмі, — уздыхнула цётка Маша. — Не тут казана.

Кабета ўстала, прынесла імбрык, разліла гарбаты па кубках. Моцнай, чорнай, як любіў дзядзька Хведар, дый Тамаш таксама. Хлопец насыпаў цукру, пабоўтаў лыжкай і чакаў далейшага расповеду. Дзядзька Хведар тым часам парэзаў батон, намазаў на свой кус масла, адкусіў.

— Як Чарнобыль луснуў, вось тады і пачаліся ўсялякія непаразуменні і дзівосы, — засведчыў дзядзька. — То грыбы памерамі з патэльню ці качан капусты парастуць, то людзі ў лес пойдуць ды не вяртаюцца доўга. Здаецца, мясціны знаёмыя навылёт, але блукаюць.

— Грыбы вялікія, дык ад радыяцыі, — уставіла цётка Маша. — Навукоўцы растлумачылі. У людцоў бульба тады расла — клубень з гарбуз, у чыгун не пакласці, трэба рэзаць было. І грыбы гэтаксама.

— Ажно навукоўцы былі? — перапытаў Тамаш.

— Даследчыкі нейкія, — адказаў Хведар. — Хадзілі, штосьці мералі, аналізы бралі. Ды не з людзей, а з глебы.

Ён рагатнуў.

— Тое ж было, — уздыхнула цётка Маша. — Вяскоўцы ў лесе страчвалі прытомнасць. Я і сама аднойчы падалася за чарніцамі, ды ля таго месца, дзе зруйнаваны дом, нечакана павалілася дагары, памарак. Увушшу загуло, свет ахінула помракам, ды, крый Божа, здані паўсталі, вершнікі з шаблямі, дым наўкол, душачка ледзь да нябёсаў не ўзляцела, ускінулася. Даўно ўжо, праўда, тое было, дробязі не помняцца.

Хведар пацвердзіў.

— А я надвячоркам маракую сабе, дзе мая гаспадыня, ужо і прыцемкі хутка.

— Так. Я ачуняла неяк, села на зямлі і не магу ўспомніць, што здарылася. А галоўнае, навошта я тут сяджу? Тады паднялася і рушыла да хаты.

Кабета замоўкла.

— Ну так, тры дні мая гаспадыня хварэла, носу з хаты не казала, — пацвердзіў Хведар і гучна адсёрбнуў з кубка.

— Такое не толькі са мною, з іншымі людзьмі таксама, — дадала Маша. — Ды хоць не адразу, а прыкмецілі: усе гэтыя здарэнні адбываюцца вакол тых руінаў, непадалёк ад старадаўніх могілак.

— Тады ж і навукоўцы прыязджалі са сталіцы, даследавалі тут, — дадаў Хведар. — Казалі, што ў нас тут нейкія неспадзяванкі з хадой часу. А як гэта — ніхто не тлумачыў. Вяскоўцы ж тое месца пачалі выклятым менаваць. Мяне ж чаму і зацікавіла, Тамашу, што ты там да нейкіх археолагаў сабраўся, бо думаў, ізноўку будуць што мераць ды мо людскае што скажуць.

— Не, — Тамаш усміхнуўся. — Тыя мае сябры, гісторыкі, збіраліся гарадзішча капаць і побач у курганку шурф забіць. Яны радыяцыю не мераюць.

— А вось і дарэмна, — зрабіў выснову дзядзька Хведар і падліў з імбрыка. — Той парой вялікімі параслі і чарніцы. Праўда, выключна ў адным месцы,

на паляне, ізноўку непадалёк ад той кропкі, дзе апрытомнела мая Маша. Філімон з нашай вуліцы хадзіў і назбіраў сабе. Першы раз жменьку. Баяўся каштаваць. А раптам тое не чарніцы, а вароніна вока? Але з'еў, смачна, упадабаў. Узяў вядро, ізноўку наведаў паляну, прынёс дамоў і наварыў кісялю. Кісель атрымаўся з той чарніцы, што лайно. Хацелі выліць вон. Але ж Філімон моцна парэзаў палец сцізорыкам, калі дзяркач майстрачыў, каб двор вымесці. Выпадкова памачыў палец у кісель, калі нёс выліваць, і рана за дзень загаілася, а праз два дні і следу ад парэзу не відно. Суседка Філімона несла свінням есці, падвярнула нагу і збіла локаць аб вушак. Ладны чарняк выплыў. Пажалілася, пагаравала. Філімон, не доўга думаючы, за вядро і на паляну, ізноўку набраў тых вялікіх чарніц, наварыў кісялю дый да суседкі, кажа, давай, баба, я табе навуковы эксперымент зраблю. Намазаў той хворае месца, і на раніцу чарняк злез. Тут усе і ўзрушыліся наконт дзіўнай ягады. Выкасілі паляну ўмомант.

— Не ведаю, як той цуд назваць, — уставіла цётка Маша. — Выглядам як чарніца, а памерамі з агрэст. Але ж гаюча. Ну раз лекуе, гоіць раны, назву далі — ведзьміны бубачкі. А яшчэ начны зіхавец, бо ўначы яны, калі свежыя, ледзь свяціліся, зіхацелі. Праўда, назва зіхавец не прыжылася, толькі ведзьміны бубачкі.

— Паглядзець каб, — сказаў Тамаш.

Ён так захапіўся размовай, што астылую гарбату пакінуў некранутай.

— А іх болей няма, — адмахнулася цётка Маша. — Адно лета параслі, дый толькі ў адным месцы, болей нідзе. Лес навылёт прачасалі, а ведзьмінай бубачкі больш не знаходзілі.

Дзядзька Хведар дапіў сваю гарбату і адставіў кубак.

— Памятаеш, гаспадынька, а Філімон даўней той яшчэ эксперыментатар быў.

Ён звярнуўся да Тамаша.

— Філімон выпісваў "Тэхніку — моладзі", "Навуку і жыццё", "Юнага тэхніка" і мусіў аднойчы зладзіць навуковы дослед: наважыўся націснуць самагонкі з ведзьмінай ягады. Учыніў брагі, пакаштаваў. Брага як брага. Толькі моцная задужа атрымалася. Ну, ён самака хваліўся, я брахаць не хачу. І вось на раніцу недарэка пасунуўся ў прыбіральню з бадуна каўцюх адкласці і ўзарваўся разам з прыбіральняй. Выбухам заадно знесла і пуню, якая месцілася праз які метр. Вось табе і ведзьміны бубачкі! Замест прыбіральні з'явілася глыбокая варонка. Навукоўцы былі тут, сышліся ў выснове, што ў эпіцэнтры выбуху ўзнік партал, брама ў іншае вымярэнне. Праўда, з таго вымярэння несла так, што працягваць доследы ахвотнікаў не знайшлося. Яміну загарталі, а новую прыбіральню збудавалі на іншым месцы.

— Не можа быць, — Тамаш нарэшце ўспомніў пра гарбату і адсёрбнуў з кубка.

— Брахун, — засведчыла цётка Маша. — А ці ж так было?

— А як было? — з найграным абурэннем гаркнуў дзядзька.

— Напярэдадні прыязджаў з горада сын Філімона. Паўдня машыну рамантаваў. Тады змочанай у бензіне анучай рукі адціраў ад масла. Дый шпурнуў тую ануччу ў прыбіральню. А Філімон не ведаў, пайшоў туды, закурыў, а запалку кінуў у дзірку. Ануча і пыхнула. Філімон у лямант і бегма з прыбіральні. А лецейка выдалася спякотнае і сухое, пакуль прынеслі вады з калодзежа, следам занялася полымем і пуня. Дык пуню ўратавалі, а прыбіральня згарэла ўшчэнт да галавешак.

— Ну хай сабе і так, — пагадзіўся дзядзька Хведар, які слыў вялікім аматарам разнастаіць гісторыі ўласнымі дапаўненнямі, наколькі ставала фантазіі.

— А што было даўней на месцы загадкавых руінаў у лесе? — паміж іншым папытаў Тамаш. — Мо карчма якая?

Дзядзька Хведар паціснуў плячамі і пашкрэб нос. Маўляў, невядома. Парэшткі са старажытных часоў, мінулых эпох.

— Раней расказвалі, як у рэвалюцыю тамака чырвонаармейцы ўкрыжавалі святара, — прыгадала цётка Маша. — І нібыта праклён лёг з тае пары на тое месца. Мо шынок там калі і быў, але ж яшчэ ў маю маладосць распавядалі пра ўкрыжаванага бацюшку. Вось як цяперака помню. Відавочна, там пасля на могілках нікога не хавалі, ніхто не сяліўся побач. А сённяшнім днём леснікі шчыруюць толькі.

Тамаш прыгадаў айца Аляксандра і супаставіў з укрыжаваным служкам. Адразу зрабілася цікава. А споведы пра доследы навукоўцаў і хаду часу дадавалі ўсёй гісторыі флёр навуковай фантастыкі. Што ж, меркаваў ён, пажывем — пабачым. Калі падумаць цвяроза, пра начное здарэнне лепей маўчаць, бо ў лепшым выпадку проста не паверацъ. Тамаш перавёў гутарку ў іншае рэчышча.

— Хто такая Вольга?

— Ужо пазнаёміўся? — папытала цётка Маша. Дзядзька Хведар падміргнуў. — Справы маладыя, куды марудзіць?

Тамаш коратка пераказаў, як раніцай напаткаў бялявую прыгажуню, якая дала яму бактэрыцыдны пластыр і запрасіла ў лазню.

— От і схадзі папарся, — параіў дзядзька Хведар.

— Унучка нябожчыцы Філоніхі, сёлета да нас перабралася з горада жыць у бабчыну хату, — растлумачыла цётка Маша. — Філоніху ўважалі за ведзьму, здані тагасветныя да яе завітвалі.

Тамаш выцер далонню рот, падзякаваў і вылез з-за стала.

— Адзенне хай высахне, забяру тады, а вашае вярну, дзядзю Хведар.

— То насі, абы на здароўе, — ласкава дазволіў сусед. Пасля павагаўся і мовіў: — Пачакай, Тамашу. Пакажу табе нешта.

Ён рушыў у свой пакой.

— А ўнучка Філоніхі можа цікавае распавесці, — падказала тым часам цётка Маша.

Тамаш і сам здагадаўся. Раз бабку ведалі ведзьмай, з унучкі можна выпытаць больш пра выклятае месца. Ён яшчэ раз падзякаваў за падсілак. Вярнуўся дзядзька Хведар і паказаў Тамашу візітоўку.

— Навукоўцы калі былі, адзін начаваў у нашай хаце, пакінуў мне гэткую цыдульку. Наказваў тэлефаніць, калі надарыцца што загадкавае ды таямнічае.

“Павел Яўменавіч Ліберман, лабараторыя эксперыментальнай фізікі” — значылася чорнымі літарамі, адрукаванымі яўна друкарскай машынкай. Знізу пазначаны нумар сталічнага тэлефона.

“Дзе ў Менску можа быць лабараторыя эксперыментальнай фізікі?” — падумаў Тамаш і пасля сцяміў, што навукоўцы прыязджалі яшчэ за савецкім часам і на сёння лабараторыю маглі даўно скасаваць. Але вось прозвішча на візітоўцы знакавае, думкі пра Фіму Лібермана навеяла...

***

Пан Арыстокаль напяўся і наструніў слых. Наяўная здольнасць чуць нячутнае зафіксавала няўлоўныя звычайнаму чалавечаму вуху гукі. Цёплае жнівеньскае паветра ўтойвала незнаёмы флёр. Птушыная грамада, галасілая ў лесе, змоўкла на які час, затым сарвалася з вецця, закружляла над верхалінамі. Раптоўны подых ветру гайдануў спічакі сосен. У Пана Арыстокля ажыло прадчуванне трывогі, быццам павінна надарыцца бяда і няўмольны кон ужо абраў ахвяру, перавёў рэйкі

цягніка лёсаў на шлях да любімага дома. Ён умеў скурай прадчуваць бяду, у такія выпадкі гучна тахкала сэрца і ламоцце нападала на старыя суставы.

У траве піскнула палёўка, але не яна прыцягнула ўвагу. Чуліся няспешлівыя крокі. Яны наблізіліся да брамы, і нейкі чалавек, вылучаючы дабрыню і спакой, пагрукаў і гукнуў гаспадыню.

— Кіс-кіс-кіс, — пазваў чалавек.

Пан Арыстокаль выгнуў спіну, выставіў хвост трубой і немаладымі гарлавымі звязкамі выціснуў працяглае сіпенне. Тамаш завітаў у двор, зачыніў браму ды сабраўся пагладзіць жывёліну. Але аграмадны, кілаграмаў на дзесяць, чорны кацяра пагрозліва бліснуў зялёнымі вачыма, і Тамаш спешліва адхапіў руку назад.

— Ух, якія мы сур'ёзныя, — зазначыў госць і рушыў далей па акуратнай сцежцы, абапал якой раслі духмяністыя садовыя кветкі, да ганка невялічкай хаты.

Пан Арыстокаль нячутна крочыў услед за прыхаднем.

Дагледжаны дворык выглядаў утульна. Відно адразу, гаспадыня — аматарка садовых кветак. Іх удосталь хапала паўсюдна, водар лунаў у паветры і вабіў пчол з размаітай жамярой.

— Ці ёсць хто дома?

— Уваходзьце! — пачулася аднекуль з двара.

Тамаш глянуў на ўскліч і адразу прыкмеціў з боку гаспадарчых пабудоў Вольгу, якая заспяшалася да візітора. Дыхнула дымком.

— А я ўжо лазенку пачала тапіць, прадчувала ваш візіт.

— Тут нібы ў казцы, — не вытрымаў і засведчыў Тамаш.

Вольга з задавальненнем прыняла камплімент.

— Як гузак? Не баліць?

— Перажыву неяк.

— Гарбаткі?

— Прызнацца, толькі з-за стала, — і Тамаш коратка, у двух словах, распавёў пра адведзіны дзядзькі Хведара і цёткі Машы.

— Няйначай называлі мяне ведзьмай? — нечакана ў лоб спытала Вольга.

— Не, — Тамаш павагаўся. — Казалі, што ведзьма — ваша бабця.

— Што ёсць, то ёсць... Ну, запрашаю ў хату.

Вольга расчыніла дзверы, і на Тамаша патыхнула прыемнай прахалодай.

Адразу кінуўся ў вочы сапраўдны кветачны баль. Рознакаліберныя вазоннікі з хатнімі раслінамі займалі паліцы і падваконне, месціліся на шафе, нават на прыпечку. Са столі штосьці лімонна-духмянае вілася па сцяне долу. Тамаш пацягнуў носам.

— Калі ласка, у свет маіх захапленняў.

Каля тэлевізара стаяла клетка з папугай. Шматкаляровы хахлач спрабаваў услед за дыктарам нешта мовіць, але не выходзіла.

Гукі, пахі і колеры абваліліся на госця дзявятым валам, і ў дадатак сама гаспадыня выпраменьвала амаль неадольны флёр уласнай жаночай вабнасці. Тамаш збянтэжана каўтнуў і няёмка пераступіў з нагі на нагу ў роздуме, які фактар аказвае на яго большы ўплыў: прыгажосць Вольгі ці працяглая адсутнасць жанчыны ў ягоным жыцці? Мабыць, усё разам. Ён і запытаў, ці доўга чакаць лазню.

Гаспадыня зразумела Тамашоў стан, і ўсмешка ледзь кранула ейныя пульхныя вусны.

— Давайце ўсё ж гарбаткі, га?

Тамаш выдыхнуў і згадзіўся.

— На світанні якраз булкі пякла, пачастую.

Вольга рушыла ў сенцы. Дзверы да канца не зачыняла. Тамаш чуў, як гаспадыня грукала місамі ля газоўкі. Ён няспешліва агледзеў пакой. Калі выключыць наяўнасць хатніх кветак, тое быў звычайны пакой

сялянскай хацінкі. Сонейка шчодра ліло прамяні ў вакно. З расчыненай фіранкі скрозь антымаскітную сетку даносіліся розныя гукі з вуліцы. Раз-пораз дыхаў ветрык. Хатка-аднапакаёўка з сенцамі, каморай і печчу. Пакой здаваўся прасторным і ўтульным. Па свежых шпалерах можна ўгадаць нядаўні рамонт. У адным куце стол, у другім тэлевізар, у трэцім да печы прытулены прыбраны ложак, у чацвёртым невялікая шафа. Два крэслы, павернутыя да тэлевізара, па якім перадавалі рэкламу. У куце над сталом Тамаш заўважыў фотаздымкі пад адной вялікай рамкай на сцяне. Ён наблізіўся і з цікавасцю пачаў разглядаць.

Даўней, калі не існавала інтэрнэту, тэлебачання і лісты ішлі да адрасата тыднямі, а то і месяцамі, падобныя рамкі з фотакарткамі ўяўлялі сабой для вяскоўцаў цэлы свет. Выправіцца хто на заробкі на Поўнач, ці з вайны не вернецца, ці замуж забяруць далёка, слоўкам тады не перамовіцца са сваім кроўным, забудзеш, як ён выглядае, гады сатруць памяць. А зірнеш на фота — і быццам бы пабачыўся з родным чалавекам: кумам, братам, дачкой, сям'ёй. У кожнай хаце меліся вось гэтакія рамкі з выявамі дзядуль, бабуль, дзядзькоў і цётак, сыноў і дачок.

Тамаш разглядаў фоты і дзівіўся сам сабе. Столькі часу мінула, а людзі на здымках нават уявіць не маглі, што хтосьці праз дзесяцігоддзі будзе разглядаць іх выявы і разважаць пра іхнія лёсы. Недзе ў сеціве філасофскі жарт вычытаў: ты сам з будучыні зараз глядзіш на самога сябе скрозь успаміны. Так і ёсць. Жыццё ўспамінаецца не цалкам, а фрагменцікамі, нібы стоп-кадры выплываюць на памяць. Пункцікі-дыяфільмы пішуцца ў падкорку і надзейна трапляюць у сэрца. І сёння менавіта ў Тамашовай асабістай хроніцы прыгаданы пункцік наступіў. Бо на адным здымку Тамаш заўважыў да болю знаёмае аблічча,

рыхтык усё жыццё ведаў гэтага чалавека. Тамаш нават наблізіўся, каб лепш разглядзець незабыўны шырокі прыязны твар з напаўсівой барадой і яснымі вачыма — бацюшка айцец Аляксандр пазіраў з пажоўклага, цудам ацалелага, амаль стогадовага здымка. Святар быў не адзін — з жанчынай у старадаўніх строях, якая ледзь прытулілася да пляча бацюшкі. Тамаш аж змакрэў ад хвалявання, каўтнуў набеглую сліну і хацеў дакрануцца пальцамі, як адчуў на сабе чыйсьці позірк. Рэзка абярнуўся. Праз расчыненыя дзверы заглядваў ужо знаёмы катазаўр з гіпнатычнымі зялёнымі вачыма. Каток вагаўся: завітаць у пакой ці вярнуцца ў двор. Звычайная для гэтай жывёлы дылема.

— Кіс-кіс, — пазвала Вольга і злёгку нагой дапамагла хатняму гадаванцу прыняць рашэнне.

Папуга ў клетцы адразу занепакоіўся, заўважыў небяспеку, забегаў зад-перад.

— Знаёмцеся: Пан Арыстокаль, — мовіла Вольга і звярнулася да кацяры: — Пан Арыстокаль, гэта свае.

Кацяра велічна, не губляючы кацінага пафасу, наблізіўся да Тамаша і пацёрся аб ногі.

— Пагладзьце яго, так трэба, — падказала гаспадыня і дадала: — Каб прызнаў.

Тамаш нагнуўся і правёў далонню па цёплай шэрстцы. Пан Арыстокаль выцягнуў хвост трубой і задаволена запеў курну. Затым ускочыў на печ і пачаў мыцца.

Перастаўлены на сярэдзіну стол Вольга накрыла прыгожым блакітным абрусам, прынесла і паставіла паднос з хатнім печывам і электрачайнік, пару кубкаў, пачак чаю і цукарніцу. На дзяўчыне была крыху празрыстая светлая сукенка вышэй калень з малюнкам дзіўнаватых чырвоных лісточаў. Левую лытку знізу аперазаў залаты ланцужок. Па аголеных плячах струменіліся рассыпаныя валасы. Яна выклікала ў Тамаша непадробнае хваляванне.

— Дзіўнае імечка ў вашага коці, — заўважыў ён.

— Вынік захаплення літаратурай. У адным рамане так звалі галоўнага героя.

— Цікава.

Яны селі. Вольга разліла гарбату і між іншым распавядала:

— Кот дужа ўжо разумны, таму і Пан Арыстокаль. Адно размаўляць не ўмее, але гэта не загана. Галоўнае, мы выдатна паразумеліся.

Тамаш узяў лыжку цукру, насыпаў у гарбату і размяшаў.

— Любіце прыроду?

— Вельмі.

Кот на печы адазваўся вялым сіпеннем.

— Стары ён ужо, па шчырасці. Пенсіянер. Летась бабуля ў спадчыну пакінула. Аднак тым летам, калі з адной вясковай коткай кацянят завёў, цягаў ім мышэйпалёвак. Сама бачыла. Разумны.

— Ужываюцца? — Тамаш паказаў на клетку з папугай.

— Птушка шчэ не звыклася. Месяц як куплена. Прынамсі, як я з горада сюды збегла прэч ад мітусні і гармідару.

— А жабка як?

— Матроха? У тэрарыуме спачывае. Ёй мікраклімат патрэбны. Давялося абсталяваць камору. Яна, дарэчы, не з нашых мясцін, можа загінуць, тады будзе шкода. Матроха ў нас жаба з гісторыяй. Яе ўдаў не захацеў схарчыць.

Тамаш адразу заперхаў і папрасіў прабачэння.

— Вы, мабыць, думаеце, вось натрапілі на гарадскую дурніцу, вар'ятку, апантаную жывёлай, якая выправілася ў вёску, дзе канчаткова сапсавала дах. Насамрэч усё прасцей.

Тамаш пачырванеў, Вольга вытрымала паўзу.

— Насамрэч у нядаўнім мінулым я кіравала перасоўным заапаркам. Ездзілі па рэспубліцы, вазілі звяроў

і птушак. Пасля наступіў крызіс і ўсё надакучыла, я кінула-рынула і падалася ў вёску, пажыву тут які час, пагляджу, памаракую. Калі спадабаецца, дык застануся.

Тамаш узгадаў, што некалі пісаў пра нейкі перасоўны заапарк, вельмі вядомы, між іншым.

— Вось-вось, прыемна чуць, што нас ведаюць, — прамовіла Вольга і прапанавала смялей частавацца булкамі і печывам.

Тамаш узяў печыва, адкусіў, спадабалася, аб чым і паведаміў услых.

Вольга прыняла зручную позу.

— Аднойчы ў заапарку хлопцы хацелі з ласкі на пацеху скарміць жабку пітону Каа. Увогуле яны былі на падпітку, давялося потым звольніць. Бо хай сабе і скармілі жабку, але ж... жабка каштоўная, прывезеная з іншага кантынента. Дый пітон мог захварэць ад нязвыклай ежы. Пітончыка належала карміць трусікамі-зайцамі, а тут дурні закінулі жабу і цікуюць, што далей. Удаву прынцыпова да лямпачкі. Але нашага мудрага Каа ад жабы адвярнула, бо звык да трусоў. Быццам зразумеў, што перад ім не ежа, а калега па рабоце. Матроха ж перажыла шок і цяжка захварэла. Давялося пасля спісаць і забраць сабе. Вось такая гісторыя. Прывучаю патрошку да нашага прыроднага асяроддзя, а раптам атрымаецца? Ну а што да бабулі... Бабуля зельніцай была. Зусім не ведзьмай. Прынамсі не ў тым плане, як прынята ведзьму ўспрымаць. Ведзьма крыху абразліва гучыць. З-за нашага няведання так звалі. Бабка лекавала зёлкамі, бо ведала кожную расліну і ў сваім двары, і ў лесе. Мая любоў да прыроды наўпрост ад бабці.

— Дзядзька Хведар расказваў...

— Жартун ваш дзядзька Хведар. Ведаеце, што аднойчы ўтварыў? Пасварыўся з цёткай Машай і вырашыў адпомсціць. Пакуль жонкі не было дома, прымацаваў у каморы да столі вяроўку. Дачакаўся, пакуль

кабеціна вернецца ў хату, пачуў грукат дзвярэй, залез на драўлянае кубло, дзе ляжала сала, вяроўку прасунуў пад пінжак, абвязаўся пад пахі і скочыў уніз, быццам засіліўся. Нават язык высалапіў дзеля паўнаты вобразу. Калі ўявіць, то палахліва, канешне. Але ж на бяду завітала не цётка Маша, а з другога канца вуліцы па нейкую халеру прыперлася Бычаніха, хадзіла сабе па хаце, шукала гаспадароў, зіркнула ў расчыненую камору, а там Хведар вісіць. Усплёснула рукамі, загаласіла-загаравала, маўляў, дапякла саколіка паўпрыца Машка. Тады сціхла, убачыла кубло. Падняла драўлянае вечка, а ўнутры сала. Перажагналася на ўсяляк выпадак, за скіцер — і пхне ў торбу. Расчулены галашэннем Хведар раптам ажыў і як гаркне з-пад столі: "Сала вярні на месца, вароўка!" І Бычаніха, якая магла літр гарэлкі апрастаць і не паваліцца, якая двух мужоў на той свет справодзіла, гэтая ядзерная баба паляцела дагары памарак і знерухомела. Дзядзька Хведар абаперся нагамі на кубло, вызваліўся з вяровачнай повязі, скочыў уніз і не даваў рады, што рабіць. Выклікаў хуткую. Зразумела, нікому не слова пра ўласны ўдзел у падзеях. А Бычаніху хапіў удар, адняло мову. Шэсць месяцаў у ложку. А зведалі пра здарэнне проста. Мая бабуля-нябожчыца, якую Хведар менаваў няйначай як ведзьмай, лекавала старую Бычаніху зёлкамі і выхадзіла! Бычаніха адразу ўсё расказала, як толькі наноў навучылася размаўляць.

Тамаш уголас рагатаў і выціраў слёзы. Вось вам і дзядзюхна Хведар. Зразумела, чаму не хваліўся гэтым выпадкам звычайна гаваркі сусед. Тамаш суцішыўся, адпіў гарбаты.

— У нас тут крыху дзіўнаватыя мясціны, часам змрочныя. Але тыя, хто тут жывуць, даўно звыкліся з усім і на розныя дзівосы нуль увагі, — засведчыла Вольга.

— Нават на тое, што людзі блукаюць, прападаюць на некалькі дзён?

— Ды гэта не самае страшнае, што ў нас бывала. Ёсць рэчы надзвычай больш складаныя і незразумелыя нетутэйшаму, — Вольга сабралася з думкамі. — Мяркую, вы тут не выпадкова, Тамашу. У нас пасяліцца — бадай, вырак лёсу. Адкрыю сакрэт: для староннягa чалавека ўсе людзі ў нашай вёсцы, мякка кажучы, "з прыветам". Жальніца — асобнае месца ў сусвеце, выспа ў акіяне, тут усё інакш. І кожны жальніковец мае ўласныя матылі ў галаве. А ў маёй бабці матылёў было больш, чым у астатніх. За некалькі месяцаў, праведзеных тут, я пачала атаясамлівацца з усімі, зліваццa з асяроддзем, таму больш-менш разумею тутэйшых. Вас таксама чакае падобная асіміляцыя.

Тамаш паціснуў плячамі, маўляў, забабоны нельга ўсур'ёз успрымаць. Кожную незразумелую з'яву можна навукова патлумачыць.

— Вы ўпэўнены? — спытала Вольга тонам настаўніцы пачатковай школы.

Ён адразу не адказаў, успомніў сённяшняе сненне ў начным лесе, надта ўжо яркім падаўся шынок "Халодныя ногі". Таму ўскос зірнуў на фота бацюшкі Аляксандра, прыгадаў гісторыю пра скрыпічнага майстра і сцяміў, што навука ў дадзеным выпадку пэўна не дасць рады.

— Мроіцца мне, у вас ужо наспелі пытанні, — зрабіла выснову гаспадыня. — Але ж госцейка належыць адразу пакарміць, напаіць, у лазні папарыць, спаць пакласці, а тады ўжо пра справы распытваць.

— Дзякуй вам, Вольга, — Тамаш адставіў кубак ад сябе. — І паеў, і папіў, лазня яшчэ не хутка, а шмат спаць сёння не дапушчальна, каб не праспаць жыццё. Скажу вам, што мяне цікавіць: цётка Маша прыпомніла старадаўнюю гісторыю пра ўкрыжаванага бацюшку.

Ён выбіў дроб пальцамі па стале і папытаў, мо Вольга калі чула якія звесткі ад бабулі.

Вольга вагалася, быццам вырашала, расказаць пра нейкую толькі ёй вядомую таямніцу ці не.

— Добра, раскажу. Толькі папярэджваю: гісторыя вельмі незвычайная, таямнічая і загадкавая. Усё было папраўдзе. Хоць і можа падацца прыдумкамі.

Тамаш ператварыўся ў слых. Пашкадаваў, што няма пад рукой нататніка, хаця памяць раней не падводзіла, здаецца.

— Гэта здарылася ў сямідзясятыя, — пачала Вольга.

***

...Поўня залівала ясным святлом навакольны змрок. Паветра замёрла, ні аблачыны ў небе. Ветрык не дыхне. Прастору накрыла зацішша, не чутна нават цвыркуноў, якія звычайна напаўняюць ноч стракаценнем. Неўзабаве з боку лесу цішыню скалануў грукат конскіх капытоў. У містычным святле месяца, нібы ў чароўнай казцы, скакалі з ружжамі на спінах вершнікі.

Адзенне на іх было як у грамадзянскую, але ж год на двары брэжнеўскі. Міжволі думалася — кіно здымаюць, дык хіба ноччу? Староннi чалавек мог і перапудзіцца не на жарт. Вершнікі перасеклі поле, праімчалі ўздоўж дарогі і спыніліся на ўскрайку. Адзін з іх гаркнуў таварышам, загадаў чакаць, а сам нетаропка паехаў да бліжэйшай хаты, спешыўся, паляпаў у вакно. На поясе начнога госця з аднаго боку вісела шабля, з другога — кабура з маўзерам.

У хаце аказалася немаладая ўжо кабеціна. Узрост яе быў — калі да старасці яшчэ далёка, але ўнукі ўжо маюцца. Праўда, муж даўно сышоў у нeвараць, дзеці раз'ехаліся, жанчына жыла адна.

Зірнула гаспадыня ў вакно ды злякана войкнула, разглядзеўшы як след строі начнога прыхадня.

— Адчыняй, старая курва, а то шыбы вынесу! — раўнуў госцейка.

Жанчына перажагналася і запаліла газоўку, электрычнасць на той момант у вёску правялі не ўсім.

Мабыць, жанчына нешта падазравала пра візітоўца, бо спехам прачытала малітву, узяла сябе ў рукі і пайшла адчыняць дзверы.

— Контррэвалюцыя е? — запытаў прыхадзень, ледзь заваліўшыся ў хату.

— Няма нікога, саколікі, адна я, — адказала жанчына чамусь у множным ліку, быццам убачыла атрад вершнікаў па-за крэсамі вёскі.

Грукаючы цяжкімі ботамі ды патыхаючы ледзяным холадам (лета на двары!), прыхадзень абмераў крокамі пакой.

— Нясі есці! І спрытней давай, — госць мацюкнуўся і сеў за стол.

Гаспадыня выцягнула з печы саган з учарашняй бульбай, паставіла перад мужчынам.

Прыхадзень пачаў есці. Ды не тое каб есці, а жэрці, паглынаць, душыцца бульбай, нібыта з галоднага краю ўцёк, даў стрыбака з канцлагера. Хапае бульбіну бруднымі пальцамі, пхне ў чорную зеўру рота, чмякае, каўтае, ікае. Цьфу, аж гідка.

Марудна цягнецца час: пяць хвілін, дзесяць. Якой бульбінай запар чалавечка ўжо частуецца? Колькі ж у худога, быццам штыкеціна, мужчыну можа ўлезці?

Прыкмячае гаспадыня, што прыхадзень з'еў бульбы ўжо больш, чым яна наварыла. Ён есць, а саган не пусцее! І зразумела кабета, якога кшталту госць завітаў, неяк адразу сцяміла, быццам спраўдзілася тое, што яна толькі падазравала яшчэ колькі хвілін таму.

— Што ж не ляжыцца вам, пане камісару? — ціха і выразна пытаецца гаспадыня.

Госць раптоўна перастае каўтаць і жэрці, дастае маўзер, кладзе на стол перад кабетай. Мёртвыя вочы на пасечаным твары злавесна свідруюць жанчыну ў працяглай паўзе.

— Дзе крыж? — здаецца, рэха паўтарае следам за ваяўнічай зданню.

— Які крыж? — спакойна адказвае гаспадыня, вытрымліваючы позірк госця. — Вяртайся дамоў, саколік. Няма ў мяне нічога. І крыж свой у зямлі шукай. Там, дзе пакінулі, схавалі, там і знойдзецца.

— Няма мне калі растатэкваць тут, спяшаюся вельмі... Не аддасі наступным разам крыж, удаўлю, як суку, ці расстраляю, — з гэтай пагрозай "саколік" з грукатам устаў, схаваў у кабуру маўзер і пакрочыў вон з хаты. Ускочыў на каня, страшна свіснуў і кінуўся ўскач да сваіх. Неўзабаве вершнікі імчалі назад, адкуль прыбылі.

— Вяртайся дамоў, пане камісару, — шаптала жанчына ўслед. — Вяртайся ў дол.

Усё заціхла, толькі адзінокая гаспадыня на каленях да світання прамаўляла малітвы...

***

Тамаш слухаў у захапленні.

— Візіт госця адбыўся ізноў праз шмат часу. Мая бабуля ўжо не баялася, калі аднойчы праз ноч нечакана пагрукалі ў вакно. Усё паўтарылася адзін у адзін. Госць папрасіў есці, ізноў каўтаў-душыўся, затым спытаў пра крыж і пагражаў расстрэлам. Цікавая акалічнасць: тым разам бабуля была не адна, у яе начавала сямігадовая ўнучка, якая прыехала з горада на канікулы і сама ўсё ўпотай бачыла і чула. Яна можа пацвердзіць праўдзівасць гісторыі.

— Вы бачылі здань? — перабіў уражаны Тамаш.

— Як вас цяпер. Бабуля загадала схавацца за печ, было дужа страшна. Мне было цікава і боязна. Я была ўпэўненая, што надзейна схавалася. Але калі прыхадзень абяцаў ізноў вярнуцца па свой крыж, ён павярнуўся ў мой бок. І я зразумела, што ён свае словы адрасуе ўжо не бабцы, а мне. Хоць і малая, але ўцяміла,

што наступны раз замагільны візітоўца з'явіцца, калі я вырасту, стану дарослай.

— Гм... І вы пасля ўсяго перабраліся жыць у бабчыну хату, дзе напаткалі здань?

— Вы верыце ў лёс, Тамаш?

— Неа, — прызнанне было шчырым.

— І я гэтаксама, — Вольга паразважала: — Я вярнулася, бо гэта хата маёй любімай бабулі, якая шмат чаму мяне навучыла. Я вярнулася, таму што гэта мая спадчына, я люблю гэтыя вёску, зямлю, дом. А на здань, спатканую ў дзяцінстве, мне, па шчырасці, пляваць, са зданнямі неяк разбяромся, утаймуем. І паверце: ніводная здань не вытурыць мяне, не прымусіць адсюль з'ехаць. Гэта мой край, Тамашу.

— Нечакана, — Тамаш пацёр рукі і перасмыкнуў плячыма.

Мужчыну адольваў скепсіс. Іншым разам ён не даў бы веры пачутаму. Але як не даць, калі мінулай ноччу сам перажыў нешта надзвычай звышнатуральнае?

— Яшчэ гарбаткі?

— Можна.

Вольга шчоўкнула клапыжком на электрачайніку.

— Летам у нашай хаце прахалодна.

— Дазвольце спытаць, Вольга, пра які крыж ідзе гаворка?

— Дакладна невядома, — зазначыла гаспадыня. — Але з-за крыжа быў закатаваны тутэйшы святар, пра якога вы і хацелі паслухаць. Тут другая гісторыя вынікае з першай.

Мая прабабуля Агена была ў вёсцы Жальніца кшталту сястрой міласэрнасці, дапамагала павятоваму ўрачу. Па словах бабулі, у іх было вялікае сяброўства: паміж прабабуляй Агенай і тутэйшым святаром Аляксандрам. Агена таксама была зельніцай, у нас гэта сямейнае і перадаецца з пакалення ў пакаленне. Але ж Агена яшчэ і атрымала пэўную адукацыю ў лекар-

скай галіне. У час рэвалюцыі бацюшка збіраўся аддаць прабабулі на захоўванне нейкую рэліквію, старадаўні крыж, прывезены вельмі здалёк. Святар дужа не хацеў, каб крыж дастаўся чырвоным галадранцам.

— І перадаў? — асцярожна пацікавіўся Тамаш.

— Не паспеў. Чырвоныя занялі Жальніцу, і куды бацюшка падзеў крыж, да гэтай пары невядома. Аднак пра каштоўнасць даведаўся чырвоны камісар Рабаконь і распачаў допыт. Бабка расказвала, бацюшку адразу да сцяны паставілі, пужалі расстрэлам, пра каштоўны крыж распытвалі. Пасля шматлікіх пакут і катаванняў святара ўкрыжавалі. Рабаконь асабіста ўбіваў цвікі...

Прозвішча Рабаконь, айцец Аляксандр, шынкар Шмуйла, які хавае скарбонку ў спрат пад пол, — усё гэта ўспыхнула перад унутраным зрокам Тамаша адным шыхтам і склалася ў неверагодную, абсалютна нерэальную галаваломку. А што калі начное здарэнне зусім не здань, не трызненне, а што калі невытлумачальным чынам Тамаш пабываў у мінулым, у той ночы, калі Шмуйла падказаў бацюшку спосаб захаваць рэліквію?

— Данёс хтосьці хлусню, што паміж святаром і зельніцай Агенай шуры-муры. Ну Рабаконь тут узяўся за маю прабабулю. Пагражаў, выпытваў, думаў, яна ведае пра крыж. Тады спрабаваў згвалціць. Але не згвалціў. Агена паглядзела яму ў вочы і мовіла: "Толькі крані — навек страціш мужчынскую сілу". Яна быццам гіпнатызавала. І падзейнічала, варвар спужаўся. Па сведчаннях, камісар піў моцна, піякі — людзі ўнушальныя. Што там далей было, бабуля не расказвала, мо таксама не ведала. Але з цягам часу на тым месцы, дзе святара ўкрыжавалі, пачалі ўсялякія дзівосы нарадацца. У вайну там і немцы блукалі, і партызаны. Карацей, месца тое пачалі менаваць выклятым. Маўляў, за тое, што закатавалі непавіннага бацюшку, усе беды тутэйшыя пачаліся. Вось. Ну а пасля і Рабаконь праз

дзясяткі гадоў пачаў прыходзіць уноч да бабулі. Цягне здань у нашую хату. Неўтаймаваная душа. Усё крыж шукае...

Электрачайнік закіпеў і выключыўся. Вольга разліла па кубках замест заваркі травянога збору, залунаў прыемны водар, і далей ужо распавядала пра сваё жыццё ў горадзе. Маці яе працавала загадчыцай аддзялення ў лякарні, дзе бацька быў галоўным урачом. З бабчыных метадаў лекавання яны смяяліся і прызнавалі забабоннем. Мо і бяскрыўдным, але забабоннем. Якія там зёлкі, дваццаць першае стагоддзе на двары, дасягненні сусветнай фармакалогіі вунь якія. А вось Вольга была крышачку іншай. У свае дваццаць чатыры замуж так і не выйшла. Было каханне, вялікае каханне, каля яна ў заапарку працавала. Але абраннік раптам выявіўся скотам, пра якога і казаць няёмка, таму разышліся. Да бабчынай навукі Вольга ставілася прыязна, з захапленнем пераймала старадаўнія сакрэты раслін. Бацькі не заміналі, хоць і марылі ўбачыць дачушку медыкам. Калі ж бабця сканала, пражыўшы дзевяноста чатыры гады, унучка вырашыла пасяліцца тут, каб у далейшым вызначыць уласны шлях.

— І ўсё ж не страшна адной?

— А ў мяне Пан Арыстокаль ёсць. Ён здольны чуць мерцвякоў і ў крайнім выпадку абароніць ад нашэсця зданяў, — ці то ў смех, ці то ў слёзы адазвалася Вольга і дадала пасля: — Так бабка запэўніла.

— А раптам ваўкі загрызуць Пана?

Вольга не адразу адказала.

— Ведаеце, Тамаш, бабуля насамрэч была ўпэўненая, што ад няшчасцяў мяне ўратуюць каханне і надзейны мужчына.

Тамаш збянтэжыўся і крыху пачырванеў.

Пан Арыстокаль раптам саскочыў з печы, імкліва падбег да стала і прыняўся з вуркатам церціся аб ногі Тамаша.

Папуга ў клетцы, які дагэтуль чысціў пёркі, а пасля спаў, схаваўшы галаў пад крыло, раптам абудзіўся, страпянуўся і выразна мовіў: "Калі ласка!"

І ў Тамаша ўзнікла нечаканая, амаль вар'яцкая думка.

***

Дзядзька Хведар выглядаў заклапочана і неяк разгублена, калі Тамаш завітаў і зноўку папрасіў ровара на гадзінку-дзве.

— Навуковец тэлефоніў, — дзядзька паказаў ужо знаёмую візітоўку. — Паведаміў, што тэрмінова прыедзе сямейныя карані шукаць і да ведзьмы па настой ад раматузу. Дзіва! Столькі год мінула, а ён едзе. Дый ведзьма памерла ўжо.

Тамаш не надаў увагі словам дзядзькі, хай сабе едзе навуковец.

— Дык куды ты? — вызірнула з хаты цётка Маша.

— Хутка буду.

— На пошукі прыгод?

Тамаш не адказаў, выкаціў ровар за браму.

— Не набі новы гузак! — пажадала суседка.

Тамаш ускочыў у сядло і пакаціў да лесу. Але раптам павярнуў да сябе на лецішча. Хутка зноў круціў педалі, да рамы ровара былі прычэпленыя рыдлёўка і сякера. А на самім Тамашу была апранута зверху джынсоўка, каб не дужа назаляла жамяра. Крыж, клапатліва апавіты рагожкай і дбайна схаваны ў скарбонцы шынкаром Шмуйлам, стаяў перад вачыма, не даваў спакою і вабіў да сябе. Тамаш супаставіў пачутае за сёння і зразумеў, што ўсё круціцца вакол крыжа, які прыбачыўся ў начным сненні на паляне. А што калі тое прарочы сон? Што калі неверагодным чынам ён, Тамаш, атрымаў патаемныя веды пра месцазнаходжанне старажытнай рэліквіі? Было над чым паразважаць, але лепей — праверыць.

Тамаш чытаў фантастыку, даўней нават спрабаваў пісаць сам, асабліва пра дзіркі ў часе, папулярных сёння

траплянцаў-пападанцаў, спробы змяніць мінулае-сучаснасць. “А чаму і не?” — думаў ён, кіруючы да выклятага месца. Раптам дзірка ў часе насамрэч тамака існуе? А калі так, то ён ведае, дзе шукаць крыж. Уласнавоч бачыў. Дзікунства, вар’яцтва, але ж... У лесе Тамаша апанавала ўражанне, што за ім нехта сочыць, быццам свідруе спіну, пільна назіраючы. А мо проста скура спатнела, таму свярбела. Тамаш уявіў, як неўзабаве будзе хвастацца венікам у лазні, і ў момант палагаднела ад прыемнай думкі. Але перадусім — праверыць тэорыю.

Ехаў на ровары па накатанай каляіне. Ранішнія сляды “Форда” вялі ў патрэбным напрамку, таму Тамаш і не заблукаў. Леснікоўскую дзялянку знайшоў хутка. Затым могілкі і выклятае месца: парэшткі старадаўняга драўлянага будана, зарослага мохам, маладымі дрэўцамі і дзе-нідзе кустоўем.

Тамаш спыніўся перад абваленым фасадам. Само сабой, за век ад спаруды толькі фасад і захаваўся, хоць і спарахнелы, але лёгка пазнавальны. Сцены ўгадваліся па рэльефе. Тамаш прытуліў ровар да дрэўца, узяў рыдлёўку, сякеру. Пра тое, што ў карчме мог быць утульны “паграбок” пад полам і ў які зараз можна проста праваліцца, Тамаш не думаў. Але ступаў сцярожка. Выклікаў у памяці планіроўку ўчарашняга свайго месца гасцявання і супаставіў з ледзь бачнымі абрысамі. Вось тут, зразумела, уваход. Ён пакратаў рыдлёўкай, асцярожна ступіў, хруснулі галінкі, веццe. Вачамі пашукаў: так, вось тутака стаяла шафа. Якраз тое месца займала сасонка. Тамаш крадком, быццам кагосьці баяўся, ступіў, пашукаў вачыма далей. Мажліва, вось тут стаяў стол, за якім учора (ага, бадай стагоддзе таму) сядзелі бацюшка, пан лекар і ён. Глеба на тым месцы была цвёрдай. Тамаш поглядам адмераў прыкладную адлегласць ад сябе і ў бок, дзе Шмуйла схаваў скарбонку.

Нахлынула нечаканая радасць: усё так проста!? Няўжо за сто гадоў ніхто не надумаў пакапацца вось тут? Няўжо ніхто да яго, Тамаша, не адшукаў? І снарад у вайну не прыляцеў, абмінуў выклятае месца. Логіка падказвала: а хто ж ведаў? Сэрца моцна тахкала, калі рыдлёўкай калупнуў мох з купіны пад кустом. Высек сякерай кусток, расчысціў пляцоўку, дзе па разліках павінен чакаць скарб шынкара Шмуйлы. Пасля начнога дажджу ў лесе было душна, узмакрэў. Эх, была не была, Тамаш з размаху ўтыркнуў рыдлёўку ў глебу. Упёрся ў нешта цвёрдае. Мог натрапіць на карані раслін. Разгарнуў, убачыў спарахнелыя трухлі, мусіць, парэшткі падлогі. Тамаш разграбаў яшчэ і яшчэ. З размаху садануў рыдлёўкай — і адразу выразна пачуў металёвы лязг. Аж знерухомеў. Пачаў хуценька адкідваць зямлю. За стагоддзе глеба прасела, але не задужа. Тамаш хуценька сашкрэб пясок і маліўся пра сябе, каб (крый Божа!) гэта не аказалася неразарванай бомбай з вайны... Лёс усміхаўся чалавеку.

Неўзабаве Тамаш разглядаў заржавелую, папсаваную часам скарбонку менш за палову метра ўдоўжкі. Тую самую, якую хаваў на ягоных вачах пад падлогу ад чырвонаармейцаў шынкар Шмуйла.

Дрыготкімі рукамі ўчапіўся, затым падкалупнуў рыдлёўкай з краю і вывернуў з зямлі знаходку. Сапселае жалеззе мела дужа кепскі выгляд, яно было крохкім і літаральна ледзь не ламалася ў пальцах. Тамаш адкінуў вечка. Рагожка стлела пад цяжарам часу. Здзьмуў пылінкі, прайшоўся пальцамі і не мог суняць радаснай трывогі. Пацямнелы срэбраны крыж быў перад ім ва ўсёй таямнічай старадаўняй веліччы. Тамаш узяў крыж і ўзважыў у руцэ. Халодны метал прыемна лёг у далонь. Крыж важыў кілі на тры. Няслаба! Дорага, відаць, нават калі ацэньваць як лом, не ўлічваючы, што гэты прадмет ювелірнага мастацтва мусіў лічыцца антыкварыятам.

Крыж апавілі ўзоры і надпісы на розных мовах. На дзіва, у адным месцы ўгадвалася арабская вязь. Тамаш гмыкнуў пад нос. Адразу ўявіў, як сябры-археолагі пазелянеюць ад зайздрасці.

...У той самы момант, калі Тамаш дакрануўся да крыжа, Пан Арыстокаль моцна занепакоіўся. Шэрстка і вусы-антэнкі сталі дыбкі, наэлектрызаваліся. Пан Арыстокаль асцярожна панюхаў паветра, нервова паляпаў хвастом, адчуў нешта злавеснае і непрыемнае, яно абудзілася далёка ў лесе, было выразнае і псавала Пану Арыстоклю настрой. Ён выслізнуў з хаты ў двор...

Тамаш паклаў крыж перад сабой, затым зрабіў смартфонам здымкі з розных ракурсаў. Сёння сувязь прысутнічала, хоць і слаба, але дазволіла Тамашу паслаць адно фота сябру і пацікавіцца праз вайбер-чат наконт каштоўнасці выяўленай рэчы. Засталося чакаць адказу.

Стой! Раз крыж сапраўдны, значыць, начное сновішча зусім не трызненне, і казкі пра здань чырвонага камісара і каламутныя байкі, пачутыя апошнім часам, — гэта ўсё святая праўда! Дык дзе ж ён пабываў ноччу? Насамрэч у мінулым? І Тамаш не даваў веры. Ізноў накрыла пачуцце, што за імназіраюць. Хтосьці пільны, уважлівы і не надта добразычлівы.

Тамаш пачысціў крыж ад друзу і схаваў у глыбіню ўнутранай кішэні джынсоўкі. Каб не кідалася ў вочы, што джынсоўка з аднаго боку адвісае, расшпіліў гузікі. Пасля прымацаваў рыдлёўку з сякерай назад да рамы, ускочыў на сядушку і павольна пакаціў да вёскі. Саспела шмат пытанняў, усе яны спляліся ў клубок, і чым далей Тамаш аддаляўся ад выклятага месца, тым болей клубок рос і мацнеў.

І самае галоўнае пытанне: што не так з сонцам? Нябеснае свяціла пахілілася назад, на ўсход, рыхтык зямля

перапыніла хаду і неўзабаве вырашыла кружляць у адваротны бок. Тамаш пакруціў галавой, неба пасвятлела, аблачыны разам зніклі, быццам іх не было хвіль дваццаць-трыццаць таму. А вось сонца... Сонца вісела ў нябёсах у тым месцы, дзе павінна знаходзіцца а дзясятай раніцы, а зусім не па поўдні, калі ён пакідаў вёску.

Дзіва дый годзе, падумаў Тамаш і вырашыў не непакоіцца пакуль што.

Ага, лёгка сказаць!

***

Паярчэла ў лесе. Быццам светлафільтр у аб'ектыве камеры выкруцілі і ўкруцілі другі. Сцежка, па якой каціўся ровар, імгненна змянілася, нібыта ў ноч дажджу не было, а працяглы час сушыла. Тамаш не разумеў падобных зменаў. Пакаціў да хаты дзядзькі Хведара — здаць "лісапет". Спякотна было на вуліцы.

Тамаш зняў джынсоўку перад брамай, асцярожна, каб неываліўся крыж, паклаў на выгін рукі, другой рукой узяўся за стырно і завёў ровар у двор.

— З'явіўся, саколік! — з воклічам сустрэла цётка Маша.

Яна пабедавала і схавалася ў хаце. Тамаш толькі пацісннуў плячыма. Дзядзька Хведар сядзеў на ганку і рамантаваў зэдлік, убіваў цвікі. Побач стаяла конаўка з зялёнай гарбатай. Дзядзька адпіў і заўважыў, што ў спякоту зялёная гарбата — самы карысны напой, калі без цукру піць. Затым пакруціў зэдлік, памацаў на трываласць і з задаволеным выглядам паставіў на зямлю.

— Няма большага шчасця, чым адчуваць сябе дбайным гаспадаром, — павучальным тонам зазначыў дзядзька, але за маскай бесклапотнасці Тамаш убачыў прыхаваную трывогу.

Тамаш зразумеў, чым яна выклікана ў дзядзькі. Сусед хоча спытаць штосьці, ды не наважваецца з аднае прычыны — каб не палічылі за дурня. Мажліва,

свідруе Хведара тая самая думка, што і Тамаша. Ён прымасціўся побач з дзядзькам, той ледзь прыкметна напяўся.

— Здаецца, нешта не тое з сонейкам, — ён паказаў пальцам угору.

— А што не так з сонцам? — ажывіўся сусед.

— Ну... калі я больш за гадзіну таму ад'ехаў, было за поўдзень, і вось праз гадзіну сонейка не ў звычайны бок пасунулася. Быццам раніца зараз, а павінна на другую палову дня пераваліць.

Дзядзька паглядзеў на Тамаша, як на блазна, і перапытаў:

— Больш за гадзіну таму ад'ехаў?

— А што не так? — насцярожыўся Тамаш.

— Хлопча, цябе не было тыдзень. Цябе дзе халера насіла?

— Тыдзень? — у Тамаша адвісла сківіца.

— Мы палічылі, ты дадому ў горад падаўся. Я ўжо грэшнай справай вырашыў, што ты замыліў мой лісапет і аддасі няхутка. Але ж, на тую бяду, дні праз тры з рэдакцыі тваёй прыехалі, няма Тамаша, не вярнуўся з лецішча. Распачалі пошукі. Безвынікова. Быў чалавек — і няма. Заяву накаталі ў міліцыю. Прыязджаў следчы, участковы заглядваў. Прапаў без вестак чалавек. Мо ў твань засмактала, мо ваўкі загрызлі, мо ўтапіўся, а мо і проста сіндром раптоўнай смерці, у газеце чытаў пра такое, ляжыш дзе пад лясной купінай — усяк бывае. Адна мая Маша выказала думку, што ты "блукаеш" у выклятым месцы. Ды яшчэ і Вольга... Не дачакаўся лазні кавалер, знік.

Тамашу памласнела. Зараз жа нацэліўся абавязкова завітаць да наваспечанай сяброўкі.

— Ды не спяшайся, — спыніў Хведар. — У Вольгі зараз навуковец гасцюе. Той самы, што візітоўку даваў, даследчык Жальніцы.

Тамаш сумеўся.

— Не хвалюйся, стары ён ужо, пенсіянер.

Ад пачутага ў Тамашовай галаве пайшлі перашкоды, рыхтык у тэлевізары.

“Боже, царя храні...” — прапеў смартфон, хлопец дастаў цацку з кішэні, зірнуў у экран, падняўся, знакам паказаў Хведару, што пойдзе.

— Навукоўцу свярбіць з табой пазнаёміцца, — паведаміў услед дзядзька.

Тамаш моўчкі кіўтнуў і падаўся на раптам паслабелых нагах з двара.

— Завітай пазней, мая пірагоў напякла, у мяне ж імяніны, — ужо ў спіну крыкнуў Хведар.

Тамаш гучна падзякаваў, імяніны суседа зусім з галавы выпалі. На вуліцы адгукнуўся ў слухаўку.

— Ты куды знік, прапажа? — узбуджана адказаў сябар-гісторык Міша. — Дні з чатыры спрабую звязацца — нельга. Палічыў, што з цябе ўжо якія злыдні душу выкалачваюць.

— Ёсць за што?

— А вось з-за знаходкі. Схавай і нікому не паказвай, бо могуць і галаву адвярнуць.

Тамаш замер.

— Чакай, каштоўнасць крыжа высветліў?

— Крыж задужа каштоўны. Але сапраўдны крыж, у цябе відавочна падробка, копія, бо не можа ў нас аказацца артэфакт падобнага кшталту, вельмі далёка ад радзімы. Так што не хвалюйся, пра злодзеяў я пажартаваў.

— А можаш коратка ўвогуле пра сапраўдны крыж распавесці?

— Коратка не вельмі атрымаецца, але слухай, можаш запісваць.

Тамаш ператварыўся ў слых.

— Увогуле звестак па крыжы вобмаль. Крыж як крыж. Цікавае — надпісы на ім. Лацініца, іўрыт і фарсі. Спалучэнне незвычайнае, калі мець на ўвазе хрысціянскае

паходжанне прадмета. Нідзе ніякай інфармацыі ў айчынных крыніцах, нават легенд і паданняў нямашака. Рэч ідэнтыфікаваць доўга не выходзіла. Але ж ад шчаслівых выпадкаў ніхто не застрахаваны. Я даслаў фота па мэйле знаёмаму доктару археалогіі з Афінаў і ведаеш што? Дзядзечка выказаў меркаванне, што артэфакт датуецца эпохай крыжовых паходаў, і прапанаваў звязацца са сваімі спецыялістамі, я, адпаведна, даў згоду. Хутка прыляцеў адказ, што крыж насамрэч належаў легендарнаму крыжаку святому Філімону. Гм, яшчэ тое імечка для крыжака.

— Аднак.

— Далей пачынаецца штосьці з раманаў Кінга. Святы Філімон удзельнічаў у першым крыжацкім паходзе. А ведаеш, як воі-крыжакі (арабы менавалі іх франчжы) упершыню бралі Іерусалім? Голымі рукамі ў асноўнай масе. Адслужылі месу пад сценамі і без зброі і даспеху палезлі на тыя самыя сцены. Зброя была ў вельмі нямногіх. Арабскія сучаснікі сведчаць: Іерусалім патануў у крыві. Франчжы з галадухі варылі дзетак мусульман у катлах і не лічылі тое заганай, бо, так бы мовіць, няверныя. Але гэта кветачкі, далей наўпрост містыка. Асобныя воі ад жорсткасці і крыві пачалі дурнець. Сярод іх і святы Філімон, тады яшчэ не святы. Ён занепакоіўся сваім духоўным станам, хоць уласна немаўлят не жэр, і палічыў, што вайна не хрысціянскі занятак. Філімон адрынуў зброю і пачаў шукаць Бога. Сапраўднага. Ён адліў сабе крыж, бо да паходу ў святую зямлю быў кавалём, і хадзіў, прапаведаваў пакаянне і мір. Адметная рыса: Філімон не хрысціян усё ж лічыў паўнавартаснымі людзьмі, што на той час гучала вельмі рэвалюцыйна. Ён лекаваў згодна з паданнем так званую “хваробу крывавай смагі” сярод і суайчыннікаў, і насельнікаў Палесціны. На сучасны лад названы нядуг можна пазначыць няйначай як вампірызмам. Уяўляеш, так?

— Пакуль не вельмі.

— Больш ніякіх сведчанняў не засталося. Дзе нарадзіўся, калі памёр — няведама. Толькі па апісанні крыжа ў нешматлікіх крыніцах і зразумела, што гэта, хутчэй за ўсё, крыж святога Філімона, ці, дакладней, копія. Да таго ж малюнак крыжа ёсць у адным сярэднявечным кодэксе. Пан доктар праверыў: супадае выява на дасланым фота з малюнкам. Так што калі ўявіць, што мы маем справу з сапраўдным крыжам святога Філімона, незразумелым чынам патрапіўшым у наш край, то каштаваць ён павінен — мама дарагая, не ўявіць колькі. І нават калі перад намі падробка, то рэч усё адно старадаўняя і попыт на яе адпаведны. Таму пытаннечка іншага парадку: раз перад намі копія, хто ў Беларусі стагоддзе таму мог ведаць пра крыж святога Філімона? Каму спатрэбілася адліваць копію?

Тамаш памацаў адвіслую кішэню і сказаў, што не ведае.

— У любым выпадку мне карціць глянуць рэч хоць вочкам. Так што прашу, схавай і нікому не давай нават у рукі, не паказвай лепш. Хутка мушу прыехаць у Жальніцу, чакай візіту.

— Добра, — Тамаш адключыў сувязь і падумаў, справы набываюць усё большы драматызм.

Хлопец пашкрэб патыліцу. "Заўтра сёння стане ўчора", — сведчыла вычытаная ў сеціве сучасная прымаўка. Аднойчы ў Чэцьі-Мінеях знайшоў згадку пра юнакоў, якія хаваліся ад імператарскіх салдат у глыбокай пячоры, прасілі ў Бога літасці і абароны, паснулі сабе, а калі прачнуліся, некалькі сотняў год мінула. Вось нешта адпаведнае і ў Тамашовым жыцці знайшло трывалае месца. Выпадала чытаць пра дзіўныя здарэнні, калі людзі добрыя раптам знікалі або паяўляліся з ніадкуль і сцвярджалі, што яны з іншага часу. Вунь жоўтая прэса раз-пораз друкуе артыкулы пра тых самых траплянцаў-пападанцаў. Тут не дзіва

і розумам пашкодзіцца. З тужлівай думкай Тамаш абмінуў двух вясковых небарак, якія гілгічылі нешта сваё, кідалі вакол баязлівыя позіркі.

Узбоч Вольгінай хаты гучна храпацеў трактар-гартач. Гаспадыня нешта тлумачыла кіроўцу, паказвала рукамі. Калі Тамаш наблізіўся, гартач, пыхкаючы смуродам паленай саляры, рушыў далей па дарозе. Вольга выглядала крышачку самотна.

— Жальніцу рушаць, зносяць і закапваюць пакінутыя непатрэбныя хаты. Пытаў чалавек, ці ёсць тут рачулка, каб памыцца, і калодзеж — пітной вады набраць. Бач ты, сельсавет скасавалі, вёску перавялі пад іншую адміністрацыйную зону, людзей на сяле бракуе.

Вольга рашуча акінула поглядам Тамаша.

— Ведаеш, а заставайся тут.

Тамаш ад нечаканасці заперхаў.

— Ты ж ужо сапраўдны жальнікавец. Таксама блукач скрозь час.

Ён нарэшце пракашляўся.

— Прапаў на тыдзень, а самому падалося, што на некалькі гадзін?

Тамаш прызнаў, што так, і цяпер не дае рады.

— Калі ласка ў клуб пацярпелых. Усе ў Жальніцы блукалі на выклятым месцы, толькі не ўсе прызнаюцца.

— І ты?

Вольга паціснула плячамі.

— Са мной было проста. Летась, калі бабуля лягла ўжо на божай пасцелі, я падалася ў лясок па чарніцы наварыць кісялю. Звычайную металёвую конаўку на паўлітра ўзяла — ягад набрала хутка. Калі вярнулася, два дні быццам май зміў.

— А бабуля?

— Паспела ў апошні момант. Бабуля аддала душу на маіх вачах.

Вольга сумна ўздыхнула.

— Мяне міліцыя расшуквае.

— Не дзіва. Усе, каго я тут ведаю, блукалі па два-тры дні, толькі ты адзіны прапаў тыдзень. Вось і цікава, дзе ты быў і што бачыў?

— Не магу дакладна сказаць. Памятаеш, калі мы пазнаёміліся ў лесе раніцай, я быццам упаў і моцна ўдарыўся і без прытомнасці ноч ляжаў, але... — Тамаш змоўк.

— Але?

— Такое ўражанне, што я трапіў у іншы свет. Не ў плане рэлігіі ці містычнага досведу, не, я пабываў у мінулым. Але дакладна расказаць, баюся, не атрымаецца. Хачу разабрацца. Ведаеш, я не веру ў машыны часу, іншапланецян, фантастыку і пагатоў містыку і забабоны, а тут літаральна за два дні па маім асабістым часе столькі здарылася! Мне не вельмі страшна, але дужа не па сабе. Па шчырасці, я баюся таго, чаго не разумею.

— Пайшлі ў хату, пазнаёмлю з навукоўцам. Калі хто здольны праліць святло, дык, бадай, акадэмік.

— Дзядзька Хведар прыслаў? — недаверліва спытаў Тамаш. — Прозвішча Ліберман?

— Палову жыцця даследуе тутэйшыя анамаліі, вышукаў нават сямейныя карані. А прыехаў да маёй бабулі па зёлкі ад раматузу, ды спазніўся на год.

Так, варта было пагаманіць з навукай.

Аўтамабіль навукоўца прытуліўся супраць брамы. Двор сустрэў знаёмым кантрастам з вуліцай: кветкі, кветкі, паўсюдна кветкі. На ганку грэўся Пан Арыстокаль. Бліснуўшы вачыма, устаў, саступіў дарогу гаспадыні і госцю. Увайшлі ў хату.

За сталом сядзеў лысаваты чалавек у акулярах, пуза ляжала на каленях. Чалавек-кавун пільна цікавіўся фотаздымкамі, разглядаў, кратаў пальцамі, мармытаў пад нос. Ён устаў насустрач Тамашу, падаў руку, коратка павітаўся, назваў прозвішча.

— Дык вы і ёсць чарговая ахвяра тутэйшых анамальных зон? — даследчык хутчэй падвёў вынік, чым спытаў. — Можаце падзяліцца ўражаннямі?

Тамаш змераў таўстуна крытычным поглядам.

— Асабіста ў мяне маюцца звесткі за апошнія трыццаць год як мінімум пра два дзясяткі выпадкаў кшталту вашага. І кожны пра адно і тое ж, усе аднолькавыя ў сукупнасці. Ва ўсіх назіраюцца праблемы няправільнай хады часу. Так бы мовіць, чалавек думае, што ў лесе правёў гадзіну, а насамрэч два дні, а хто і болей.

— За трыццаць гадоў доследы прынеслі вынікі?

Навуковец пацмокаў вуснамі.

— Дайце слова, што нічога з маіх расповедаў не трапіць на старонкі жоўтай прэсы.

— З лёгкасцю даю, бо не маю дачынення і ахвоты да жоўтай прэсы.

Таўстун павярнуўся да стала, пaварушыў пажоўклыя здымкі.

— Удалося высветліць, што мой продак тут жыў, дакладней прадзядуля. Дарэмна лічыў вось сярод старых здымкаў дзе фота выявіць. З продкам звязана самотнае сямейнае паданне, задужа гаротнае.

Навуковец адышоў ад стала і павярнуўся да Тамаша.

— Прадзядулю звалі Фіма Ліберман?

— Адкуль ведаеце? — узрушыўся навуковец.

— Знаёмы з вашай сямейнай легендай.

— Цікава-цікава, — навуковец уважліва разглядаў Тамаша паверх акуляраў. — Меркаваў, толькі я адзіны раскапаў крыніцу. Аднак...

Вольга наблізілася да стала, сабрала фотаздымкі і пачала соваць іх назад пад шкло ў рамку.

— Нічога патрэбнага не знайшлі, пан вучоны?

— Не, Волечка, мабыць, трэба распачаць пошукі ў іншым месцы. Ёсць адно ў зацемках, — сказаў таўстун і падзякаваў, затым павярнуўся да Тамаша.

— Цягам жыцця я вывучаю складнікі сусвету. Я фізік і па натуры, і па прызванні, і тое мая вера. Скажыце, вы верыце ў Бога? Чалавечае вока бачыць бадай не больш за дваццаць адсоткаў усяго спектра электрамагнітных хваляў, чалавечае вуха можа чуць далёка не ўвесь гукавы спектр. Існуюць гукі і ёсцека святло, якое мы не ў стане пачуць і пабачыць з-за ўласнай слепаты і глухаты, па ўласнай прыродзе. Гукі мы чуем ад інфрагуку да ультрагуку, святло мы бачым ад інфрачырвонага да ультрафіялетавага, і нам здаецца — мы ўспрымаем цалкам сусвет. А вось дудкі! Па-за гэтымі рамкамі існуюць святло і гукі, якія мы не можам успрыняць. Іх шмат, іх задужа багата, незлічона проста. Дык пытаннечка: раз мы сляпыя і глухія, як мы можам сцвярджаць, што Бога няма? Або як мы можам сцвярджаць адсутнасць іншых прастораў і светаў? Між тым, іншыя прасторы побач з намі, проста мы не здольныя пераскочыць з аднаго ў другі, бо гэта ідзе насуперак законам, па якіх створаны сусвет, — законам фізікі, на пачатку закладзеных Творцам.

Каб вы зразумелі думку, вось вам наглядны прыклад. У пакоі знаходзяцца два акварыумы з рыбкамі. У кожным рыбінкі жывуць сабе, лічаць свой акварыум адзіным светам і не вераць, што існуе недзе іншы. Рыбкі, канешне, могуць задавацца пытаннем: раз Бога няма, то хто тады мяняе ваду ў акварыуме? Але я пра іншае зараз. Як рыбінкі могуць вандраваць з адной ёмістасці ў другую? Аніяк. Толькі вы самі, калі залезеце рукой, цапнеце за жабрукі і перакінеце з акварыума ў акварыум. Правільна? І вось уявіце сабе, што паміж акварыумамі ўтварыўся масток, тунэль, запоўнены вадой. Рыбкі пра вадзяны калідор не ведаюць, пакуль не наткнуцца. А як наткнуцца, то адразу здольны праплываць у іншы для сябе свет. Усім зразумела? А вось зараз падумайце, што вёска Жальніца і ёсць масток паміж двума акварыумамі.

Праўда, усё значна складаней. Вы ж, канешне, не чулі пра шматсветную інтэрпрэтацыю? Растлумачу. Вось наблізіліся вы да развілкі шляху, збочваеце ўправа. Збочылі ўправа — добра. Дык вось, існуе цэлы сусвет, дзе вы збочылі ўлева. І гэткім чынам пахвілінна, пасекундна, бо штоімгненне вы робіце нейкі выбар. Вось тут вы селі, а там вырашылі не сядаць. Тут вы хрумкаеце гурок, а там вырашылі грызці цыбуліну. Тут Сямёныч куёўдзіцца з жонкай, а там жонка чапялой лупіць Сямёныча. Тут адчыніў Сямёныч фіранку і праз фіранку дзьмухнуў вятрыска, а там праз фіранку ўскочыў кот. Даражэнькія мае, варыянтаў — трыльёны трыльёнаў. Але не буду загрувашчваць вушы, скажу адно: усе варыянты між сабой паралельныя, рыхтык два акварыумы ў адным пакоі.

Дык вось, па ўсіх законах, мастка паміж паралельнымі прасторамі быць не павінна, бо парушаецца логіка прычынных сувязяў. Мы жывем ва ўласным сваім сусвеце, і для нас іншых няма. Ізноўку вам прыклад. У адным акварыуме плаваюць селядцы, а ў другім — шчупакі. Ну, селядцу сярод шчупакоў няўтульна пачуваецца, у шчупакоў іншыя светапогляды. Таму і тунэля між іх сусветамі быць не павінна. Тунэль — гэта штучнае ўтварэнне, парушэнне законаў фізікі — анамалія. І ў вас гэтая анамалія ў наяўнасці. Хай да вас праз яе заплывае не шчупак, але пачварнае стварэнне з іншага свету, якому нельга быць у нашым свеце, сярод нас.

Прысутныя панурыліся ў развагі, задаваліся пытаннем, што мае на ўвазе пан навуковец.

— Волечка, здань, якая наведвала вашу бабулю, зусім не здань, гэта жывы чалавек, але з іншага зямнога часу.

Колішняе захапленне навуковай фантастыкай дапамагло Тамашу добра ўсвядоміць і засвоіць пачутае.

— Пачакайце, доктар, — пачаў ён. — Мне Вольга таксама расказала пра здань камісара Рабаконя і праклён, і вы лічыце, што насамрэч Рабаконь ёсць прыхаднем з мінуўшчыны?

— Гэта самае што ні ёсць навуковае тлумачэнне. Прарыў, дзірка ў часе і ёсць масток паміж светамі ў Жальніцы, праз які чалавек з эпохі рэвалюцыі завітваў за нейкім ліхам.

— Ну, гэтае ліха вядомае, — адазвалася Вольга. — Камісар пытаў пра крыж.

— І вось тутака паўстае, шаноўныя, іншы момант ці бок: скуль той крыж узяўся? Бо я ўпэўнены: крыж і ёсць прычына анамаліі, прычына, спарадзіўшая масток паміж светамі.

— Чакайце, а мы гэтаксама можам праз дзірку трапляць у мінулае, у тую эпоху? — запытаў Тамаш.

— Лёгка, — мовіў акадэмік. — Раз камісар Рабаконь праз анамалію скочыў у будучыню, то тэарэтычна, варта меркаваць, мы, адпаведна, можам пераносіцца ў той час, мінулы, калі знойдзем кропку ўваходу. Само жыццё дае падказку. Раз, так бы мовіць, здань шукае крыж, то крыжу не месца тут, крыж, бадай, не з нашага свету. Разумееце? Прысутнасць крыжа парушае лагічны ланцужок прычынных сувязяў, і прастора вакол месца прарыву пачынае існаваць з парушэннем законаў фізікі. І самае першае, заўважнае і прыкметнае: з вамі ўсімі калінікалі мелі месца выпадкі, што час ішоў замаруджана. Правільна я кажу? Вы ў лесе траплялі ў такое месца, я б назваў прасторавы мяшок, калі звонку мінула некалькі дзён, а асабіста для вас — толькі адна-дзве гадзіны. Было такое? Было. Вось вам і навуковае тлумачэнне: калі крыж не з нашага свету, то ягоная прысутнасць у нас парушае логіку, значыць, вакол крыжа, так бы мовіць, прычыны анамаліі, збіраюцца энергіі іншых вымярэнняў, якія ўплываюць, замінаюць і парушаюць звыклую хаду часу.

— А калі прычына раптам знікне? — спытаў Тамаш.

— Думаю, павінна знікнуць і анамалія, — коратка падумаўшы, адказаў прафесар. — Але ж яна з'явіцца там, дзе крыж узнікне, вось. Анамалія суправаджае крыж, — прафесар раптам задумаўся.

— Пачакайце, — маланкавая здагадка прамільгнула на пяшчотным тварыку Вольгі. — Дык раз анамалія і прарыў у часе ўзніклі там, дзе крыж, то па ўсім вынікае, крыж захоўваецца да гэтай пары там, у эпіцэнтры анамаліі.

— Неяк я і не падумаў, — разгублена мовіў раптам заклапочаны прафесар. — А дзе гэта?

— Выклятае месца! — прашаптала Вольга.

Тамаш пачырванеў.

Навуковец паглядзеў на прысутных.

— Можна меркаваць, Рабаконь аднойчы знойдзе крыж і знясе з сабою ў мінулае. Дзірка ў часе захлопнецца, і анамалія знікне. І да Жальніцы гэта ўжо будзе мець дачыненне не большае, чым расказаная мной гісторыя мастка паміж прасторамі.

Тамаш быў гатовы праваліцца скрозь зямлю, бо крыж, пра які ішла гаворка, у дадзены момант ляжаў у заплечніку ў ягоным доме і відавочна тэрмінова збіраў энергіі іншых вымярэнняў, каб утварыць дзірку ў часе вакол Тамашова лецішча. Тры кілі срэбра! І як даць веры выкладкам прафесара? Навуковая версія выглядала праўдападобнай толькі тэарэтычна. Ён вырашыў маўчаць і пра знаходку — ані гуку.

— Вынікае, значыць, што Рабаконь яшчэ з'явіцца, паўстане апраметнай зданню, — змрочна прамовіла Вольга. — Трэба толькі чакаць.

Выснова Вольгі здалася слушнай. Раз анамалія не знікла, чаму пацвярджэнне — нядаўняе прападанне Тамаша, то не адшукаў яшчэ неўпакоены чырвоны камісар тое, за чым вылузгваўся, быццам з нябыту, у наш свет.

— Дык скуль той крыж на нашыя галовы зляцеў? — запытала Вольга.

— Бачыце, шаноўныя, у тым павінны мае продкі, — сумна мовіў прафесар. — Я высветліў, што мой прадзядуля жыў тут непадалёк, на хутары Чорны Смык. Гэта ў выніку ягоных учынкаў сюды прывезлі сярэднявечны артэфакт, вядомы як крыж святога Філімона.

І навуковец распавёў, што адна з прычын ягонай цікавасці да Жальніцы — пражыванне ў тутэйшых мясцінах продка. Па нейкіх каналах з габрэйскіх крыніц ён напаткаў у архівах успаміны скрыпічнага майстра Фімы Лібермана, які пакутаваў на бяздзетнасць і кахаў моцна Бэацьку-паляшучку, але гуляў налева. Далей расказаў пра праклён Бэацькі і наступствы, карацей, паўтарыў гісторыю, пачутую Тамашом у карчме пана Шмуйлы ад бацюшкі Аляксандра. А сёння вось забрыў на тое месца, хацеў прыкінуць, як усё адбывалася. Хутара ж няма, у вайну немцы спалілі. І магілу прадзядулінай каханкі ўжо не знайсці, над ёю павінен быў святар абрад правесці з так званым крыжом святога Філімона. Праўда, тое ўжо не з успамінаў Фімы, з іншых крыніц. Ды святара чырвоныя схапілі і ўкрыжавалі. Праўда, паспеў бацюшка рэліквію схаваць. А дзе? Нікому невядома, пакуль Вольга не выказала ідэю, дзе лепей шукаць. І як сам не дапяў — дзіва. Распавёў навуковец, што пасля знікнення Бэацькі ў Фімы нарадзілася яшчэ пяцёра дзяцей, адным з якіх быў дзядуля навукоўца.

— Распавяду яшчэ наступнае. Легенды пра святога Філімона, які сваім крыжам ганяў нячысцікаў, там-сям ёсць, а афіцыйная царква не прызнае згаданага святога. Нідзе ён не адзначаецца і афіцыйна не згадваецца. Разумееце? Сапраўдны святы Філімон жыў у першым стагоддзі і да нашага не мае аніякага дачынення. Сітуацыя нагадвае святога Нікласа на Новы год або святога Валянціна на дзень закаханых. Легенды ёсць, а афіцыйна — не было такіх. Вось вам загадка.

Прысутныя ўголас папрасілі неадкладна растлумачыць.

— А вось паслухайце, — навуковец падзьмуў на папярэдне прапанаваную Вольгай гарбату. — Быў Мікола Угоднік, святы Мікалай, а Нікласа з падарункамі на новы год не было, царква не прызнае. І святога Валянціна ніколі не існавала. Насамрэч святых Валянцінаў было

некалькі, але ніводзін з іх не вянчаў употай ад імператара закаханую пару і не даў пачатка Дню закаханых. Да слова, Снягурка ў сапраўднасці — ахвяра цёмных рытуалаў у паганскіх зімовых абрадах, а не ўнучка дзядулі Мароза. А так званы святы Ніклас у мяху цягаў зусім не падарункі дзецям, а штосьці жахлівейшае. Адкуль яны ўзяліся, га? Ніклас з Новым годам, Валянцін з Днём закаханых і Філімон з крыжам супраць нячыстай сілы?

Тамаш непадробна захапіўся і спытаў адкуль.

— Мая версія наступная: пералічаныя асобы ідуць напрасткі з паралельных прастораў, я перакананы. Афіцыйна іх няма, толькі легенды і паданні. Чаму? Бо яны ўсе існавалі, але ў іншых сегментах Сусвету. Пэўным чынам яны маглі самастойна падарожнічаць па светах, падарожнічаць або блукаць. Ці мелі яны патрэбу ў мастках паміж светамі, ці пераносіліся самі — невядома. Ізноўку нагадаю прыклад з дзвюма акварыумамі. А раптам нарадзілася рыбінка, здольная скакаць у паветра? Існуюць жа ў свеце гэтакія рыбкі, ёсць. Выскачыць у паветра, і яе інерцыяй у суседні акварыум — гоп! — і ўсё, уласна для сябе яна апынулася ў паралельным свеце. І пацягнуліся следам легенды: жыццё ў родным акварыуме віруе, як і ў чужым, але крыху па-іншаму, там рыба не плыве, а скача, там корм не чарвячкі, а пярлоўка. Так і святы Філімон з'явіўся ў нас з паралельнага свету, там у сябе ён крыжам нячысцікаў спрытна ганяў ды з размаітым крывасмокствам удала змагаўся, а ў нас пра свае здзяйсненні захапляльную казань пакінуў. Разумееце?

— Усяслаў Чарадзей, — ляпнуў Тамаш.

— Во, яскравы прыклад, — пагадзіўся прафесар. — Наш Усяслаў князь дбаў за княства, развіваў рамёствы, будаваў школкі, а ў паралельным свеце пярэваратнем гойсаў па абшарах княства, ваўкалака.

— Цяжка паверыць, — Тамаш пашкрэб цемейка. — Колькі ж дзівосаў на свеце, людцы мае...

— Рэдкія людзі — блукачы, — задуменна падвёў вынік прафесар. — Блукаюць у часе, вандруюць паміж прасторамі ў спробах змяніць жыццё, свет, людзей. А людзі што? Людцы жывуць сабе, гарбацяць ад цямна да цямна, ад гімна да гімна ў пракаветным коле работа-дом-работа-дом, і добра, калі голаў задзіраюць паглядзець на зоркі ды падумаць-паразважаць пра вечнае і сваё месца ў сусвеце.

Сказаўшы, таўстун дапіў гарбату, падняўся, вылез з-за стала і пасунуўся вонкі з хаты.

Тамаш схаваў рукі у кішэні нагавіц, прайшоўся па пакоі, спыніўся супраць рамкі са здымкамі. Трэба было з чагосьці пачаць размову, ды слоў не знаходзілася. Распаведзенае навукоўцам асядала ў розуме, складвалася. Патрабаваўся час, каб супакоіцца, падвесці вынікі. У цішыні гэты час неўзабаве і мінуў.

— Насамрэч мяне непакоіла тваё раптоўнае знікненне, — нарэшце першай выдала Вольга. — Напачатку падумала, ты ў горад падаўся, вырашыў уцячы. Нават лазні не дачакаўся, а потым...

— Не збег, як бачыш.

— Грызе прадчуванне нейкай бяды, быццам павінна адбыцца нешта жорсткае, і толькі ты здольны мяне абараніць, ўратаваць, — Вольга ўздыхнула. — Ну вось я і прызналася.

Сапраўдныя думкі і жаданні Вольгі былі напісаны на ейным твары. Тамаш адвёў вочы, крыху збянтэжана слухаў.

— Тут Матроха нашаптала, мы нездарма пасябравалі. Было зусім нясмешна. Раптам заторгаўся гузак на лбе.

— Баліць? — спытала Вольга.

— Не. У цябе гаючыя рукі.

— Я цябе вылекую, — паабяцала Вольга. — Я вырашыла стаць зельніцай, як бабуля. Няпростае рашэнне, але канчатковае. І сказаць чаму? За мінулы тыдзень

гартачамі ды іншай тэхнікай знеслі і закапалі чатыры хаты. Нікому не патрэбныя, яны стаялі, даўно пакінутыя гаспадарамі, а маглі зробіцца прытулкам камусьці. Я глядзела і кожны раз шкадавала, адчувала горыч. Самота напаўняла мяне, ціхая і халодная, да здранцвення. Наплыло ўсведамленне: то не хаты хаваюць, не. То трызну правяць нашаму пракаветнаму жыццю, спадчыне, гісторыі. Ну падумай сам: адыдуць старыя, не стане дзядзькі Хведара, Філімона, цёткі Машы, іншых, а хто застанецца? Хто пяройме нашыя легенды, паданні або веды маёй бабулі? Мы рызыкуем навекі страціць-згубіць часцінкі ўласнай існасці. Мы любім грошы, аўтамабілі, гарадскія кватэры-каробкі. У пагоні за дабрабытам забылі, што ёсць шчасце.

— А што такое шчасце, Вольга?

— Асабіста для мяне — займацца любімай справай і каб ніхто не перашкодзіў, не замінаў.

— Цікава...

— Я ўжо ўсё вырашыла. Кватэру ў горадзе буду здаваць, на пражыццё тут хопіць, тым болей вёска, завяду мо гаспадарку і прымуся па трошкі аднаўляць бабчыны веды.

— Няпростая задачка.

— Анягож! Помню тое, што бабуля паказвала, якія расліны карысныя, якія шкодныя, але ж шмат давядзецца вучыць нанова. Сённяшнім векам лацвей — адпаведныя кніжкі выдаюць, калі прыкласці намаганні, можна адшукаць літаратуру пра лекавыя травы.

— Надоўга хопіць? — Тамаша раптам захлынуў скепсіс.

— Павер, я сур'ёзна. А яшчэ хачу сабраць усе паданні Жальніцы, паходжанне тутэйшых назваў, легенды і фальклор, абавязкова расповеды блукаўшых у анамаліі людзей, цікавыя ўспаміны і сведчанні старажылаў. І ўкладу кніжку. Праўда, існуе праблема: я не літаратарка, складу бракуе. Мне спатрэбіцца дапамога журналіста, такога чалавека, як ты. Дапаможаш?

Тамаш нічога не сказаў, прыпыніўся. Раптам усвядоміў, што Вольга з першага знаёмства неадольна вабіць яго, прымушае часам шалёна біцца сэрца і напампоўваць крывёй усюды, дзе належна. Яе гарачыя вусны былі так блізка.

— Я... падумаю, — голас зрабіўся хрыплым.

— Вось і падумай, — Вольга адхілілася, саступіла на крок назад. — Падумай, вырашы і тады застанься, — мовіла яна.

Тамаш вырашыў не нахабнічаць. Перавёў думкі на заўтрашнюю работу, адпіскі, справаздачы, тлумачэнні, чаму адсутнічаў.

— Сёння гэткая ж поўня, як і тады, калі я ў маленстве гасцявала ў бабулі. Надзвычай яркая, ненатуральна вялікая, — заўважыла Вольга.

— Страшна?

— Жудліва крышачку.

— Боязна здані чырвонага камісара? Тое ж байкі...

— Байка, якую я бачыла на ўласныя вочы, як і пачула пагрозу расстраляць.

— Мо мне застацца? Дваім не страшна.

Вольга падумала.

— Толькі калі вырашыў застацца назаўсёды.

Падобнага абяцання Тамаш даць не мог. Не здолеў і наважыцца падмануць, абкруціць. Вольга была не той пароды, каб паабяцаць ёй зорку з неба, правесці ноч, а на раніцу даць лататы. Таму сціпла з неахвотай развітаўся, выказаў спадзяванне сустрэцца яшчэ і крочыў вонкі, за брамай павярнуў да свайго лецішча.

Словы Вольгі азадачылі. Ніякага ж поваду не даў, а ці патрэбная нагода адзінокай маладой жанчыне? Адна маладая на вёсцы, вось і ўся прычына.

На вуліцы Тамаш узяў слухаўку і набраў рэдактарскі нумар.

— Ты дзе швэндаўся, прапажа? Тыдзень адсутнічаў на рабоце, мы ў вышук падалі!

— Заблукаў... заблукаў у лесе, Анатоль Тарасавіч.

— Тлумачальную напішаш!

— Абавязкова.

— З тваіх тлумачалак ужо можна кніжку скласці, збор лепшых твораў! — раўла слухаўка.

— Выбачайце, але я насамрэч заблукаў.

— Мо загудзеў?

— Далібог, узапраўдачку не.

— Дык а дзе ты блукаў столькі ў лесе? Як выжыў, чым харчаваўся?

— Не па тэлефоне, калі ласка, давайце, як прыеду, раскажу. Я назапасіў тут багата матэрыялу, як мінімум на адзін артыкул па краязнаўстве ўжо хопіць.

— Ну глядзі мне, герой, калі чакаць?

— Заўтра, сёння аўтобуса няма, — схлусіў Тамаш і адключыў слухаўку.

Пасля нядоўгіх роздумаў вырашыў у якасці падарунка дзядзьку Хведару прэзентаваць вуду, прывезеную перадапошнім разам, ды так і не скарыстаную. Непадалёк мелася рачулка, недзе ў кіламетровай адлегласці ад спаленага вайной хутара. Вось дзядзька абрадуецца, падумаў Тамаш.

***

Дома Тамаш вынуў крыж з заплечніка, доўга разглядаў пацямнелае з зялёнымі плямкамі і кропачкамі срэбра, апавітае арабскай вяззю і лацінскімі літарамі. Паклаў перад сабою і сабраўся нешта напісаць. Адразу накіды, зацемкі, нататкі на паперы, затым ужо стварыць тэкст і адрэдагаваць на ноўтбуку. Тамаш грыз вяршок асадкі, і так, і гэтак будаваў у думках сказы, але пачаць не выходзіла. У галаву лезлі думкі пра мажлівы прыбытак і пра Вольгу. Тамаш не вытрымаў, схаваў знаходку назад у заплечнік.

Засумаваў. Задумаўся міжволі, чаму так складана склаўся лёс, яму ўжо дваццаць сем, а ўсё халасцякуе.

Здаецца, усё жыццё гнаўся за прафесіяй, навіны, аналітыка, артыкулы, інтэрв'ю, а асабістае жыццё ў ступар загнаў, відавочна не сустрэў кахання. Ці мо тое каханне не варта сустракаць, яго варта браць? Сур'ёзна так, прыйсці і ўзяць за жабры і паставіць перад фактам. Але каго браць за тыя жабры? Тамашу сімпатызавалі прыгажуні. Аднак прыгажуні даўно былі замужам альбо па два-тры разы ў разводзе. А вось Вольга... Вольга выклікала ў Тамашу пачуцці не зусім звычайныя. Пра такую жанчыну Тамаш некалі марыў. Але ці быў ён сам вартым Вольгі? Пытанне нібы абдало кіпнем. Тамаш зразумеў, што ў рэшце рэшт трэба вырашаць: выбраць грошы і прадаць крыж або прызнацца Вользе ў пачуццях і паказаць знаходку, расказаць, як адшукаў, і прапанаваць сумесна вырашыць, што далей рабіць з артэфактам. Аднак пакажы Вользе крыж — і шанц разбагацець сплыве, нібы ранішні туман. А іншай такой Вольгі яму ўжо не сустрэць, такая адна на мільён. Дылема проста. Як разарвацца паміж грашыма і сардэчнымі пачуццямі?

Тамаш адклаў асадку, лёг на канапу і неўпрыкмет закімарыў, затым сон паглынуў, забраў, пацягнуў у свае глыбокія лехі.

Тамаш прысніў насельнікаў Жальніцы, з якімі паспеў пазнаёміцца, затым карчму "Халодныя ногі", у якой ён разам з Вольгай стаяў супраць бацюшкі айца Аляксандра. На дзяўчыне была шлюбная сукенка, а бацюшка збіраўся іх павянчаць і чамусьці пад-міргваў Тамашу. Неспадзявана ў сне Тамаш зразумеў, што пакахаў Вольгу з першага погляду, тады ў лесе, калі толькі сустрэў. І ён вырашыў застацца. Нахлынула шчымлівая асалода, і цеплыня разлілася па целу. Напрыканцы прысніўся Рабаконь, якога Тамаш ні разу не бачыў, ён пагражаў Вользе і патрабаваў крыж сабе.

Тамаш прачнуўся надвячоркам, калі сонца ўжо датыкнулася віднакраю. Сум і лёгкасць апанавалі душу. Лёгка было ад усведамлення ўласнага кахання і прагі

да Вольгі, а сум спараджаўся думкамі, што ўзяў чужое, украў. Таму і праляцеў скрозь час ажно на тыдзень наперад. Тамаш толькі цяпер зразумеў, што не жадае прадаваць крыж. Не прынясуць шчасця тыя амаль крадзеныя грошы. І логіка Тамашова раптам падказала хлопцу такое простае рашэнне, якое надараецца хіба ў дзяцей ці ў прастадушных наіўных асобаў, — вярнуць крыж на месца. Вось калі не тваё — не бяры, не сунь сквапных рук да галавешак у чужой печы, згарыш.

Думкі блыталіся ў галаве Тамаша, калі клыпаў па лясным шляху. І поўня разгаралася ярчэй. Цыганскае сонца абуджала лес, у якім віравала начное жыццё, поўнае гукаў, пахаў, ценяў, што могуць падацца зданямі.

Ён прыспяшыў хаду, рушыў амаль бегма. Забыўся і на дзядзькаў ровар. Ногі самі данеслі. Нарэшце абмінуў знаёмую дзялянку, могілкі, трапіў на руіны, на месца раскопу. Дрогкімі рукамі сабраў парэшткі скарбонкі, дастаў з заплечніка крыж, паклаў у загадзя разгорнутую яміну, хуценька прысыпаў, прытаптаў, прыхлопаў далонямі, нацерусіў веццям, ігліцы, тады падняўся і крыкнуў на ўвесь лес невядома каму:

— Забірайце, забірайце вашае, аддаю!

Рэха паўтарыла ўдалечыні...

***

Пераход — імгненне.

Імгненне — сплюшчаная, сціснутая ў кропку вечнасць.

Не было ні маланак, ні грому, ні землятрусу, а канца свету дык і пагатоў.

Тамаш проста прачнуўся, ачуняў, расплюшчыў вочы.

Ён не адразу ўсвядоміў, дзе знаходзіцца. Позіркам выхапіў пень, на пні сядзела вялікая жаба, якая з цікавасцю таропілася ў Тамаша. У рапухі торгалася падбароддзе.

— Добрай раніцы! — пачуў Тамаш.

Квакля здзекліва падміргнула вокам і паўтарыла:

— Добрай раніцы. Калі ласка.

— Ты хто? — спытаў Тамаш. Крыху загуло ў галаве, мужчына прыгадаў падзенне з ровара, няйнакш ладна ўлупіў галавой, вось і мроіцца.

— А ты хто? — перапытала жаба.

— Чалавек, — адказаў Тамаш і моцна здзівіўся. — Няўжо я здурнеў?

Квакля загігікала.

— Не, ты відавочна ўпаў, — зазначыла яна.

Тамаш згадзіўся. Балеў лабэшнік.

— Не, ты не тое каб упаў, ты праваліўся скрозь час, заблукаў у пазапрасторавых вандроўках, — зусім ужо па-навуковаму падвяло выснову слізкае стварэнне.

Тамаш прыўзняўся і сеў. Побач ляжаў папсаваны ровар. Дзялянка, пні, спілаваныя дрэвы, смецце.

— Дзякуй, што вярнуў браму, — квакнула з пня. — Ты вярнуў браму на месца, і я магу пры жаданні зноўку вярнуцца ў свой свет.

— Вярнуў браму?

— Крыж. Ён выконвае функцыі брамы ў тутэйшым сутарэнні светаў.

— Сутарэнні светаў?

— Я гляджу, ты добра галавой прыклаўся, калі не разумееш.

— А ты праўда жаба?

— Сам як лічыш?

— Не. Ты не жаба. Хто заўгодна, але не жаба.

— Ха! Навідавоку назіраецца прагрэс у светапоглядах, але тое не адмяняе сутнасці.

Квакля надзьмулася, нібы надавала сабе важны выгляд.

— Насамрэч я зачараваная прынцэса. Удакладню: у маім свеце... А жаба я толькі тут. Ну, так атрымалася. Лічы, я насунула маску, быццам на карнавал. Вы, людцы добрыя, гэтаксама маскі носіце, нібыта на маскарадзе, і не зразумець адразу, якія вы сапраўдныя.

— А... як? Што тут увогуле адбываецца?

— Запаведнік тутака наш. Мы да вас ходзім праз браму, якую святы Філімон зрабіў. Ходзім, як на экскурсію ў заапарк ці цырк. Вы ўсе гэтакія клоўны, нам смешна. Але з вамі ўтульна і бяспечна. Вы і смешныя, і сур'ёзныя філосафы. Святы Філімон, узнёслы рамантык, быў першым сярод вас, хто самастойна адкрыў у сябе здольнасць вандраваць, або блукаць, па сусветах. Першы блукач. Ён замаскіраваў браму пад крыж, каб святая інквізіцыя не чаплялася, і з той брамай адкрываў усё новыя і новыя светы, бо сусвет бязмежны. Вось мы і вандруем. Жывём сярод вас. Гасцюем. За вамі цікава назіраць. І заўваж, ты першы, хто чуе гэтыя словы. У цябе гэтаксама здольнасць, як у святога Філімона, праўда, недаразвітая... Карацей, Пан Арыстокаль будзе цябе вучыць пераходам паміж светамі і прасторамі. Мы вось гэткае рашэнне прынялі. У знак падзякі, што вярнуў браму на месца.

— І кот... Пан Арыстокаль з іншага свету?

— Толькі ён зачараваны прынц ужо. Так.

— А каб не вярнуў браму... крыж?

— Гм. Спасцігла б цябе справядлівая кара. Але ж ты вярнуў, таму цябе і палічылі годным для знаёмства з намі. Да таго ж ты спадабаўся Вользе, нашай тутэйшай гаспадыні.

— Дык...

— Індык! Прадбачу тваё пытанне, смяротны. Не, мы не з іншай планеты. Мы істоты з паралельных светаў. Увогуле, хто ўбіў у вашыя галовы думку, што іншапланетнікі павіны быць падобнымі да вас, і болей за тое — уважаць вас разумнымі? Адкуль вы ведаеце, што іншыя разумныя істоты не жывуць побач з вамі? Чаму прынята лічыць, што, калі іншапланетнікі існуюць, яны павінны за разумную істоту прымаць менавіта чалавека? Вось, напрыклад, прыляціць якая цывілізацыя разумных птушак, усталюе сяброўства

і блізкія адносіны хай сабе з варонамі, і ўсё. З іх пункту гледжання вароны будуць гаспадарамі зямлі, а на вас — пляваць з-пад аблокаў, вас будуць успрымаць як фаўну і адпаведна ставіцца. Але ж прынята фантазіраваць пра гуманоідаў, цьху. А вось вароны і прыляцелыя птушкі будуць кантактаваць, развіваць адносіны, дзяліцца ўражаннямі і ўсім, што каштоўна па іх крытэрыях, напрыклад бліскучымі гузікамі і ведамі, як спрытней лавіць жамяру, а на вас паглядзяць як на дробную перашкоду. Ім начхаць на вашыя атамныя рэактары, узбраенне і тое, што чалавек памылкова лічыць багаццем. Не думаў пра такое? Вы сляпыя, іншае жыццё побач, толькі вочы расплюшчы, галаў павярні, зірні з іншага гледзішча. Жыццё ў Сусвеце ёсць усюды, дзе Творца сусвету. Што Бог стварыў, тое і жыццё. У Творцы сусвету няма мёртвых рэчаў.

Зачараваная прынцэса торгала падбародзем. Тамаш пакратаў галаву пальцамі, ці не абрушыла дах.

— Нам патрэбны брамнік, — зазначыла істота. — Абы-хто брамнікам стаць не зможа. Спецыфічная ж пасада, гасцей праводзіць туды-сюды. Патрэбны блукач. Пажадана адзінокі, халасты, каб жонка не замінала блукаць па светах. Жартую. Можна і з жонкай, але каб была з паразуменнем. І не п'яніца, без шкодных звычак каб блукач быў.

— І... — толькі адзіны гук і здолеў выдушыць Тамаш.

— І ты пасуеш як мае быць. Папраўдзе, прымусіць мы не ў сілах, дый ты не абавязаны. Тут ужо праблемка. Але ж, варта думаць, табе цікава. Цікава, так? Прага новых ведаў, інфармацыя як наркотык, вось што натхняе сапраўднага даследчыка і творчую асобу. А ты ж творчы, артыкулы пішаш, так?

Тамаш тарганўў галавой.

— Напішы пра нас кніжку, — прапанавала жаба.

Ён заперхаў.

— Дзякуй. Нядаўна ўжо прапанавалі напісаць.

— Вольга? Вось і згадзіся. Не пашкадуеш. З намі весела.

— Пачакай, а што яшчэ павінен рабіць брамнік, акрамя як праводзіць гасцей?

— Ой, не хочацца ўзнёслай хвілінай пра сумнае! Ну раз спытаў: не пускаць злодзеяў, няпрошаных гасцей, напрыклад. Пра аднаго табе ўжо вядома.

— Чырвоны камісар, — здагадаўся Тамаш.

— Так. А яшчэ шмат хто ў розныя часы, — жаба засумавала.

— Раскажы.

— Ат. Была гісторыя з варажбіткай Бэацькай-паляшучкай. Згінула. Быў яшчэ чорны блукач Лаўкрафт, які падарожнічаў па светах, якія адпрэчылі Бога, і кантактаваў са служкамі цемры, пра што і пісаў. Ён прынёс шмат шкоды. Але ж ты не такі, праўда? Ты напішаш добрае. Я проста перакананая ў тваіх добразычлівых памкненнях.

Тамаш задумаўся. Дыхнула свежасцю і ляснымі пахамі. Свет нечакана напоўніўся фарбамі, захацелася жыць. І не верылася, і свярбела, і да роднай газеты вяртацца не тое каб задужа карцела. Не, ён усё ж не пакіне Жальніцу, пакуль ва ўсім не разбярэцца сама стойна, уласна. Хай сабе звальняюць. Усё ж ён жальнікавец ужо. І тут яму адкрылася зусім іншая рэальнасць. Колькі разоў Тамаш пераходзіў скрозь час? Ну сапраўдны блукач, далібог, узапраўдачку.

У вачах зачараванай прынцэсы зазіхацела вялікая надзея.

— Матроха! — прыляцела спачатку здалёк, затым крыху бліжэй. — Матроха, прыгажунька мая, ты дзе затаілася?

Голас быў да болю знаёмым, прыемным і пяшчотным. Здаецца, нічога ў жыцці не магло ўзрадаваць Тамаша больш, чым гэты мілы сэрцу голас. І пачутыя словы былі да болю знаёмымі. Ён ужо чуў іх тады,

калі ўпершыню апынуўся на гэтым месцы. Анамалія перакінула Тамаша назад у часе, да моманту знаёмства з Вольгай!

— А ты сапраўды здурнеў. Падумаць толькі — размаўляеш з жабай, — памяркоўна зазначыла квакля і дадала следам: — Жартую!

Стварэнне квакнула і скочыла з пня.

Тамаш спехам падняўся і абцерусіў далонямі адзенне.

Затрашчэў хмызняк, і з-за сценкі ссохлых раслін на ўскраі дзялянкі вылезла светлая дзяўчына ў чырвонай куртцы.

— А мамкі мае!.. — усклікнула яна і змоўкла. Імгненная здагадка прамільгнула на твары.

Тамаш глядзеў на Вольгу і адчуваў гудкі пошчак уласнага сэрца.

— Мы знаёмыя? — спытала прыгажуня.

— Я вас ведаю. Вы збіраецеся кніжку паданняў Жальніцы ўкласці.

— Адкуль?.. — Вольга прыкрыла рот далонню.

— А я вам дапамагу, тлумачэнні і пытанні пасля, — пераканаўча запэўніў Тамаш. — Жыў на хутары Чорны Смык адмысловы майстра скрыпак Фіма Ліберман. Чулі паданне пра габрэя Фіму?

І Тамаш на шляху да аўтамабіля Вольгі распавёў усё тое, што чуў у карчме ТАМ, далёка па-за краем, па-за мяжой, у далёкай неварацці, куды трапіў праз браму і здолеў вярнуцца. Тое даўно забытае, што чакала яго, відавочна мусіла стаць лёсам. Новае, цікавае, поўнае прыгод жыццё вандроўніка паміж светамі. Блукача.

# Пра аўтара



Алесь Бычкоўскі нарадзіўся ў 1975 годзе ў г. Беразіно Мінскай вобласці.

Закончыў факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта. Працаваў журналістам, загадчыкам рэкламнага аддзела, аддзела сельскай гаспадаркі, вярстальнікам, качагарам, вартаўніком, бурыльшчыкам свідравін пад ваду, адміністратарам камп'ютарнага клуба, мыйшчыкам аўтамабіляў, фотамастаком, гандляваў кніжкамі ды інш.

Друкаваўся ў "Маладосці", "Літаратуры і мастацтве", "Крыніцы Жыцця", расійскім часопісе фантастыкі "Шалтай-Болтай", у дадатку да часопіса "Мир Фантастики" ды іншых. Браў удзел у праектах Бум-Бам-Літа. Удзельнічаў у калектыўным зборніку беларускай фантастыкі "Люстэрка Сусвету" (2007).

Аўтар кніг "Анамалія" (2012), "У пошуку шчасця" (2017).

# ЗМЕСТ

Дабрадзеі і гармідар квантавай літаратуры ........................ 3
Паляванне на ваўкалака ........................ 20
Дом, які здзяйсняе жаданні ........................ 52
Блукач ........................ 83

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Бычкоўскі** Алесь

**Дабрадзеі і гармідар
квантавай літаратуры**

*Аповесць і апавяданні*

Адказны за выпуск *Зміцер Вішнёў*
Рэдактар *Ліда Наліўка*
Дызайн вокладкі *Павел Дарохін*
Вёрстка *Дар'я Пушкар*
Карэктар *Ліда Наліўка*

Падпісана да друку 05.09.2018. Фармат 84×108/32.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 8,5. Ул.-выд. арк. 6,09.
Наклад 200 асоб. Замова 2774.

16+

Прыватнае выдавецкае ўнітарнае прадпрыемства "Галіяфы".
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/48 ад 03.10.2013.
Пр. Партызанскі, 77А, 220107, Мінск.
E-mail: vish@bk.ru
www.halijafy.by

ТДА "НоваПрынт".
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/54 ад 25.02.2014.
Вул. Геалагічная, 59, корп. 4, каб. 10, 220138, Мінск.

**У выдавецтве "Галіяфы" у 2012 годзе выйшла кніга:**



КНІГАРНЯ
ГАЛІЯФЫ

Інтэрнэт-кнігарня

halijafy.by

гэта больш за 700 кніг
на беларускай мове
з дастаўкай па Беларусі
і ўсім свеце

дзіцячыя кнігі

гістарычныя кнігі

мастацкая літаратура

кнігі сучасных беларускіх аўтараў

перакладная літаратура

Ці чулі вы, што ўсе выдуманыя сусветы існуюць насамрэч? І не толькі існуюць, але і дапамагаюць пісьменнікам, чытачам, а найперш аматарам казак і фэнтэзі.

Ці вядома вам, што побач з намі жывуць паралельныя цывілізацыі разумных жывёл? Журналіст Тамаш Ян гэтаксама не ведаў, пакуль не ўлупіўся галавой у пень і не трапіў у карчму «Халодныя ногі» каля могілак.

Анамальныя з'явы, ваўкалакі, тагасветныя пачвары пад абліччам вабных прыгажунь ды іншае ў новым зборніку беларускага празаіка Алеся Бычкоўскага "Дабрадзеі і гармідар квантавай літаратуры".

ISBN 978-985-7140-94-7
9 789857 140947

ВЫДАВЕЦТВА
ГАЛІЯФЫ

Алесь Бычкоўскі

ДАБРАДЗЕІ І ГАРМІДАР КВАНТАВАЙ ЛІТАРАТУРЫ